А. М. Змушко

# Беларуская мова 8



У сказе вылучаюць галоўныя і даданыя члены сказа.

**Галоўныя члены сказа** — дзейнік і выказнік. Слова, якое абазначае, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, называецца **дзейнікам**. Дзейнік адказвае на пытанні **хто?** або **што?**

Слова, якое абазначае, што гаворыцца пра дзейнік, называецца **выказнікам**. Выказнік адказвае на пытанні **што робіць? што рабіў? што будзе рабіць? што робяць?** і іншыя.

Усе астатнія словы ў сказе, калі яны ёсць, — гэта **даданыя члены сказа**.

У сказе могуць быць словы, якія адказваюць на адно і тое ж пытанне, звязаны з адным і тым жа словам і вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння.

Яны называюцца **аднароднымі членамі сказа**.

Аднароднымі могуць быць і галоўныя, і даданыя члены сказа.

Словы, якія маюць аднолькавае або блізкае значэнне, але па-рознаму гучаць, называюцца **сінонімамі**. Напрыклад, *смеласць, храбрасць, адвага; выхаваны, ветлівы, ласкавы, далікатны, абыходлівы*.

Словы з процілеглым значэннем называюцца **антонімамі**: *холад — гарачыня, весела — сумна, добры — злосны*.



А. М. Змушко

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

**Вучэбны дапаможнік для 8 класа**
**першага аддзялення дапаможнай школы**
**з рускай мовай навучання**

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2018

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 811.161.3(075.3)
ББК 81.411.3я721
З-69

Рэцэнзенты:
кафедра сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры *З. І. Бадзевіч*); настаўнік беларускай мовы вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Дапаможная школа-інтэрнат № 5 г. Гомеля» *Л. І. Данільчанка*

## Умоўныя абазначэнні

— правіла

?! — пытанні і заданні

* — заданні павышанай складанасці

— праца ў парах, групах

— вучыцеся весці размову

— слоўнікавая работа, тлумачэнне слоў

— дамашняе заданне

**гербáрый** — слоўнікавае слова

*Папярэдняе выданне выйшла ў выдавецтве «Народная асвета» ў 2005 годзе.*

**Змушко, А. М.**
З-69 Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з рус. мовай навучання / А. М. Змушко. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018. — 191 с. : іл.
ISBN 978-985-553-469-4.

**УДК 811.161.3(075.3)**
**ББК 81.411.3я721**

**ISBN 978-985-553-469-4**

© Змушко А. М., 2005
© Змушко А. М., 2018, са змяненнямі
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2018

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПАЎТАРЭННЕ

## *Урок 1. Успамін аб леце*

**1.** Прачытайце верш. Пра які ён дзень? Вясёлы ці сумны настрой гэтага верша? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

**Зазвініць званок**

...Раніцаю ў школу
мы прыйшлі ізноў.
Колькі тут вясёлых
жартаў і размоў!

— Што рабілі ўлетку?
— Дзе былі, сябры?
Гэты — на палетку.
Гэты — у бары.

Той лугі абшарыў:
між высокіх траў
кветак на гербарый
безліч назбіраў.

Адплывае ў просінь
лёгкі туманок.
Сёння роўна ў восем
зазвініць званок.

*(Артур Вольскі)*

***гербáрый***

**Палéтак** — участак, які выкарыстоўваецца пад пасевы.
**Гербáрый** — калекцыя засушаных раслін.
**Прóсінь** — сіні прасвет у афарбоўцы чаго-небудзь.

?! Якія пытанні задаюць сябры адно аднаму, сустрэўшыся пасля канікул? Што рабілі вучні летам? Адкажыце словамі з верша.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Разгледзьце малюнкі.





Прыдумайце сказ да кожнага з малюнкаў. Дайце дзецям імёны. Запішыце сказы ў сшыткі.

Што яшчэ можна рабіць летам? Запішыце 2—3 адказы на гэтае пытанне.

**3*.** Паразмаўляйце з суседам па парце на тэму летняга адпачынку.

У вас павінен атрымацца дыялог — размова двух чалавек. Адзін будзе пытацца, другі — адказваць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**4.** Адкажыце на пытанні.

Што вам найбольш запомнілася за час летняга адпачынку?

Ці можаце вы расказаць аб якой-небудзь добрай справе, якую вы зрабілі летам?

Ці быў учынак, за які вам цяпер сорамна?

**5.** Прачытайце народныя выказванні. Растлумачце іх сэнс.

Летам назапасіш — зімой знойдзеш.
Улетку дома сядзець — узімку хлеба не мець.
Што летам нарыхтуеш, тое зімой пакаштуеш.

Для каго лета — самая напружаная пара года?

Што робяць сяляне ўлетку?

Запішыце па памяці адну з прыказак. Праверце сябе па кнізе.

**6.** Прачытайце сказы. Успомніце назвы летніх месяцаў.

У чэрвені мы з братам адпачывалі ў аздараўленчым лагеры.
У ліпені мы часта хадзілі ў ягады.
У жніўні я дапамагаў бацькам рабіць рамонт у кватэры.

Чым вам запомніліся летнія месяцы?

Прыдумайце і запішыце, якімі справамі вы займаліся ў кожным з летніх месяцаў. За ўзор вазьміце сказы з практыкавання.

## *Урок 2. Алфавіт*

**7.** Прачытайце верш-загадку. Закончыце яго словам-адгадкай.

Літары ён, як байцоў на парад,
строгім парадкам паставіў у рад.
Усе яны пэўнае месца знайшлі там.
Як мы яго назавём? — ... .

Ці можаце вы расказаць алфавіт па памяці?

Навошта патрэбна ведаць алфавіт?

Падумайце і раскажыце, дзе алфавіт выкарыстоўваецца.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**8.** Прачытайце слупок з верша. Якія літары прапушчаны ў словах?

З вясёлым смехам, звонк..м смехам
мы ..се абу..ім гу..ары.
Калі ж заблу..імся, дык рэха
за..сёды скажа, дзе сябры.

*(Кастусь Кірэенка)*

?! Ці здагадаліся вы, якія літары прапушчаны?
Запішыце верш, устаўляючы прапушчаныя літары ***і, ў***, а таксама спалучэнні літар ***дз, шч.***

**9.** Прачытайце беларускі алфавіт. Якія літары ў ім прапушчаны?

*Аа Бб Вв … Дд (Дж Дз)*
*Ее Ёё … Зз Іі й Кк Лл*
*Мм … Оо Пп Рр … Тт*
*… ў Фф Хх Цц Чч*
*Шш ы ь Ээ … Яя*

?! Запішыце беларускі алфавіт па памяці.
Назавіце літару, што адсутнічае ў рускім алфавіце. Запішыце літары рускага алфавіта, якія адсутнічаюць у беларускім.

**10.** Прачытайце словы. Знайдзіце памылкі ў кожным з іх.

Щасце, зъехаў, абъява, казав, жауцизна.

***апо́страф***

?! Запішыце словы правільна.
Як называецца знак ’ у беларускай мове?

П р а в е р ц е  с я б е: *шчасце, з’ехаў, аб’ява, казаў, жаўцізна.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**11.** Прачытайце літары ў двух радках. Скажыце, у якім радку запісаны галосныя літары, а ў якім — зычныя літары (спалучэнні літар).

**А, о, у, ы, э, я, ё, ю, і, е.**
**Ж, р, м, н, з, к, л, п, б, дж, дз.**

?! Ці ўсе галосныя літары ёсць у першым радку?
Ці ўсе зычныя літары запісаны ў другім радку?
Запішыце зычныя літары, якія прапушчаны.

**12.** Запішыце ў алфавітным парадку спачатку прозвішчы ўсіх вучняў вашага класа, а пасля — імёны.
* Выпішыце з вучэбнага дапаможніка па літаратурным чытанні ў алфавітным парадку прозвішчы ўсіх пісьменнікаў, чые творы вы будзеце вывучаць.

## *Урок 3. Галосныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме*

**13.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць?

Ранн**я**я восень прыйшла ў вёску. З поля прыбралі багаты ўраджай, пасе**я**лі жыта. На адным палетку **я**шчэ ляжаць снапкі позняга аўса. На паплавах гатова да касьбы атава. *(Паводле Кузьмы Чорнага)*

?! Назавіце ў кожным слове галосныя літары і гукі, што яны абазначаюць. Якія з гэтых гукаў абазначаюць на пісьме мяккасць папярэдняга зычнага?
Спішыце тэкст. Падкрэсліце адной рысай літары, якія абазначаюць галосныя гукі і стаяць пасля літар, што абазначаюць цвёрдыя зычныя. Дзвюма рысамі падкрэсліце галосныя, якія стаяць пасля літар, што абазначаюць мяккія зычныя.
* Колькі гукаў абазначае выдзеленая літара ***я*** ў словах *ранняя, пасеялі, яшчэ*? Назавіце гэтыя гукі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**14.** Прачытайце словы. Вызначце ў кожным з іх націскны склад. Якія літары ў беларускай мове знаходзяцца заўсёды пад націскам?

Сэрца, холад, шоўк, поспех, шэлест, чорны, грошы.

?! Падбярыце да кожнага са слоў аднакаранёвае, каб націск падаў на іншы склад. Якія літары трэба будзе пісаць замест ***о, э***?
Запішыце пары слоў. Падкрэсліце літары ***о, э, а***.

> *Успомніце!*
> Літары ***о, э*** ў беларускіх словах пішуцца толькі ў націскных складах. У ненаціскным становішчы замест ***о, э*** пішацца літара ***а***: *дрэва — драўляны, сосны — сасновы.*

**15.** Прачытайце пары слоў. Пастаўце ў іх націск.

Лёд — лядок, лёгкі — лягчэйшы, след — сляды, бераг — узбярэжжа.

?! Якая літара пішацца замест ***ё, е*** ў першым складзе перад націскам?
Спішыце пары слоў. Падкрэсліце літары ***е, ё, я***.

> *Успомніце!*
> Літара ***ё*** ў беларускай мове пішацца толькі пад націскам. Замест ***ё, е*** ў першым складзе перад націскам пішацца ***я***: *след — сляды, гнёзды — гняздо.*

**16.** Прачытайце ўрывак з тэксту. Якая яго тэма?

Плаўна **носіцца** ў паветры **белая** павуціна, **сцелецца** па **зямлі**, чапляецца за кусты і сухую траву. Прайшло **цёплае** лета. Апошнія вы, ясныя **дзянькі восені**! *(Якуб Колас)*

?! Падбярыце да выдзеленых слоў аднакаранёвыя, каб націск у іх падаў на іншыя склады.
Запішыце словы парамі. Падкрэсліце літары ***о — а; е, ё — я; я — е.***
* Дайце загаловак тэксту, выкарыстоўваючы словы аўтара.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**17.** Прачытайце верш, устаўляючы прапушчаныя літары.

За асінкай, за в..рб..ю
в..сень — рыжаю ліс..й.
Пахне жытам і ралл..ю
перад н..ваю с..ўб..й.

*(Віктар Гардзей)*

?! Спішыце верш, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце іх напісанне.
Пастаўце націск у словах, дзе вы ўстаўлялі прапушчаныя літары.

**18.** Прачытайце словы, устаўляючы прапушчаныя літары.

Б..розка, ж..луды, ч..рны, ц..плейшы, сн..жок, с..сна, т..лефон, в..сёлы, р..чка.

***тэлефо́н***

?! Спішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары. Пастаўце ў кожным слове націск. Растлумачце напісанне літар, якія вы ўставілі.
Складзіце з любымі двума з гэтых слоў сказы. Запішыце іх.

## *Урокі 4—5. Зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме*

**19.** Прачытайце скорагаворку. Выразна вымаўляйце гук ***[ў]***. Хто такая аўсянка? Ці бачылі вы гэтую птушку?

**Сёння** досвіткам Аўсей
злавіў аўсянку ў аўсе.

*(Казімір Камейша)*

?! Навучыцеся хутка расказваць скорагаворку.
Як вымаўляецца ***[н]*** у выдзеленым слове? Як называюцца такія гукі ў беларускай мове?
Запішыце скорагаворку па памяці. Падкрэсліце літару ***ў***.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**20.** Прачытайце павучальную гісторыю — прытчу. Якая яе асноўная думка? Адкажыце сваімі словамі на пытанне, што ўтрымліваецца ў назве.

### Хто задзірае нос угору?

Спытаў сын бацьку:

— Чаму гэта адзін колас так гнецца да зямлі, а другі тырчма тырчыць?

— Які колас поўны, — адказаў бацька сыну, — той да зямлі гнецца, а які пусты, той і тырчыць угору.

?! Выпішыце з тэксту словы, у якіх усе зычныя гукі — цвёрдыя. Падкрэсліце літары, што абазначаюць галосныя гукі, якія ёсць у гэтых словах.

Прачытайце прытчу па асобах: словы аўтара, бацькі, сына.

* Паразважайце. Чаму вучыць гэтая гісторыя? Пра якіх людзей можна сказаць, што яны «пустыя каласы»?

**Пры́тча** — іншасказальнае апавяданне з павучальным вывадам.

**21.** Прачытайце верш-лічылку.




Як **цудоўна, дзеці,**
што гукі **ёсць** на свеце —
зычныя, галосныя!
Да аднаго адзін **дадаць** —
можна словы з іх **складаць,**
смешныя, **сур'ёзныя!**
Слова ты —
слова я.
Пачынаецца гульня.

*(Ванда Паўлоўская)*

?! У якім з выдзеленых слоў кожная літара абазначае адзін гук? Назавіце літары і гукі ў гэтым слове.

Запішыце астатнія выдзеленыя словы. Падкрэсліце ў іх адной рысай тыя дзве літары, якія абазначаюць адзін гук. Дзвюма рысамі падкрэсліце літару, якая абазначае два гукі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**22.** Прачытайце верш. Якой бачыць паэтэса Беларусь? З чым яна параўноўвае сваю Радзіму?

**Мая Радзіма** —
жытні колас,
**сінь** мурагу, **язміну** цвет.
**Яна** —
пілы гарачы голас,
калёс цяжкіх глыбокі след.

*(Еўдакія Лось)*

**язмі́н**

?! Назавіце літары і гукі ў выдзеленых словах.
У якіх з гэтых слоў больш літар, чым гукаў? У якіх — больш гукаў?
Запішыце словы, у якіх дзве літары абазначаюць адзін гук. Падкрэсліце гэтыя літары.
* Растлумачце, чаму ў слове можа быць розная колькасць літар і гукаў.

**23.** Прачытайце тэкст. Калі ў ім адбываецца дзеянне? Пра якую птушку ў ім расказваецца? Разгледзьце сінічку на малюнку. Ці бачылі вы яе ў прыродзе?

Да **нашай кармушкі кожны** дзень **прылятае птушачка**. Галоўка ў яе **чорненькая. Шчочкі** беленькія. Спіна і **крылы** зеленавата-**шэрыя. Грудкі жоўтыя**, з **чорным гальштукам**. *(Наталля Наватворцава; пераклад з рускай мовы)*

**га́льштук**

?! Назавіце ў выдзеленых словах зацвярдзелыя зычныя.
Якія яшчэ гукі беларускай мовы заўсёды цвёрдыя?
Спішыце тэкст. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.



Раскажыце пра сінічку. Дзе яна жыве? Ці адлятае ў вырай? Чым яна любіць ласавацца? Паразважайце, як школьнікі могуць дапамагчы сінічцы перажыць халодную зіму.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**24.** Прачытайце верш. Ці можна яго назваць заклічкай? Чаму?

Дожджык мые, палівае,
дожджык песеньку спявае:
«Хто не любіць летні дождж,
той не ходзіць басанож!»
Мы з бабуляй вельмі рады:
цёплы дождж напоіць грады,
кожны кусцік, і лясок,
і жытнёвы каласок.
Трэба ўсім дажджу напіцца,
каб цвісці і каласіцца.
Дожджык, дожджык, палівай!
Будзе ўвосень ураджай!

*(Вера Вярба)*

?! Назавіце ў вершы словы з зацвярдзелымі зычнымі. Якія галосныя літары стаяць пасля іх?

Падзяліце словы *дожджык, мые, палівае, спявае, напоіць, напіцца, ураджай* на склады.

Падзяліце гэтыя словы для пераносу з радка на радок.

Запішыце словы двойчы: спачатку дзяліце іх на склады, потым — для пераносу. Пастаўце націск у кожным слове.

Правільна вымаўляйце ***[дж]***.

**25.** Прачытайце вершаваныя загадкі. Адгадайце іх з дапамогай малюнкаў.



Хто плыве ў небе клінам
у асенняй цішыні?
І ўзгоркам і далінам
хто курлыча з вышыні?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Чырвоная дзюба,
чырвоныя пяты.
На лузе — цыбаты,
у небе — крылаты.

*(Васіль Жуковіч)*



**Цыба́ты** — высокі і тонкі, звычайна даўганогі.

?! Знайдзіце ў загадках словы з зацвярдзелымі зычнымі.
У якім слове ёсць падоўжаныя зычныя?
Падзяліце словы *асенняй, чырвоныя* спачатку на склады, а потым — для пераносу. Якія тут ёсць адрозненні?

**26.** Прачытайце сказы з твораў беларускіх пісьменнікаў. Знайдзіце ў кожным сказе словы з падоўжанымі зычнымі.

Пад сасонкамі, на ўзлессі, расцвітаюць верасы. *(Язэп Пушча)*

Нікла жыццё ў шумным лесе, агаляўся твар зямлі, і ляцелі ў паднябессі са звонкім крыкам жураўлі. *(Якуб Колас)*

Сышло разводдзе шумна, дружна. *(Якуб Колас)*

Сёння з першай песняй рання я пайшоў у поле сіл набрацца, любавацца сонцам і прыволлем. *(Янка Журба)*

?! Выпішыце словы з падоўжанымі зычнымі, падзяляючы іх на склады.
Падбярыце да слоў *звонкім, разводдзе, поле, прыволле* аднакаранёвыя такім чынам, каб націск падаў на іншы склад.
Якая літара будзе стаяць у гэтых словах замест ***о***?
Запішыце пары слоў паводле ўзору, ставячы націск і падкрэсліваючы галосныя літары пад націскам адной рысай, не пад націскам — дзвюма.

Узор. *Зво́нкім — звано́к, ... .*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**27.** Прачытайце верш.

Вось па сцежцы скача пліска
ад мяне так блізка-блізка.
— Птушачка, пастой, прашу,
дай я чуб твой расчашу.

*(Паводле Ніны Галіноўскай)*

Якія гукі чуюцца на месцы выдзеленых літар у словах *сце**ж**ка, блі**з**ка, чу**б***? А якія літары напісаны? Чаму?

Падбярыце да кожнага слова праверачнае, каб пасля выдзеленых літар стаялі літары галосных гукаў.

Запішыце словы паводле ўзору.

Узор. *Сцежка — сцяжынка, ... .*

*Успомніце!*

Звонкія зычныя ў становішчы перад глухімі і на канцы слоў аглушаюцца: *галу**[п]**ка, го**[т]**, лё**[х]**ка.* Глухія перад звонкімі азванчаюцца: *про**[зь]**ба, мала**[дзь]**ба.* Аднак на пісьме гэтая з'ява не перадаецца: *галубка, год, лёгка, просьба, малацьба.*

Каб правільна пісаць такія словы, да іх трэба падбіраць праверачныя — такія аднакаранёвыя словы, у якіх пасля гэтых зычных стаяць галосныя гукі: *галубка — галубок, год — гадавы, лёгка — лёгенькі, просьба — прасіць, малацьба — малаціць.*

**28.** Прачытайце пачатак беларускай народнай казкі. Ці ведаеце вы, што адбылося далей?

## Лёгкі хлеб

Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць. Дастаў торбачку. Развязаў і пачаў есці.

Выходзіць з лесу галодны воўк. Бачыць — касец пад кустом сядзіць і нешта есць.

Падышоў да яго воўк:

— Ты што ясі, чалавеча?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



— Хлеб, — адказвае касец.
— А смачны ён?
— Дзіва што смачны!
— Дай мне пакаштаваць!
— Калі ласка!
Адламаў касец кавалак хлеба і даў ваўку.
Спадабаўся ваўку хлеб...

**Дзі́ва што сма́чны** — вельмі смачны.

?! Раскажыце казку далей, калі ведаеце працяг. Калі не — паслухайце настаўніка.
Прачытайце тэкст па асобах: адзін вучань чытае словы аўтара, другі — словы касца, трэці — ваўка.
Напісанне якіх літар у словах назвы патрэбна правяраць? Падбярыце да слоў *лёгкі, хлеб* праверачныя, каб ***[г], [б]*** выразна чуліся. Запішыце гэтыя пары слоў.
Падзяліце для пераносу словы *хлеб, змарыўся, чалавеча, спадабаўся.*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**29.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх з дапамогай малюнкаў.



Белы, як сне..,
сало..кі, як мё.. .



Ён і лё..кі, і кудлаты,
Ён зімой на.. кожнай хатай.

?! Якія гукі чуюцца ў словах на месцы прапушчаных літар? А якія літары прапушчаны?
Падбярыце да слоў з прапушчанымі літарамі праверачныя, у якіх выразна чуваць гукі. Запішыце пары слоў паводле ўзору.

Узор. *Снег — снегавік, ...* .

## *Урок 6. Гука-літарны разбор слова*

**30.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Увосень і верабей **багаты.**
Багата вясна кветкамі, а **восень** — палеткамі.
Хто ўлетку спіць, той **узімку** не есць.

?! Запішыце першую прыказку, дзелячы яе словы на склады.
Ахарактарызуйце гукі і літары ў выдзеленых словах па наступным плане: назавіце колькасць складоў, націскны склад; галосныя гукі, якімі літарамі яны абазначаны; зычныя гукі, цвёрдыя ці мяккія, звонкія ці глухія; колькасць гукаў і літар у слове.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**31.** Прачытайце верш. Ці даводзілася вам калі-небудзь збіраць сыраежкі? А іншыя грыбы?

**Сыраежкі**

Ах, сырае..кі, сырае..кі!
Яны засеялі ўсе сце..кі.
Ім даспадобы і ла..чыны,
І больш высокія м..сціны.
А часам нават на п..лянку
С..мейка іх заблудзіць **зранку**.
І нават як пах..ладнее
І на грыбочкі **лес** зб..днее,
Н..мала іх і пры марозе
С..дзіць у г..нарлівай позе.
Таму і **кошык** не **пустуе**
У тых, хто зранку ў лес пр..стуе.

*(Хведар Чэрня)*

**Даспадóбы** — падабаецца, падыходзіць, па густу.
**Лагчы́на** — нізкае месца, нізіна.
**Ганарлі́вы** — перакананы ў сваёй вартасці, годнасці; горды; ганарысты, фанабэрысты.
**Праставáць** — *(размоўнае)* ісці напрасткі, прама.

Якія літары прапушчаны ў словах верша?
Выпішыце з верша гэтыя словы, устаўляючы прапушчаныя літары.
Ахарактарызуйце выдзеленыя словы паводле ўзору.

Узор. *Зранку — два склады, націскны склад першы, галосныя гукі* ***[а], [у]****, абазначаны на пісьме літарамі* ***а, у****, зычныя гукі* ***[з], [р], [н], [к]****, цвёрдыя* ***[з], [р], [н]*** *— звонкія,* ***[к]*** *— глухі, абазначаны літарамі* ***з, р, н, к****. У слове 6 гукаў і 6 літар.*

*Зранку — <u>зран</u>-ку:*
*з — [з] — зычны, цвёрды, звонкі,*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*р — [р] — зычны, зацвярдзелы, звонкі,*
*а — [а] — галосны, націскны,*
*н — [н] — зычны, цвёрды, звонкі,*
*к — [к] — зычны, цвёрды, глухі,*
*у — [у] — галосны, ненаціскны,*
*6 літар, 6 гукаў.*

**32.** Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні.



Калі звычайна вырастаюць грыбы?
Якія мясціны ў лесе яны любяць?
Ці вы самі калі-небудзь збіралі грыбы?
Якія грыбы вы збіралі?
Ці спадабалася вам гэта рабіць? Чаму?

?! Адкажыце на пытанні так, каб атрымалася невялікае апавяданне. Выдзеліце ў вашым апавяданні 2—3 словы, ахарактарызуйце гукі і літары ў іх паводле ўзору з практыкавання 31.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**33.** Прачытайце верш. Адгадайце, што і хто схаваны ў вершы, з дапамогай малюнкаў.



Ты ў грыбах яго сустрэнеш,
там, дзе ў лесе многа сцежак,
а як В на Н заменіш —
зможаш ім грыбочак зрэзаць.



Запішыце словы-адгадкі. Ахарактарызуйце іх паводле ўзору з практыкавання 31.

## Праверце сябе

Выберыце правільны варыянт адказу.

1. У беларускай мове галосных гукаў...
а) 6;
б) 10.

2. Літар, якія абазначаюць галосныя гукі...
а) 6;
б) 10.

3. Зычныя гукі ***[р], [ж], [ч], [ш], [дж], [ц]*** называюцца...
а) цвёрдымі;
б) мяккімі;
в) зацвярдзелымі.

4. Літары ***о, э*** ў беларускай мове пішуцца...
а) заўсёды пад націскам;
б) заўсёды не пад націскам;
в) і ў націскных, і ў ненаціскных складах.

5. У першым складзе перад націскам...
а) на месцы літар ***е, ё*** пішацца ***я***;
б) застаюцца літары ***е, ё***.

6. У словах *увосень, увесну*...
а) 2 склады;
б) 3 склады.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

7. Словы *знаёмы, мяккі, з’есці* правільна пераносяцца так:
а) знаё-мы або зна-ёмы, мяк-кі, з’ес-ці;
б) з-наёмы, мя-ккі, з’-есці.

# МАЎЛЕННЕ

## *Урок 1. Беларуская мова і маўленне*

**34.** Прачытайце тэкст. Што новага вы даведаліся з яго пра маўленне?

Маўленне — гэта зносіны, якія адбываюцца з дапамогай мовы. Мы вывучаем беларускую мову, запамінаем шмат беларускіх слоў, вучым правілы. Усё гэта мы робім для таго, каб наша маўленне было правільным, прыгожым. Мы вучымся слухаць і разумець беларускае маўленне, вучымся размаўляць па-беларуску, чытаць і пісаць на беларускай мове.

Навошта мы гэта робім?

Каб разумець людзей, якія размаўляюць па-беларуску, каб разумець мову радыё і тэлебачання.

Каб адчуць прыгажосць і непаўторнасць твораў беларускіх паэтаў і пісьменнікаў... А праз іх творы — прыгажосць і веліч беларускага народа і роднай краіны.

Каб самім не выглядаць іншаземцамі на беларускай зямлі.

?! Навошта вывучаць беларускую мову? Адкажыце сказамі з тэксту.

* А навошта яшчэ патрэбна вывучаць беларускую мову? Падумайце і назавіце іншыя сферы выкарыстання беларускай мовы.

**35.** Прачытайце пачатак сказаў. Якім чынам іх можна працягнуць?

Беларускую мову патрэбна вучыць, каб...
Па-беларуску патрэбна чытаць, каб...
Па-беларуску патрэбна размаўляць, каб...

?! Запішыце адзін са сказаў цалкам.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**36.** Прачытайце выказванні славутых беларускіх пісьменнікаў пра мову.

Не мілей хіба нам наша родная мова,
дзе падкрэслена слава народа праз слова.

*(Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч)*

Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек перад скананнем... Не пакідайце ж мовы нашай беларускай! *(Францішак Багушэвіч)*

На рукі людскія наложаць аковы,
край стопчуць, заграбяць чужыя народы, —
у песнях жа родны край, родныя словы
жылі, і жывуць, і жыць будуць заўсёды.

*(Янка Купала)*

Роднае слова — гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет. Таму нам неабходна так старанна вывучаць сваю родную мову, ведаць і любіць лепшыя творы беларускай літаратуры. *(Якуб Колас)*

?! Кожны пісьменнік па-свойму тлумачыць, чаму неабходна ведаць родную мову. Растлумачце, як вы разумееце кожнае з гэтых выказванняў. Запішыце тыя радкі, якія вам спадабаліся больш за іншыя.

**37.** Прачытайце выказванні.

Беларускую мову можна і не вывучаць. У асноўным усе размаўляюць па-руску.

?! Ці згодны вы з гэтымі выказваннямі?
Аспрэчце іх. Дакажыце, што гэта не так.

**38.** Прачытайце. Да чаго вас заклікае аўтар?

Радзіму любім не за тое, што яна вялікая ці багатая. А за тое, што яна наша.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Не саромейся роднай мовы. Гавары па-беларуску, дзе б ты ні быў: дома ці ў школе, у вёсцы ці ў горадзе. *(Анатоль Клышка)*

**?!** Спішыце тэкст.
Якім маўленнем вы карысталіся, калі чыталі і пісалі тэкст: вусным ці пісьмовым?

## *Урок 2. Вуснае і пісьмовае маўленне. Правілы вуснага маўлення*

**39.** Прачытайце народныя выказванні. Растлумачце іх сэнс.

Слова — не верабей, паляцела — не зловіш.
Спачатку падумай, а потым скажы.
Што напісана пяром, не выйме і сякера.

**?!** Пра якое маўленне першыя два сказы: вуснае ці пісьмовае? А пра якое маўленне трэці сказ?
Які сказ можна лічыць адным з правілаў вуснага маўлення? Запішыце гэты сказ па памяці.

**40.** Разгледзьце малюнкі.







Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ





?! На якіх малюнках людзі карыстаюцца вусным маўленнем, а на якіх — пісьмовым?

У якой сітуацыі магчыма выкарыстанне і вуснага, і пісьмовага маўлення?

Гукамі ці літарамі карыстаюцца людзі ў пісьмовым маўленні? А ў вусным?

Складзіце і запішыце па адным з малюнкаў сказ. Якім маўленнем вы будзеце пры гэтым карыстацца?

**41.** Прачытайце народныя выказванні. Растлумачце іх сэнс.

Хто пытае, той шмат знае.
Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць.
Ласкавае слова, што веснавы дзень.

?! Растлумачце правілы вуснага маўлення, якія «зашыфраваны» ў гэтых сказах. Ці заўсёды вы прытрымліваецеся такіх правілаў?

Ці заўсёды вашы паводзіны адпавядалі тым, што рэкамендуюцца ў народных выказваннях? Раскажыце пра гэта.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**42.** Прачытайце тэкст. Якая яго тэма? Якую назву можна яму даць?

***суразмо́ўца***

Перш чым сказаць — падумай.

Калі гаворыш, не спяшайся, старайся дакладна выказваць думку, каб суразмоўца зразумеў цябе.

Калі слухаеш, будзь уважлівы, не перапыняй таго, хто гаворыць.

Суразмоўцы павінны быць ветлівымі адзін да аднаго, вытрыманымі, паважаць чужую думку. *(Мікалай Яленскі)*

Ці прытрымліваецеся вы такіх правілаў у вусным маўленні?
Якія яшчэ правілы маўленчых паводзін вы ведаеце?
Запішыце загаловак тэксту, які вы прыдумалі. Спішыце тэкст. Якім маўленнем вы карысталіся?

**43.** Прачытайце народныя выказванні. Пра якіх яны людзей? Ці ўмеюць гэтыя людзі гаварыць? А працаваць?

Многа робіць языком, ды мала рукамі.
Выхваляўся лайдак, ды не зрабіў ніяк.

Ці можна сказаць, што ў такіх людзей справа разыходзіцца са словам?
Якое з гэтых народных выказванняў пра лянівага чалавека, а якое — пра хвалько?
Ці правільна больш гаварыць, чым працаваць? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
Запішыце народныя выказванні ў сшытак.

## *Урок 3. Асаблівасці вуснага маўлення*

**44.** Прачытайце верш.

***жва́вы***

Імя такое ў Юркі
таму, што быстры, юркі,
рухавы, жвавы, спраўны,
словам — хлопец слаўны.

*(Васіль Вітка)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! У якім тэмпе, хуткім ці павольным, трэба чытаць гэты верш? Чаму? Прачытайце верш выразна і хутка.

**45.** Прачытайце скорагаворкі. Чаму яны маюць такую назву? У якім тэмпе іх патрэбна чытаць?

Асаку каса касіла,
асака касу прасіла:
— Не касі мяне, каса,
згіне ўся мая краса.

*(Хведар Ляшкевіч)*

Шубка ў авечкі
цяплейшая за печку.

У чаплі чапляня,
у зайкі зайчаня.

?! Навучыцеся расказваць гэтыя скорагаворкі хутка.
Працягніце трэцюю скорагаворку: раскажыце, хто ў лісы, мядзведзя, воўка, казы.

**46.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце подпісы пад імі.




*— Слухай парады старэйшых!*



*У вучняў дыктоўка.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



— Хутчэй бяжы да мяне! Мы спазняемся на гульню!

?! У якой з сітуацый, адлюстраваных на малюнках, лепш гаварыць хутка, а ў якой — павольна?

Спішыце сказы, што характарызуюць сітуацыю, у якой трэба гаварыць хутка.

**47.** Ахарактарызуйце вуснае маўленне вашых бацькоў. Як яны звычайна размаўляюць з вамі? Ласкава? Строга?

З якой інтанацыяй, у якім тэмпе, гучна ці ціха размаўляеце вы з сябрамі?

Як размаўляюць з вамі ў школе настаўнікі, выхавальнікі?

Як яшчэ могуць размаўляць людзі адно з адным?

**48.** Прачытайце лічылкі. Успомніце, у якой сітуацыі яны выкарыстоўваюцца.

Нам цыганка варажыла,  
спрытна  
карты варушыла:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

што было,
што ёсць,
што будзе —
ноччу госць
да вас прыбудзе...
А табе дала
наказ:
ты шукаць
павінен нас!

Сярод ночы
пад акном
загудзеў аэрадром.
Самалёты
прылятаюць,
пасажыраў
забіраюць.
Раз, два, тры,
чатыры, пяць,
табе трэба
вылятаць.

*(Уладзімір Мацвеенка)*

**аэрадро́м**

**пасажы́р**

?! Прачытайце вершы з інтанацыяй пералічэння спачатку ў павольным тэмпе, а пасля — у хуткім.

**Інтана́цыя** — рытм і меладыка маўлення, павышэнне і паніжэнне голасу; тон, характар вымаўлення, якія выражаюць пачуццё таго, хто гаворыць.

**49.** Прачытайце верш.

У зялёным бары
заспрачаліся сябры.
І спрачаліся,
і злаваліся,

**спрача́цца**

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

і смяяліся.
Чыя работа лепшая?
Чыя турбота першая?

*(Эдзі Агняцвет)*

**Турбóта** — клопат.

Колькі сказаў у вершы?
З дапамогай інтанацыі перадайце тыя пачуцці, якія выказваюцца ў кожным сказе верша.
Падрыхтуйцеся да адказу на пытанне, якімі рысамі характарызуецца вуснае маўленне.

## *Урок 4. Дыялагічнае і маналагічнае маўленне. Празаічнае і паэтычнае маўленне*

**50.** Прачытайце жарт. Ці смелы сабака насамрэч?

### Смелы сабака

— Сабака, чаго брэшаш?
— Ваўкоў пужаю.
— Сабака, чаго хвост падцяў?
— Ваўкоў баюся.

Якое маўленне тут выкарыстана: дыялагічнае ці маналагічнае?

Прачытайце жарт па асобах. Паспрабуйце з дапамогай інтанацыі перадаць яго сэнс. Першае выказванне сабакі прачытайце смела, задзірыста. Другое — з дрыжыкамі ў голасе, са страхам.

**51.** Паслухайце казку. Сачыце за інтанацыяй настаўніка.

### Цецярук і лісіца

Цецярук сядзеў на дрэве і пазіраў на заснежаны лес. Раптам да яго лісіца падышла ды кажа:


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



— Здароў, цецеручок, мой браток, як пачула твой галасок, дык і прыйшла цябе праведаць.

— Дзякуй за добрае слова, — адказаў цецярук.

Лісіца прыкінулася, што не чуе, і сказала:

— Што кажаш? Ты б, цецеручок, мой браток, зляцеў на сняжок пагуляць, са мной паразмаўляць, а то я дрэнна чую.

Цецярук адказаў:

— Баюся я злятаць на снег. Нам, птушкам, небяспечна хадзіць па зямлі.

— Ці ты мяне баішся? — спытала лісіца.

— Не цябе, дык іншых звяроў баюся, — кажа цецярук, — усякія звяры бываюць.

— Не, цецеручок, мой галубок, цяпер загад аб'яўлены, каб па ўсёй зямлі мір быў. Цяпер ужо звяры адзін другога не чапаюць.

— Гэта добра, — прамовіў цецярук. — А то вось сабакі бягуць: каб па-старому, табе б уцякаць трэба, а цяпер баяцца няма чаго.

Лісіца пачула сабак, навастрыла вушы і кінулася бегчы.

— Куды ж ты? — крыкнуў цецярук. — Цяпер жа загад, сабакі не будуць чапаць!

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— А хто іх ведае, — прабурчала лісіца, — можа, яны загаду не чулі.

І ўцякла. *(Паводле Льва Талстога; пераклад з рускай мовы)*

?! Чаму лісіца падышла да цецерука?

Што яна хацела зрабіць?

Як яна хацела падмануць цецерука?

Ці перахітрыла лісіца цецерука?

Як вы лічыце, з якой інтанацыяй трэба чытаць словы лісіцы? А словы цецерука?

У форме якога маўлення, дыялагічнага ці маналагічнага, напісана гэтая казка?

Прачытайце казку па асобах. Старайцеся перадаваць з дапамогай інтанацыі сэнс таго, пра што гавораць у казцы дзеючыя асобы.

**52.** Прачытайце правілы вуснага маўлення. Яны напісаны ў форме дыялогу ці маналогу?

Гаварыць і чытаць услых трэба выразна. Рабі паўзы ў канцы сказа, а таксама ў вялікіх сказах, там, дзе патрабуе сэнс. На пісьме паўзы абазначаюцца коскай, кропкай і іншымі знакамі.

Калі аб нечым пытаешся, рабі гэта з пытальнай інтанацыяй. Калі выказваеш моцнае пачуццё, рабі гэта з клічнай інтанацыяй.

Калі патрэбна, каб усе цябе пачулі, гавары гучна. Калі непажадана перашкаджаць іншым людзям, гавары ціха.

Звычайна чалавек размаўляе ў спакойным тэмпе, павольна. Але, калі тэрмінова трэба нешта паведаміць, можна гаварыць хутка.

?! З дапамогай якога знака абазначаецца на пісьме пытальная інтанацыя? А як перадаюцца апавядальная і клічная інтанацыі?

Паспрабуйце ахарактарызаваць сваё вуснае маўленне. Якое яно звычайна: хуткае ці павольнае, выразнае ці не вельмі, гучнае ці ціхае? Калі вы апісваеце сваё вуснае маўленне, у вас атрымліваецца дыялог ці маналог?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**53.** Прачытайце верш. Якое ў ім маўленне: паэтычнае ці празаічнае?

### Хто абстрыг дзьмухаўца?

З дзьмухаўцом
каля крынічкі
ветрык **забаўляўся.**
Па галоўцы
лёгка гладзіў —
дзьмухавец **смяяўся.**

***дзьмухаве́ц***

Ён пушыўся,
сам заўзята
з ветрыкам **дражніўся.**
А ў крынічку
раптам глянуў —
тут жа **спахапіўся!**

Быў ён смешны ў гэты **міг:**
— Хто,
калі
мяне **абстрыг?**

*(Мікола Чарняўскі)*

?! Адкажыце на пытанне, якое змешчана ў вершы.
Чым характарызуецца паэтычнае маўленне?
Прачытайце парамі выдзеленыя словы. Яны рыфмуюцца — значыць, яны падобныя па гучанні. Запішыце гэтыя словы парамі.

**54.** Прачытайце тэкст. Якое маўленне тут: дыялагічнае ці маналагічнае, паэтычнае ці празаічнае?

### Крынічка

Бурліць **крынічка.** Вербалоз прасцірае да яе свае **галіны.** Імклівымі ручайкамі сцякае з крынічкі **вада** ў раку.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Да крынічкі прыходзяць жывёлы. Вада ў крынічцы сцюдзёная і смачная. *(Паводле Тараса Хадкевіча)*

?! Спішыце тэкст.
Да выдзеленых слоў падбярыце вусна словы, з якімі яны рыфмуюцца.

**55.** Прачытайце верш.

Пасля сытнага абеду
сон схіліў старога дзеда.
Ён прыкрыў газетай лоб,
пазяхнуў і ўраз захроп.

*(Артур Вольскі)*

?! Колькі ў гэтым вершы сказаў?
Якое маўленне ў вершы: паэтычнае ці празаічнае? Растлумачце, чаму вы так лічыце. Выпішыце парамі словы, якія рыфмуюцца.

## *Урок 5. Маўленчы этыкет*

**56.** Прачытайце дзве размовы па тэлефоне. Якая з іх ветлівая, а якая — не? Чаму?

Галя тэлефануе Марыне. Да тэлефона падыходзіць мама Марыны.
— Марыну пазавіце.
— Дачкі няма дома. А з кім я размаўляю?
— Ну я пазней пазваню.

Марына тэлефануе маме Галі.
— Алё! Добры дзень! Гэта гаворыць Марына Мацвеева. Мы з Галяй вучым урокі. Дазвольце ёй, калі ласка, яшчэ трошкі пабыць у нас.
— Добра, Марына, вучыце. Перадай Галі, каб яна праз гадзіну была дома. Дзякую, што патэлефанавала.
— Калі ласка. Да пабачэння.

?! Хто з дзяўчынак больш ветлівы: Галя ці Марына?
Назавіце памылкі, якія дапушчаны Галяй у першай размове па тэлефоне.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прачытайце абедзве размовы па асобах.
Перадайце з дапамогай інтанацыі выхаванасць Марыны і нявыхаванасць Галі.

**57.** Прачытайце апісанне сітуацыі. Ці ветліва тут размаўляе і паводзіць сябе Юра?

Юра на перапынку не пайшоў на калідор, а застаўся сядзець за сваёй партай. Ён чытаў нейкую кнігу.

Падышла Таня.

— Юра, цікавая ў цябе кніга?

Юра закрыў кнігу і ўдарыў ёю Таню па плячы.

— А табе якая справа? Не чапляйся са сваімі пытаннямі!

Як вы ацэніце паводзіны і словы Юры?
А якая ветлівая размова магла адбыцца паміж Юрам і Таняй?

Разыграйце ветлівую размову па асобах. Дыялагічнае ці маналагічнае маўленне вы будзеце выкарыстоўваць?

**58.** Прачытайце апісанне сітуацыі.



Пасля ўрокаў некалькі дзяўчынак вырашылі сустрэцца і пагуляць. Каця пачала выхваляцца:

— Паглядзіце, якая ў мяне прыгожая сукенка. Мне тата прывёз яе з-за мяжы. Ні ў кога такой няма. Я — самая прыгожая!

— Ты — задавака, — сказалі дзяўчынкі.

Што вы думаеце пра паводзіны Каці?
Ці правільна хваліцца нейкімі рэчамі, якіх няма ў іншых? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**59.** Прачытайце апісанне сітуацыі.

У час перапынку хлопчыкі размаўлялі на калідоры ў школе. Побач праходзіла бабуля. Яна заглядвала ў кожны клас, некага шукала вачыма. Хлопцы не звярталі на яе ўвагі. Бабуля накіравалася да іх, але хлопцы пайшлі ў свой клас.

?! Ці ветліва паводзілі сябе хлопчыкі ў гэтай сітуацыі? Чаму?

Прадэманструйце, як хлопчыкі павінны былі паводзіць сябе з бабуляй.

**60.** Прачытайце апісанне сітуацыі, якая адбылася ў школьнай сталовай.

Вучні снедалі ў школьнай сталовай. Віця ўзяў кавалачак хлеба, скачаў шарык. Калі ніхто не бачыў, ён стрэльнуў і трапіў Дзіму ў твар. Дзіма схапіўся за шчаку і ўскрыкнуў.

?! Ці можна сказаць, што Віця пажартаваў? Чаму?

Растлумачце Віцю, як трэба адносіцца да хлеба.

**61.** Прачытайце апісанне яшчэ адной сітуацыі ў школьнай сталовай.

Вучні з настаўніцай Аленай Іванаўнай зайшлі ў сталовую на сняданак. На стале стаялі талеркі з кашай.

Слава гучна сказаў:

— Зноў гэтая брыдкая каша! Не буду я яе есці, самі ешце.

Повар Валянціна Мікалаеўна чула гэтыя словы, але толькі паківала галавой. А Алена Іванаўна з дакорам паглядзела на Славу і сказала:

— Мне сорамна за цябе, Слава. Прабачце, калі ласка, Валянціна Мікалаеўна.

?! Чаму настаўніца папрасіла прабачэння ў повара?
Ці правільна паводзіў сябе Слава ў адносінах да ежы і да працы іншага чалавека? Абгрунтуйце сваё меркаванне.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**62.** Прачытайце апісанне наступных сітуацый. Раскажыце, як патрэбна сябе паводзіць у такіх выпадках.

Вы сядзіце з аднакласнікамі за сталом і не можаце дацягнуцца да хлеба. Што вы зробіце?

Сёння на сняданак повар Валянціна Мікалаеўна спякла смачныя булачкі з джэмам. Алесі і Яне яны вельмі спадабаліся. Дзяўчаты хочуць падзякаваць Валянціне Мікалаеўне, але не ведаюць, як гэта зрабіць. Падкажыце ім.

**63.** Прачытайце апісанне сітуацыі.

На перапынку настаўнік папрасіў Віцю прынесці ў клас прылады да наступнага ўрока.

Віця ўбачыў дзяўчынак, якія стаялі ля ўвахода ў клас, і здалёк ім закрычаў:

— Эй, вы, прэч з дарогі, а то мне не прайсці!

Якія памылкі дапусціў Віця?
Ці выконваў ён правілы маўленчых паводзін?
А як правільна трэба было сябе паводзіць?

**64.** Прачытайце тэкст.

Тата з Федзем сабраліся пайсці на футбольны матч. Тата прыйшоў раней і чакаў Федзю.

Хутка 19 гадзін. Федзя спяшаўся на стадыён. Вось і тата. Ён прыветліва памахаў рукой сыну.

— Добры дзень, сынок! Малайчына, прыйшоў без спазнення. Усё ў парадку? Правядзём час у мужчынскай кампаніі. У нас добрыя месцы.

— Прывітанне, тата. Усё ў поўным парадку.

Сёння гуляе іх любімая каманда...

Удар! Мяч ляціць міма варот...

— Мазіла! — крычыць Федзя. Ён сярдзіта размахвае рукамі, штурхае суседа, аднак не заўважае гэтага.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




— Які нявыхаваны, некультурны хлопчык, — ціха прамовіў мужчына, які сядзеў побач, — зусім не ўмее паводзіць сябе ў грамадскім месцы. *(Паводле Наталлі Багуслаўскай, Наталлі Купінай; пераклад з рускай мовы)*

***стадыён***

?! Калі Федзя паводзіў сябе ветліва?
А калі паказаў сябе нявыхаваным хлопчыкам?
Што значыць «грамадскае месца»? Як трэба там сябе паводзіць?

Разыграйце абедзве сітуацыі ў асобах. Чытайце словы дзеючых асоб выразна: дзе патрэбна — спакойна, дзе патрэбна — гучна або ціха.

## *Урок 6. Пісьмовае маўленне*

**65.** Прачытайце загадкі.

Праз палі, масты, лясы
ляцяць словы-галасы.
Дзякуючы правадам
кажуць тут, а чуюць там.





Белым-белым ззяла поле,
бег па полі шустры Коля.
Там, дзе бег, за ім услед
слаўся-віўся чорны след.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З дапамогай якіх сродкаў ажыццяўляецца вуснае маўленне, а як перадаецца пісьмовае?
Спішыце другую загадку. Запішыце адгадку.

**66.** Успомніце правілы пісьмовага маўлення. Раскажыце іх.

**67.** Прачытайце прыказку. Як вы разумееце яе сэнс?

Кніга — маленькае акенца, ды праз яго ўвесь свет відзён.

Спішыце прыказку.

Ацаніце выкананне пісьмовага задання адно ў аднаго: ці прыгожа вы напісалі, ці ёсць памылкі?

**68.** Раскажыце, дзе выкарыстоўваецца пісьмовае маўленне.
Ці карыстаецеся вы дзе-небудзь, акрамя школы, пісьмовым маўленнем?
Ці пісалі вы каму-небудзь ліст або віншавальную паштоўку? Раскажыце пра гэта.

***віншава́нне***

**69.** Прачытайце тэкст віншавальнай паштоўкі.
Хто яе напісаў?
Як вы думаеце, каго віншуе Ян?
З якім святам?




Дарагая Наталля Генадзьеўна!
Віншую Вас з Новым годам. Жадаю Вам здароўя і добрага настрою.
Ваш вучань Ян.

Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах.

*Запомніце!*
Словы *Вы, Вас, Вам* пішуцца з вялікай літары, калі звяртаюцца да паважаных, старэйшых людзей.

**70.** Паводле ўзору з папярэдняга практыкавання напішыце ў сшытках віншаванне сваім блізкім або сябрам з якім-небудзь святам.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**71.** Напярэдадні Новага года купіце або зрабіце паштоўку, напішыце віншаванне і дашліце паштоўку сваім знаёмым або родным.

**72.** Прачытайце народныя выказванні. Ці добрае пісьмовае маўленне ў таго чалавека, пра якога можна так сказаць?

Ці ты пісаў пяром, ці певень кіпцюром.
Пісаў — стараўся, а чытаць — не ўзяўся.
З літары на літару — як з купіны на купіну.
Ці прачытаеш, ці вочы паламаеш.

**Ку́піна** — грудок сухой, цвёрдай зямлі на нізкім або балоцістым месцы, аброслы мохам, травой.

Ці можна так сказаць пра тое, як вы самі пішаце?
Запішыце па памяці адно з выказванняў.
Праверце сябе па кнізе.

**73.** Разгледзьце паштоўку. Прачытайце адрас.
Успомніце, як ён пішацца.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Назавіце індэкс паштовага аддзялення, на якое адпраўляецца паштоўка. А які індэкс паштовага аддзялення, з якога адпраўлена паштоўка? Які адрас у таго, хто напісаў паштоўку? А ў таго, каму яна дасылаецца?

**74.** Паводле ўзору з папярэдняга практыкавання запішыце ў сшытках свой адрас, а таксама адрас таго, каму вы хочаце даслаць паштоўку.

## Праверце сябе

Выберыце правільны варыянт адказу.

1. Маўленне бывае...
а) вусным і пісьмовым;
б) працяглым і кароткім;
в) цікавым і нецікавым.

2. Дыялог — гэта...
а) размова двух чалавек;
б) гаворка адной асобы;
в) размова многіх людзей адначасова.

3. Маналог — гэта...
а) размова двух чалавек;
б) гаворка адной асобы;
в) размова многіх людзей адначасова.

4. Вуснае маўленне ажыццяўляецца з дапамогай...
а) літар;
б) гукаў.

5. Пісьмовае маўленне ажыццяўляецца з дапамогай...
а) літар;
б) гукаў.

6. Вуснае маўленне павінна быць...
а) ветлівым, спакойным, выразным;
б) гучным, невыразным;
в) ледзь чутным, няўпэўненым.

7. Пісьмовае маўленне павінна быць...
а) з памылкамі, неахайным;
б) непрыгожым, неразборлівым;
в) акуратным, разборлівым, без памылак.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ТЭКСТ

## *Урокі 1—2. Прыметы тэксту. Тэма выказвання ў тэксце. Асноўная думка выказвання*

**75.** Прачытайце сказы. Ці з'яўляюцца яны тэкстам? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

**Хлеб**

З даўніх часоў нашы продкі шанавалі хлеб. Хлебны бохан параўноўваўся з сонцам. У гонар хлеба складаліся гімны і песні. Хлебам і соллю заўсёды віталі самых дарагіх гасцей.



Хлеб не бывае лёгкім. За кожнай нават самай маленькай лустачкай стаіць нястомная праца людзей розных прафесій. Гэта аратыя, сейбіты, камбайнеры, аграномы, хлебапёкі...

*(Паводле Змітрака Марозава)*

***прафе́сія***

?! Якая тэма гэтага тэксту?
Што аўтар хацеў выказаць у сваім творы? Якая яго асноўная думка?

**76.** Прачытайце народныя выказванні. Растлумачце іх сэнс. Ці з'яўляюцца гэтыя сказы тэкстам? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Не сей пшаніцы, калі дзеці ідуць у суніцы.
Хлеб — усяму галава.
Жыць — Радзіме служыць.
Кожная маці не вораг свайму дзіцяці.

?! У якім з гэтых сказаў выказваецца асноўная думка тэксту «Хлеб»? Запішыце гэтае выказванне.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**77.** Прачытайце сказы. Ці з’яўляюцца яны тэкстам? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Усміхнуліся першыя зоркі, і вечар расінкі растрос. *(Язэп Пушча)*

Словы Антаніны Міхайлаўны балюча адгукнуліся ў сэрцы Лабановіча. *(Якуб Колас)*

Над зямлёй серабрыцца празрысты туман. *(Максім Танк)*

?! Ці звязаны гэтыя сказы паміж сабой?
Спішыце другі сказ. Растлумачце напісанне ў ім вялікай літары.

*Успомніце!*
Тэкст — гэта група сказаў, звязаных паміж сабой па сэнсе.
Тэкст мае пэўную **тэму**. На яе часта ўказвае загаловак.
У тэксце выдзяляюць **асноўную думку** — тое, аб чым хацеў сказаць аўтар чытачу або слухачу.

**78.** Прачытайце тэкст. Ахарактарызуйце яго: назавіце аўтара, тэму, вызначце асноўную думку.

Восенню журавлі пакідаюць радзіму вельмі неахвотна.

Павольна пралятаюць яны над вёскамі і пустымі палямі, разпораз падаю́ць свае сумныя галасы — цяжка з роднай зямлёй развітацца. А то закружацца на месцы, углядваючыся з вышыні ў мілыя сэрцу краявіды. Потым зноў выстраяцца ў трохкутнік і накіруюцца ўдалячынь. *(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

?! Ці можна выказаць асноўную думку гэтага тэксту наступнымі словамі: *«Няма нічога даражэй за радзіму»*? Запішыце гэты сказ у сшытку.

**79.** Прачытайце. Вызначце, ці з’яўляюцца наступныя сказы тэкстам. Які загаловак можна яму даць?

Жураўлі ляцелі над полем. Яны павольна ўзмахвалі крыламі, сумна курлыкалі. Ім не хацелася развітвацца з роднымі мясцінамі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ды хутка настануць халады. Птушкі паляцяць у цёплыя краіны. Але на чужыне яны не забудуць сваю радзіму. *(Паводле Якуба Коласа)*

?! Якая тэма гэтага тэксту? Ці падобная яна да тэмы тэксту з папярэдняга практыкавання?

Знайдзіце ў тэксце сказ, у якім выказваецца асноўная думка. Запішыце яго ў сшытку.

**80.** Прачытайце верш. Ці з'яўляецца ён тэкстам? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

**Вясковы ранак**

Пеўні ладзяць пераклічку,
значыць, час ужо ўставаць.
Змалку сталася ў прывычку —
нельга ў вёсцы доўга спаць.

Паляць печы гаспадыні,
скача полымя, жыве.
І рыпіць, бы ў небе сінім,
па-над студняй журавель.



Пахне смачна сырадоем,
статак пасвіць павялі.
І старое, і малое
свае справы пачалі.

Косы б'юць — аж адгалоскі.
Вуркнуў голуб на страсе.
І пакуль жывыя вёскі,
значыць, выжывем усе!

*(Тамара Барадзёнак)*

**Сту́дня** — калодзеж.
**Жураве́ль** — тут: прыстасаванне пры калодзежы для даставання вады ў выглядзе доўгага нятоўстага бервяна.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Сырадóй** — толькі што надоенае малако.
**Стáтак** — жывёлы, часцей аднаго віду, якія пасуцца або ўтрымліваюцца разам.

?! Якая тэма верша? Назавіце яго асноўную думку. У якім сказе яна выказана?
Запішыце сказ, які з’яўляецца асноўнай думкай тэксту.

**81.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць? Дакажыце, што тэма верша з папярэдняга практыкавання і тэма гэтага тэксту аднолькавыя.

У вёсцы сялянам трэба вельмі рана ўставаць. Асабліва летам, калі ўжо а палове сёмай гоняць статак на пашу. А дагэтуль кароўку патрэбна падаіць, напаіць. А яшчэ гаспадыні рана-раненька паляць у печы, кормяць свіней, курэй, іншых свойскіх жывёл. Да таго ж трэба прыгатаваць сняданак, а часта адразу і абед.

Мужчыны дапамагаюць па гаспадарцы. А ў час сенакосу яшчэ цёмначы ідуць з касой на луг. Касіць лепш чым раней, бо хутка настане гарачыня, раса высахне, і касіць будзе цяжэй.

Гэта толькі праца каля дома. Але ж сяляне працуюць яшчэ і на сельскагаспадарчым ці на якім-небудзь іншым прадпрыемстве. Туды ж таксама патрэбна паспець. Вось таму і ўстаюць у вёсцы вельмі-вельмі рана. *(Антаніна Змушко)*

?! Прыдумайце і запішыце загаловак тэксту.
Як адным сказам можна растлумачыць, чаму ў вёсцы рана ўстаюць?
Запішыце гэты сказ у сшытак.

**82.** Прачытайце народныя выказванні. Якое з іх найбольш дакладна апісвае асноўную думку тэксту з папярэдняга практыкавання?

Хто рана ўстае, той усё паспявае.
Ранішні зайчык зубкі цярэбіць, а позні вочкі прадзірае.
Таму сонца ўсміхаецца, хто рана прачынаецца.

?! Запішыце выказванне, якое з’яўляецца асноўнай думкай тэксту з папярэдняга практыкавання.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**83.** Разгледзьце малюнак.



Складзіце па малюнку некалькі сказаў, каб атрымаўся тэкст на тую ж тэму, што і ў трох папярэдніх практыкаваннях. Прыдумайце загаловак. Запішыце ў сшытак загаловак і тэкст.

*Успомніце!*
Правільна афармляйце тэкст на пісьме. Пачынайце тэкст з «чырвонага» радка. Першае слова кожнага сказа пішыце з вялікай літары. У канцы сказаў стаўце патрэбныя знакі прыпынку.

**84.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць?

Прыемна і шчымліва назіраць за надыходам летняй ночы. На небе з'яўляюцца першыя зоркі. Яны ўзнікаюць нечакана, і становіцца іх з кожнай хвілінай больш і больш. Падымаецца сярпок месяца. Вось на небе можна адрозніць і некаторыя сузор'і. Яшчэ адзін дзень скончыўся і ніколі не вернецца.

Напішыце загаловак тэксту. Спішыце тэкст.

Раскажыце, якія пачуцці выклікаў у вас гэты тэкст.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урокі 3—4. Часткі тэксту*

**85.** Прачытайце вершаваны тэкст. Як вы думаеце, што выказана ў загалоўку: тэма тэксту ці асноўная думка? Чаму маці шчаслівая?

### Шчаслівая маці

Пяць дачок у маці,
родных пяць галубак.
Што ні робяць дочкі —
глянуць воку люба!
Галя мые кухню,
залу — Лена з Верай.

А Хрысціна смажыць
бульбу на вячэру.
Меншая, Анюта,
хлеб купіла ў краме...
Залатыя дочкі
у шчаслівай мамы!

*(Міхась Хамянкоў)*



?! Аб чым паведамляецца ў пачатку тэксту?
Што апісваецца ў асноўнай частцы?
Чым заканчваецца верш?
Колькі частак можна вылучыць у гэтым тэксце?

*Запомніце!*
Многія тэксты можна падзяліць на часткі: пачатак тэксту, асноўная частка, заключная частка (канцоўка).

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**86.** Прачытайце тэкст. Чаму кожнае дзіця лічыць сваю маці лепшай за ўсіх?

### Хто лепшы за ўсіх

На вуліцы сярод людзей заблудзілася дзіця. Бегае, крычыць, шукае маці. Людзі пытаюцца ў дзіцяці: «Якая твая мама, дзяўчынка?» А яно праз слёзы адказвае: «Ці ж вы не ведаеце? Мая мама лепшая за ўсіх». *(Леў Талстой; пераклад з рускай мовы)*

?! Як пачынаецца гэты тэкст?
Аб чым расказваецца ў асноўнай частцы?
Якая канцоўка тэксту?

**87.** Прачытайце народныя выказванні. На якую яны тэму?

Пры сонейку цёпла, пры мамачцы добра.
Матчыны рукі заўсёды ласкавыя.
Птушка рада вясне, а дзіця — маці.

?! Ці згодны вы з гэтымі выказваннямі?

Прадыктуйце адно з выказванняў свайму суседу па парце. Затым запішыце наступнае пад яго дыктоўку. Праверце запісы адно ў аднаго.

**88.** Ці ведаеце вы, калі адзначаецца свята матуль?
Прачытайце наступныя словы.

Мама, завуць, жыве, працуе, дзеці, родная, добрая, ласкавая, люблю.

?! З дапамогай гэтых слоў і наступных пытанняў раскажыце пра сваю маці.
Як завуць вашую матулю?
Дзе яна жыве?
Кім працуе?
Колькі ў яе дзяцей?
Якая ваша маці?
Як вы да яе ставіцеся?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**89.** Адкажыце на пытанні з папярэдняга практыкавання.
Запішыце тэкст пра вашых матуль, які атрымаўся.
Знайдзіце ў ім пачатак, асноўную частку і канцоўку.

**90.** Прачытайце ліст, які напісала дачка сваёй маці. Звярніце ўвагу, што ліст, пісьмо — гэта таксама тэкст.

Добры дзень, дарагая мамачка!

Учора я атрымала пісьмо ад цябе і вельмі ўзрадавалася. Мы з бабуляй некалькі разоў яго перачытвалі.

У нас з бабуляй усё добра. Я часта хаджу на рэчку купацца, бо вельмі горача. З раніцы прыбіраю ў хаце, дапамагаю бабулі ў агародзе. Два разы мы хадзілі ў лес, назбіралі чарніц, наварылі варэння. У мяне з'явіліся ў вёсцы сяброўкі, Каця і Таня. Яны тут жывуць і вучацца ў школе.

Мне падабаецца адпачываць у вёсцы. Прыязджай, мама, да нас. Мы з бабуляй сумуем па табе. Да пабачэння.

Твая дачка Алена.

?! Аб чым паведамляецца ў пачатку пісьма?
Што расказвае дзяўчынка ў асноўнай частцы?
Зачытайце канцоўку пісьма.

**91.** Уявіце, што вы на канікулах адпачываеце ў аздараўленчым лагеры. Напішыце ліст сваім матулям па наступным плане.

1. У пачатку тэксту павітайцеся з матуляй.
2. У асноўнай частцы раскажыце, чым вы займаецеся ў лагеры.
3. У канцоўцы выкажыце свае пачуцці да матулі і запрасіце яе наведаць вас у лагеры.

**92.** Прачытайце тэкст. Якая яго асноўная думка? Ці можна знішчаць што-небудзь у лесе?

### Апавяданне пра кусты і дрэвы

Не бывае лесу без дрэў. Але ў лесе павінны быць не толькі дрэвы. Лесу неабходны і розныя кусты. Навошта яны патрэбны?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У лесе жывуць розныя птушкі. Адны з іх робяць свае гнёзды на дрэвах, другія — у кустах.

Птушкі ў лесе знішчаюць тысячы жукоў і вусеняў. Вусені і жукі аб’ядаюць лісце. А хіба дрэва можа жыць без лісця?

У лесе і дрэвы, і кусты, і птушкі, і звяры нібы ў адну гульню гуляюць. І трэба добра ведаць правілы гэтай гульні.

Будзьце абаронцамі лесу! *(Паводле Ільі Маршака і Алены Сегал)*

?! Знайдзіце ў тэксце яго пачатак, асноўную частку і канцоўку. Запішыце канцоўку тэксту.

**93.** Прачытайце тэкст. Які яго пачатак? Аб чым расказваецца ў асноўнай частцы? Пра што гаворыцца ў заключнай частцы тэксту, канцоўцы?

Настаўніца расказвала дзецям пра белага голуба міру. Жыве ён у людзей, якія хочуць міру. Васілёк таксама захацеў мець такую птушку.

Аднойчы Васілёк убачыў у суседа белага голуба. Хлопчык падумаў, што гэта голуб міру. Васілёк расказаў суседу пра сваю вялікую мару.

Праз тыдзень сусед прынёс Васільку беленькіх галубочкаў. Цяпер у хлопчыка жывуць два галубы міру. *(Святлана Якуба)*

?! Якая тэма гэтага тэксту? Які загаловак яму можна даць?

## *Урокі 5—6. План тэксту. Складанне тэксту па плане*

**94.** Прачытайце тэкст. Чаму ён мае такую назву? Ці ведаеце вы, што такое барометр?

***баро́метр***

### Лясны барометр

Стаяў ціхі, прыгожы дзень. Пад шчодрым сонцам усё буяла, цвіло.

Толькі дзве сініцы не знаходзілі спакою. Яны скакалі па асіне, дзяўблі кару, па чарзе ныралі ў дупло. Чаго ж яны так трывожыліся?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Зірнуў я на неба і зразумеў. З захаду насоўвалася чорная хмара. А сініцы лепш за ўсіх адчуваюць набліжэнне навальніцы.

*(Паводле Хведара Жычкі)*

**Баро́метр** — прылада для вымярэння атмасфернага ціску. Тут: паказальнік якіх-небудзь змен, стану чаго-небудзь.

**Буя́ць** — бурна расці; пышна красаваць.

Колькі частак у тэксце? Як яны выдзелены?
Аб чым расказваецца ў першай частцы?
Што гаворыцца ў другой частцы?
Аб чым расказваецца ў трэцяй частцы тэксту?
Прачытайце план тэксту.

1. Ціхі дзень.
2. Трывога сініц.
3. Хутка навальніца.

Запішыце загаловак і план тэксту.
Перакажыце тэкст вусна з дапамогай плана.

**95.** Прачытайце казку.

### Лясны доктар

На ўскрайку лесу расла старая сасна. Восенню яна моцна захварэла. Сасна пачала жоўкнуць. Перад зімой ёй стала яшчэ горш.

Доўга раіліся лясныя жыхары і вырашылі запрасіць на дапамогу дзятла.

Пачысціў дзяцел нос і пачаў лячыць дрэва. Працаваў ён цэлымі днямі. Хутка ўсіх караедаў падаставаў з-пад кары. Сасне адразу стала лягчэй жыць. Яна радасна зашумела. *(Паводле Мікалая Сідарава; пераклад з рускай мовы)*

***ра́іцца***

Колькі частак у тэксце?
Дайце назвы кожнай частцы тэксту.
Запішыце загаловак тэксту і назвы яго частак — план тэксту.
Перакажыце тэкст з дапамогай плана спачатку вусна, а потым — пісьмова.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**96.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць? Якая яго асноўная думка?

Хлопчык бегаў па вуліцы. Неспадзеўкі спатыкнуўся, упаў і параніў нагу. Хлопчыка прынеслі дамоў. Маці яго была хворая. Яна пачула стогн сына, ускочыла з пасцелі, каб быць ля яго. Хлопчык перастаў стагнаць. Пакуль яму абвязвалі нагу, ён ні разу не крыкнуў.



— Ці табе не баліць? — спытаў у яго ў канцы доктар.

— Дужа баліць! — шэптам сказаў хлопчык. — Але я не хачу, каб мама ведала пра гэта. *(Паводле Леанілы Гарэцкай)*

?! З чаго пачынаецца тэкст?
Аб чым расказваецца ў асноўнай частцы?
Аб чым — у канцоўцы тэксту?
Складзіце план тэксту. Запішыце яго.
Перакажыце тэкст вусна па плане.

**стогн**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**97.** Прачытайце тэкст. Што ў ім не так?

### У лесе восенню

ціха шуміць сваім веццем асенні лес наваколле ззяе залацістым упрыгожаннем бяроз дзіўным веерам разносяцца іх лісточкі і павольна апускаюцца на зямлю

дубы насцілаюць пад сабою карычневую мяккую пасцельку у гэтую пасцельку шлёпаюцца жалуды

А вось бліснуў кляновы ліст. Адкуль ён зляцеў? Ах, вунь ён дзе, клянок! Улетку ён быў непрыкметны. Прыйшла восень. Клянок рассыпаў свае казачныя зоркі. Яны ўтварылі прыгожы дыван. *(Іван Шамякін)*

?! На колькі частак падзелены тэкст?

Назавіце кожную частку адпаведна назве дрэва, пра якое ў ёй расказваецца.

Падзяліце першыя дзве часткі тэксту на сказы.

* Запішыце план тэксту.

Спішыце першыя дзве часткі. Правільна афармляйце сказы на пісьме.

Запішыце назву трэцяй часткі тэксту.

Спішыце трэцюю частку тэксту.

Захоўвайце патрэбныя знакі прыпынку.

**98.** Прачытайце тэкст. Ахарактарызуйце яго: якую ён мае назву, хто яго аўтар, якія тэма і асноўная думка. Ці ведаеце вы, хто такая Надзея Дурава?



### Люлька

Бацька прывёз з далёкага падарожжа маленькую малпачку Люльку. Андрэй быў вельмі рады падарунку.

Але ў доме пачаліся безупынныя беспарадкі. Раптоўна падаў столік і разбіваўся посуд. Кнігі і алоўкі Андрэйкі

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

апыналіся пад ложкам. У мамінай сукенцы з’явілася вялікая дзірка.

Усюды былі сляды Люльчыных штучак. Прыйшлося аддаць Люльку ў цырк. *(Паводле Надзеі Дуравай; пераклад з рускай мовы)*

?! Колькі частак у тэксце?

Як вы разумееце сказ: «*Усюды былі сляды Люльчыных штучак*»?

Пра што гаворыцца ва ўступнай частцы? У асноўнай? Аб чым заключная частка тэксту?

Дайце назву кожнай частцы. Запішыце назву і план тэксту.

**99.** Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вы былі калі-небудзь у цырку?
Ці спадабалася вам там?
Якія артысты выступалі?
Ці былі клоўны?
Які нумар цыркавой праграмы запомніўся, уразіў?
Ці хочаце вы наведаць цырк яшчэ?

?! Запішыце адказы на пытанні. Якую назву можна даць тэксту, што ў вас атрымаўся?

**100.** Уявіце, што ў вас ёсць сябар або сяброўка, якія жывуць у іншым горадзе.

Напішыце яму або ёй невялікае пісьмо па наступным плане.
1. Прывітанне.
2. Як справы ў сябра або сяброўкі?
3. Мае навіны.

**101.** Прачытайце сказы. Размясціце іх так, каб атрымаўся тэкст.

Нягледзячы на гэта, у часы вайны беларусы лічыліся найлепшымі салдатамі: адважнымі, цвёрдымі, трывалымі. Беларус ніколі не вызначаўся ваяўнічым настроем. Ён не помніць злога і даруе крыўдзіцелям, таму што пачуццё помсты ў ім не развіта.

*(Паводле Мікалая Яленскага)*

***по́мста***

?! Аб чым гэты тэкст? Якую назву можна яму даць? Запішыце назву і тэкст, ставячы сказы ў правільнай паслядоўнасці.

**102.** Прачытайце тэкст. Ці добрую справу зрабілі дзеці? Якую назву можна даць тэксту?

На беразе рэчкі адзінока рос вялікі куст чорных парэчак.

Растаў снег. Падсохла зямля. Да куста парэчак прыйшлі дзеці з настаўнікам. Яны пасадзілі многа новых чаранкоў.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Праз некалькі гадоў па берагах рэчкі разрасліся густыя парэчкавыя кусты. *(Паводле Нічыпара Парукава)*

Колькі сказаў у гэтым тэксце?
Прачытайце тэкст яшчэ раз. Перакажыце яго вусна.
Запішыце план тэксту.

1. Адзінокі куст.
2. Праца дзяцей.
3. Парэчкавыя кусты.

Напішыце пераказ тэксту, абапіраючыся на пытанні.

Дзе рос куст парэчак?
Хто прыйшоў да рэчкі?
Што зрабілі дзеці разам з настаўнікам?
Як змяніліся берагі рэчкі праз некалькі гадоў?

**103.** Прачытайце заяву. Ці ведаеце вы, што гэта за дакумент? У якіх выпадках пішуць заяву?

***зая́ва***

Дырэктару Рудзенскай
школы-інтэрната
Гілеўскаму В. І.
вучня 8-га класа
Краўчанкі Алега

заява.

Прашу дазволіць мне наведваць басейн.
Медыцынская даведка дадаецца.
10.09.2017 Подпіс

**Зая́ва** — пісьмовая просьба аб чым-небудзь, складзеная па ўстаноўленай форме.

Напішыце заяву з просьбай дазволіць вам наведваць якую-небудзь спартыўную секцыю, што ёсць у вашай школе.
Запішыце свае дадзеныя: назву школы, прозвішча і ініцыялы дырэктара, сваё прозвішча і імя.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**104.** Прачытайце і запомніце.

Заява — гэта таксама тэкст. У заяве чалавек выказвае просьбу аб чым-небудзь. У дарослым жыцці заявы даводзіцца пісаць даволі часта. Напрыклад, аб прыняцці на працу, аб адпачынку, аб выдзяленні пуцёўкі ў санаторый. Альбо аб прыняцці сына ці дачкі ў дзіцячы сад або школу і гэтак далей.

Заява своеасабліва афармляецца на пісьме. Уверсе справа пішацца пасада, ініцыялы і прозвішча таго чалавека, каму адрасуецца заява. Таксама ўказваецца прозвішча, імя і імя па бацьку таго, хто піша заяву.

Пасярэдзіне наступнага радка, звычайна з малой літары, пішацца слова «заява».

Далей з «чырвонага» радка пішацца тэкст заявы. Звычайна ён пачынаецца са слова «прашу».

Пасля тэксту заявы на наступным радку злева ставіцца дата напісання заявы, а справа — подпіс таго, хто пісаў заяву.

**105.** Прачытайце заяву, напісаную ад імя бацькоў. Якая просьба ў ёй утрымліваецца?

Дырэктару школы-інтэрната
№ 10 г. Мінска
Аніскевіч В. І.
Малашчанка Вольгі Пятроўны

заява.

Прашу дазволіць майму сыну Малашчанку Андрэю, вучню 8 «А» класа, не заставацца на самападрыхтоўцы па пятніцах. Па пятніцах у другой палове дня мы звычайна едзем у вёску, і Андрэй таксама едзе з намі.

15.09.2017 Подпіс

?! Спішыце гэту заяву, змяніўшы назву школы на тую, у якой вы вучыцеся. Змяніце таксама імёны і прозвішчы, а таксама ўкажыце клас, у якім вы вучыцеся.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**106.** Прачытайце сказы. Памяняйце іх месцамі так, каб атрымаўся тэкст.

Яно ўцякала ад гэтага страшнага звера. Петрык ішоў цераз сад. Хлопчык узяў кацяня на рукі. Раптам да ног хлопчыка прытулілася маленькае кацяня. Яму насустрач бег вялікі сабака. *(Паводле Васіля Сухамлінскага)*



?! Ці добры ўчынак зрабіў хлопчык?

Якую назву можна даць гэтаму тэксту?

Знайдзіце ў тэксце ўступную, асноўную часткі і канцоўку.

Запішыце назву тэксту.

Спішыце тэкст. Пачынайце кожную яго частку з абзаца.

## Праверце сябе

Выберыце правільны варыянт адказу.

1. Тэкст — гэта...

а) група сказаў, звязаных па сэнсе;

б) асобныя сказы, не аб'яднаныя адзінай тэмай.

2. Тэксты бываюць...

а) вершаваныя і празаічныя; вялікія і малыя;

б) толькі вершаваныя;

в) толькі празаічныя;

г) вялікія.

3. Заява, аб'ява, пісьмо — гэта...

а) не тэксты;

б) тэксты.

4. Тэкст можа дзяліцца на часткі.

а) Так;

б) не.

5. Загаловак тэксту часта ўказвае на...

а) тэму;

б) аўтара;



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

в) пачатак тэксту.

6. У тэксце вылучаюцца такія часткі:

а) уступная (пачатак), асноўная, заключная (канцоўка);

б) галоўная і негалоўная;

в) малая і вялікая.

# СКАЗ

## *Урокі 1—3. Сказ. Віды сказаў*

**107.** Прачытайце. Вызначце, дзе запісаны асобныя словы, а дзе сказы.

Ноч, зямля, ахінула, зоркі,
замігцелі, першыя, неба,
месяц, узнімацца.

Ноч толькі што ахінула зямлю.
Першыя зоркі замігцелі ў небе.
З-за лесу ўзнімаецца месяц.

?! Чым адрозніваецца сказ ад асобных слоў?
Што выражаецца ў сказах?
З якой літары пачынаюць пісаць сказ?
Якія знакі могуць стаяць у канцы сказаў?
Спішыце сказы.

> *Успомніце!*
> Сказ — гэта адно або некалькі слоў, якія выражаюць закончаную думку.
> Усе словы ў сказе звязаны паміж сабою па сэнсе.
> Сказ пачынаюць пісаць з вялікай літары.
> У канцы сказа могуць стаяць кропка, пытальнік або клічнік.

**108.** Прачытайце словы. Памяняйце іх месцамі так, каб атрымаўся сказ.

Падворку, певень, і, на, гаспадар, сваім.

?! Ці атрымалася ў вас народнае выказванне?
Растлумачце значэнне гэтага сказа.
Запішыце яго, правільна афармляючы на пісьме.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**109.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў. Колькі сказаў атрымалася?

некрануты векавы бор абступае дарогу на сонцы стройныя сосны палыхаюць бліскучай смалой смалісты водар хвоі напаўняе паветра *(Паводле Тараса Хадкевіча)*

?! Ці ўтвараюць гэтыя сказы тэкст?
Запішыце тэкст, падзяляючы яго на сказы. Правільна афармляйце іх на пісьме.

**110.** Прачытайце верш. Колькі ў ім сказаў? Ці нагадвае вам тэма верша тэму тэксту з папярэдняга практыкавання?

Пахне свежай хваёвай смалой,
дубняком маладым і асінай.
Як абвесці навокал рукой, —
небасхіл да празрыстасці сіні.

*(Анатоль Астрэйка)*

?! Запішыце верш у сшытак.
Растлумачце правапіс вялікай літары ў сказах.

**111.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце словы пасля яго.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прыгожа, вельмі, гэтай, лесе, парой, у, зімовым; аснежаныя, стаяць, дрэвы; футры, белыя, нібы, апранулі, яны, пушыстыя.

?! Складзіце па малюнку тры сказы. Запішыце іх.

**112.** Разгледзьце малюнак. Раскажыце, што на ім адлюстравана.



?! Складзіце два сказы па малюнку. Запішыце іх у сшытак.

Словы для выбару: *ураджай, школьным, збіраюць, на, дзеці, агародзе; растуць, тут, бульба, буракі, морква, капуста, гарбузы.*

**113.** Прачытайце сказы. Назавіце знакі прыпынку, якія стаяць у канцы. Растлумачце іх пастаноўку.

Дзеці вучацца ў школе.
Хто вучыцца ў школе?
Вучыцеся, дзеці, добра!

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Хутка скончацца ўрокі.
Ці хутка скончацца ўрокі?
Няхай хутчэй заканчваюцца ўрокі!

?! У якіх з гэтых сказаў аб нечым паведамляецца?
У якіх — задаецца пытанне?
А ў якіх сказах утрымліваецца пабуджэнне да дзеяння? Зачытайце іх. Запішыце ў сшытак спачатку апавядальныя, потым пытальныя, а затым пабуджальныя сказы.

*Успомніце!*
Сказы бываюць апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя.
У **апавядальным** сказе аб нечым паведамляецца. У канцы яго ставіцца кропка.
У **пытальным** сказе аб нечым пытаюць. У канцы яго ставяць пытальнік.
У **пабуджальным** сказе ўтрымліваецца просьба, запрашэнне, заклік, загад (пабуджэнне да дзеяння). У канцы такога сказа можа стаяць кропка. Калі гэты сказ вымаўляецца з моцным пачуццём радасці, здзіўлення і гэтак далей, то ён яшчэ з'яўляецца і клічным. Тады ў канцы ставяць клічнік.

**114.** Прачытайце тэкст. З якімі просьбамі звяртаецца да вас аўтар? Ці выконваеце вы такія просьбы?

Шануйце і абараняйце птушак, нашых маленькіх вясёлых сяброў і памочнікаў.

Будуйце самі хаткі для птушак, ахоўвайце іх, не давайце нікому разбураць гнёзды і крыўдзіць птушанят.

Тлумачце ўсім, што птушкі не толькі цешаць людзей сваім прывабным выглядам і цудоўнымі спевамі. Яны яшчэ і дапамагаюць вырасціць добры ўраджай. *(Паводле Віталя Вольскага)*

**Прыва́бны** — які вабіць, прыцягвае да сябе; прыемны, мілы.

?! Назавіце віды сказаў у тэксце.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Назавіце ў пабуджальных сказах дзеясловы, у якіх утрымліваецца пабуджэнне да дзеяння.
Запішыце ў сшытак апавядальны сказ.

**115.** Паводле тэксту з папярэдняга практыкавання складзіце адзін-два пабуджальныя сказы. У іх звярніцеся з заклікам дапамагчы птушкам зімой да сваіх сяброў і аднакласнікаў.

**116.** Прачытайце верш. Пра якіх асілкаў гаворыцца ў ім?

**аси́лак**

### Асілкі

З веку ў век асілкі жывуць.
Капаюць каналы і поле аруць.
Будуюць у тундры, тайзе гарады
і садзяць у жоўтай пустыні сады.

Багацці для нас дастаюць з-пад зямлі
і запускаюць да зор караблі.
З веку ў век два асілкі жывуць.
**Вось яны, глянь.** Іх рукамі завуць.

*(Іван Муравейка)*

?! Колькі сказаў у вершы?
Які від выдзеленага сказа? Вызначце від астатніх сказаў.
Запішыце пабуджальны сказ у сшытак.

**117.** Прачытайце тэкст. Адкажыце на пытанні, якія змешчаны ў ім. Што за пачуцці выказвае аўтар у тэксце? Якая яго асноўная думка?



Вы чулі, як на світанні прачынаецца зямля? Вы бачылі, як сонца сыпле пяшчотныя праменьчыкі на лясы і палеткі? А ці чулі, як жаваранак разлівае свае

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

звонкія і салодкія ноты высока ў бясхмарным небе? Колькі любасці і пяшчоты ў яго спевах!

?! Колькі сказаў у тэксце?
Назавіце від першых трох сказаў. Якое слова ў іх дапамагае задаваць пытанні?
Назавіце від апошняга сказа. З якім пачуццём яго трэба чытаць?
Запішыце клічны сказ у сшытак.

**118.** Прачытайце загадкі. З дапамогай малюнкаў адкажыце, пра якія дрэвы ідзе гаворка.

Усе паны
паскідалі жупаны,
а двое паноў
не скінулі жупаноў.







Зялёная сястрыца
ў белым строі
соку напіцца
дасць вясною.

**Жупа́н** — старажытнае верхняе мужчынскае адзенне з каляровага сукна.
**Пан** — чалавек з прывілеяваных класаў (памешчык, дваранін); *размоўнае* — чалавек, які ўхіляецца ад працы сам і мае моду перакладваць работу на другіх.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ці можна назваць кожную загадку сказам? Якія гэта сказы?
Спішыце другі сказ. Запішыце слова-адгадку.

**119.** Прачытайце вершаваную загадку. Адгадайце яе з дапамогай малюнка.



Футра рыжае надзела
і ў люстэрка паглядзела.
Гэта што за прыгажуня?
Адгадайце!
Не скажу я!
Не злавіць, не ўбачыць зблізку,
бо палюе ціха ... .

*(Уладзімір Мацвеенка)*

Назавіце від кожнага сказа.
Які сказ з'яўляецца пабуджальным і клічным? Запішыце яго.

**120.** Прачытайце сказы. Чаго ў іх не хапае?

І чаму я прастудзіўся Я ж загартаваны *(Уладзімір Шахавец)*
Сыплюць лісцікі бярозы *(Станіслаў Шушкевіч)*
Дожджык, дожджык, секані *(Іван Муравейка)*
А колеру рэчка якога *(Іван Муравейка)*

Назавіце від кожнага сказа.
Спішыце сказы. Стаўце ў канцы патрэбныя знакі прыпынку.

**121.** Складзіце тры сказы.
У апавядальным скажыце, што вы пойдзеце на вуліцу.
У пытальным спытайце, ці пойдзе з вамі ваш сябар або сяброўка.
У пабуджальным запрасіце яе або яго пайсці з вамі.

Запішыце гэтыя сказы ў сшытак. Разам са сваім суседам па парце праверце, ці правільныя знакі прыпынку вы паставілі ў канцы сказаў.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**122.** Уявіце, што вы вярнуліся з прагулкі, і прыдумайце два сказы.
З дапамогай клічнага сказа скажыце, якое цудоўнае надвор’е на вуліцы.
З дапамогай пабуджальнага сказа пажадайце такога ж надвор’я і на заўтра.

Запішыце гэтыя сказы. Пастаўце неабходныя знакі прыпынку.

**123.** Уявіце, што хутка ў вас дзень нараджэння.
Паведаміце сябрам яго дату. Спытайце ў іх, ці змогуць яны да вас прыйсці. Запрасіце сяброў у госці.
Выкарыстайце сказы розных відаў.

**124.** Паслухайце выразнае чытанне верша настаўнікам.

**Раніца ў лесе**

А ці быў ты ў лесе рана?
Чуў ты лесу галасы?
Ветрам ён расхваляваны,
звоніць кроплямі расы.

Колькі песень, шуму, свісту!
Птушкі тут гаспадары.
А якія цымбалісты!
А якія песняры!

*(Паўлюк Прануза)*

Назавіце від кожнага сказа.
Навучыцеся чытаць верш гэтак жа выразна, як і настаўнік.
Выпішыце з верша пытальныя і клічныя сказы.

**125.** Прачытайце народныя выказванні. Растлумачце іх сэнс.

Розум не ў сіле, а ў слове.
Адной гаворкай сыты не будзеш.
Шукай сабе сябра ў бядзе.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Знайдзіце сярод гэтых выказванняў пабуджальны сказ. А якія астатнія сказы?
Запішыце сказы ў сшытак.

## *Урокі 4—7. Галоўныя і даданыя члены сказа*

**126.** Прачытайце сказ.

Ціха шуміць стары лес.

?! Пра што гаворыцца ў сказе?
Што гаворыцца ў сказе пра лес?
Спішыце сказ. Падкрэсліце слова *лес* адной лініяй, а слова *шуміць* — дзвюма лініямі. Якімі членамі сказа з'яўляюцца гэтыя словы — галоўнымі ці даданымі?
Галоўнымі ці даданымі членамі з'яўляюцца астатнія словы ў сказе?

*Успомніце!*
У сказе вылучаюць галоўныя і даданыя члены сказа.
**Галоўныя члены сказа** — дзейнік і выказнік. Слова, якое абазначае, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, называецца **дзейнікам**. Дзейнік адказвае на пытанні **хто?** або **што?**
Слова, якое абазначае, што гаворыцца пра дзейнік, называецца **выказнікам**. Выказнік адказвае на пытанні **што робіць? што рабіў? што будзе рабіць? што робяць?** і іншыя.
Усе астатнія словы ў сказе, калі яны ёсць, — гэта **даданыя члены сказа**.

**127.** Прачытайце сказы. Ці ёсць у гэтых сказах галоўныя члены? А даданыя?

Вучні ідуць. Самалёт ляціць. Птушкі спяваюць.

?! На якія пытанні адказваюць дзейнік і выказнік у кожным сказе?
Ці могуць быць сказы без галоўных членаў? А без даданых?
Падбярыце да дадзеных сказаў даданыя члены. Запішыце сказы, што атрымаліся.
Падкрэсліце адной лініяй дзейнік, дзвюма — выказнік.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**128.** Прачытайце сказы.

У чыстым полі гуляе вецер.
Празвінеў званок на ўрок.
Сонца грэе заўсёды ласкава.

?! Знайдзіце ў кожным сказе дзейнік і выказнік. На якія пытанні яны адказваюць?

Назавіце даданыя члены ў кожным са сказаў.

Спішыце сказы. Запішыце пытанні перад дзейнікам і выказнікам паводле ўзору.

Узор. *У чыстым полі (што робіць?) гуляе (што?) вецер.*

**129.** Прачытайце верш. Колькі ў ім сказаў?

Лунае песня ў сіняве.
Вітае ўсіх сасоннік.
І скача радасна ў траве
зялёны шустры конік.

*(Міхась Шаховіч)*

?! Знайдзіце галоўныя члены ў кожным сказе. Паспрабуйце прачытаць сказы без іх. Ці будзе сэнс у тым, што вы прачыталі?

Ці можна назваць сказам даданыя члены без галоўных?

Запішыце верш у радок па памяці. Падкрэсліце галоўныя члены ў кожным сказе.

*Успомніце!*

Галоўныя члены ўтвараюць аснову сказа. Галоўныя члены ўтрымліваюць асноўную думку. Без іх не можа быць сказа.

*Стаіць лес.*

*Расце дуб.*

Даданыя члены сказа не ўтвараюць. Яны дапаўняюць, удакладняюць тое, што выказваецца з дапамогай галоўных членаў.

*Стаіць заснежаны, сумны, маўклівы лес.*

*Пасярод паляны расце прыгожы, магутны дуб.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**130.** Прачытайце сказы. Параўнайце тыя, што запісаны злева, з тымі, што справа. Якія сказы больш дакладныя, прыгожыя?

| | |
|---|---|
| Вярба схілілася. | Вярба нізка схілілася над вадой. |
| Кветкі пахнуць. | Кветкі моцна пахнуць перад дажджом. |

?! Запішыце сказы з даданымі членамі. Пастаўце пытанні да галоўных членаў і падкрэсліце іх.

**131.** Прачытайце сказы.

Дзед Марк плёў кошыкі. Людзі карысталіся імі з задавальненнем. Кошыкі служылі вельмі доўга.

?! Вызначце галоўныя члены ў абодвух сказах. Пастаўце да іх пытанні. Спішыце сказы. Падкрэсліце адной лініяй дзейнікі, дзвюма лініямі — выказнікі. Запішыце пасля іх пытанні, на якія яны адказваюць. Хвалістай лініяй падкрэсліце даданыя члены сказа.

**132.** Прачытайце сказ.

Дзеці саджаюць у парку дрэўцы.

?! Аб кім гаворыцца ў гэтым сказе? На якое пытанне адказвае слова *дзеці*?

Што ў сказе гаворыцца пра дзяцей? Што яны робяць? Назавіце даданыя члены сказа.

Спішыце сказ. Падкрэсліце адной лініяй дзейнік, дзвюма — выказнік. Даданыя члены сказа падкрэсліце хвалістай лініяй.

**133.** Прачытайце тэкст.

### На беразе возера

На беразе возера раскінуўся сасновы лес. Унізе сцелецца верас. Над верасам гамоняць высокія сосны. Яны расказваюць чароўныя казкі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Возера маўчыць. На пясок павольна набягаюць хвалі. Чайкі лётаюць над люстранай вадой. *(Паводле Янкі Брыля)*

Колькі сказаў у тэксце?
Які сказ утвораны толькі галоўнымі членамі?

Запішыце тэкст пад дыктоўку суседа па парце: першую частку адзін з вас дыктуе, другі піша, другую частку — наадварот.
Праверце дыктоўкі адно ў аднаго. Падкрэсліце ў кожным з напісаных сказаў дзейнік і выказнік.

**134.** Разгледзьце малюнкі.












Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Складзіце да кожнага малюнка сказ, утвораны толькі з галоўных членаў. Пасля складзіце і дапоўніце свае сказы даданымі членамі.
Запішыце сказы, у якіх ёсць і галоўныя, і даданыя члены. Падкрэсліце адной лініяй дзейнікі, дзвюма — выказнікі.

Словы для выбару: *дом, беразе, стаіць, на; чытае, дзяўчынка, кнігу; плавае, хлопчык, рэчцы, у; кніга, на, ляжыць, стале.*

**135.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму? Якую назву можна яму даць?

Вечарам была адліга. Ішоў дождж. Ноччу раптоўна змяніўся вецер. Мароз мацнеў з кожнай гадзінай. Мокры снег зверху зацвярдзеў. Дрэвы абледзянелі. Іх ствалы заблішчалі, як шкло.

*(Паводле Васіля Гурскага)*

?! Назавіце ў кожным сказе галоўныя члены.
Выпішыце з кожнага сказа галоўныя члены, ставячы да іх пытанні. Падкрэсліце дзейнікі і выказнікі адпаведным чынам.
Якія сказы ўтвораны толькі галоўнымі членамі?

**136.** Прачытайце сказ.

Стаіць мой сад пад белым цветам. *(Цётка)*

?! Назавіце ў сказе дзейнік і выказнік. На якія пытанні яны адказваюць?
Якія словы з'яўляюцца тут даданымі членамі сказа?
Спішыце сказ. Падкрэсліце ўсе члены сказа адпаведным чынам.

**137.** Прачытайце сказы. На якую яны тэму?

Мы вучымся. Ідзе ўрок. Вучні чытаюць.

Словы для выбару: *у восьмым класе; зараз, беларускай мовы; заданні да практыкаванняў.*

?! Якія члены сказа ёсць у гэтых сказах?
Пашырце сказы: падбярыце да іх даданыя члены.
Запішыце сказы, што атрымаліся.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**138.** Прачытайце народнае выказванне. Як вы разумееце яго сэнс? Ці можна так сказаць пра чалавека?

Гнуткага дрэва вецер не зломіць.

?! Аб чым гэты сказ?
Што ў сказе гаворыцца пра вецер?
Вызначце ў сказе галоўныя і даданыя члены. Пастаўце пытанні да галоўных і даданых членаў.
Запішыце сказ. Падкрэсліце дзейнік і выказнік.
***Не*** з дзеясловам пішыце асобна.

**139.** Прачытайце тэкст. Пры чытанні ўстаўляйце прапушчаныя словы.

За вясковымі агародамі бяжыць (што?) ... . Ля яе стаіць (што?) ... вярбы. На тонкай галінцы сядзіць маленькая (хто?) ... і спявае. Спявае (хто?) ... надта добра. Гэта птушка — (хто?) ... .
*(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

Словы для выбару: *рачулка, куст, птушка, яна, салавей.*

?! Ці чулі вы, як спявае салавей?
У якую пару года ён асабліва многа спявае?
Якім членам сказа з’яўляюцца прапушчаныя словы?
Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя дзейнікі.

**140.** Прачытайце тэкст. Пра што ён?

І вось бліснула маланка. Лінуў спорны дождж. Неба пачало аддаваць належнае зямлі. Задыміўся нагрэты за дзень асфальт. Пацяклі ў вясёлых бурбалках ручаі. *(Паводле Тараса Хадкевіча)*

?! Які загаловак можна даць гэтаму тэксту?
Запішыце загаловак і тэкст. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказа.

**141.** Прачытайце скорагаворку. Якія гукі паўтараюцца ў ёй? Навучыцеся хутка яе чытаць і правільна вымаўляць усе гукі.

Шуміць ля ракі чарот шапаткі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Якое слова ў гэтым сказе з’яўляецца дзейнікам? На якое пытанне адказвае дзейнік?
Што за слова тут з’яўляецца выказнікам? На якое пытанне адказвае выказнік?
Спішыце сказ. Падкрэсліце дзейнік адной лініяй, выказнік — дзвюма.

**142.** Прачытайце тэкст. Як адносіцеся да кветак вы?

## Кветкі

Святланка любіць кветкі. Любоў гэта перадалася ад маці. Яна кожны год разводзіць ярка-чырвоныя гваздзі́кі, беласнежныя гладыёлусы, блакітныя флёксы і хрызантэмы. Даглядаць кветкі — любімы занятак Святланкі. З кветкамі жыццё становіцца прыгажэйшым. *(Паводле Тараса Хадкевіча)*



?! Вызначце ў першых трох сказах галоўныя члены.
Назавіце ў гэтых сказах даданыя члены. На якія пытанні яны адказваюць?
Спішыце першыя два сказы. Падкрэсліце галоўныя члены. Над даданымі членамі алоўкам запішыце пытанні, на якія яны адказваюць.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**143.** Прачытайце сказы. Пры чытанні ўстаўляйце прапушчаныя словы.

Прырода — цікавая кніга.

Перад дажджом белая лілея не ... сваіх пялёсткаў. Яна ... свае суквецці ад дажджавых кропель.

Калі над кветкамі акацыі ... мошкі, быць дажджу.

А яшчэ кветкі ... гадзіны сутак. Яны ... ў пэўны час. *(Паводле Алеся Пальчэўскага)*

**пялёстак**

**суквéцце**

С л о в ы  д л я  в ы б а р у: *раскрывае, аберагае, уюцца, паказваюць, распускаюцца.*

?! Якім членам сказа з'яўляюцца прапушчаныя словы?
Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя выказнікі.

**144.** Прачытайце сказы. Дапоўніце іх дадзенымі членамі, якія адказваюць на пытанні, што ў дужках.

(Д з е?) ... плаваюць (я к і я?) ... рыбкі. (К а л і?) ... пачынаюцца (я к і я?) ... канікулы. (Ч ы й?) ... брат пайшоў (к у д ы?) ... .

С л о в ы  д л я  в ы б а р у: *у сажалцы, прыгожыя, хутка, вясновыя, мой, у краму.*

?! Запішыце сказы з дадзенымі членамі.
Падкрэсліце галоўныя члены адпаведным чынам.

**145.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх галоўныя і дададзеныя члены. На якія пытанні яны адказваюць?

Прыемны лёгкі холад адчуваўся ў подыху ветру. *(Кузьма Чорны)*
З хмарнага неба зацерусіла дробная імжа. *(Васіль Вітка)*
Пад узгоркам блішчала круглае возера. *(Якуб Колас)*

?! Спішыце сказы. Запішыце пытанні да галоўных і дададзеных членаў сказа.

*Запомніце!*
Словы ***на, цераз, з, пад*** не з'яўляюцца членамі сказа. Да іх пытанні не ставяцца.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**146.** Прачытайце сказы, якія ўтвораны толькі галоўнымі членамі. Дапоўніце іх даданымі членамі, каб атрымаўся тэкст пра зімовы лес.

Стаіць лес. Свеціць сонейка. Стукае дзяцел. Патрэскваюць вершаліны.

Словы для выбару: *велічна, заснежаны; з-за хмар, зімовае; недзе, па дрэве; ад марозу, дрэў.*

?! На якія пытанні адказваюць даданыя члены ў дапаўненых вамі сказах? Запішыце тэкст, што ў вас атрымаўся.

**147.** Уявіце, што вы наведалі зімовы лес. Падрыхтуйце невялікае паведамленне пра свае ўражанні.

Запішыце два-тры сказы. Вызначце і падкрэсліце ў іх галоўныя і даданыя члены.

## *Урокі 8—10. Аднародныя члены сказа*

**148.** Прачытайце верш. Колькі ў ім сказаў?

**Нашы птушкі**

У нашым краі — Беларусі —
ёсць буслы, сарокі, гусі...
шпакі, зяблікі, цяцеры,
курапаткі пер’ем шэры,
ластаўкі, і верабейкі,
і сініцы, салавейкі...

*(Алесь Гурло)*

?! Назвы якіх птушак пералічваюцца ў вершы?
На якое пытанне адказваюць гэтыя словы? Да якога слова ўсе яны адносяцца?
З якой інтанацыяй вы чыталі верш?
Выпішыце ў сшытак назвы птушак.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**149.** Прачытайце тэкст. Ці нагадвае вам яго тэма верш з папярэдняга практыкавання?

## Галасы беларускіх лясоў

**Звіняць, заліваюцца** беларускія лясы птушынымі спевамі. На ўсю краіну гучаць іх галасы. А ўзначальваюць чароўную сімфонію салаўі.

Дзесьці ў густых шатах дрэў кукуе зязюля. **Сядзіць** на галінцы сініца і **ціўкае**. Вухкае вялізная сава.

Толькі чорны бусел **зашываецца** ў нетры і **маўчыць**. Гэтая таямнічая птушка не падае свайго голасу.

Можа, яна крыўдзіцца на каго? *(Паводле Уладзіміра Караткевіча)*

?! Пастаўце пытанні да выдзеленых слоў.
Ці на адно і тое ж пытанне адказваюць выдзеленыя словы ў кожным сказе?
Якімі членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы?
Запішыце сказы з гэтымі словамі ў сшытак.
Падкрэсліце ў сказах выказнікі.

*Запомніце!*
У сказе могуць быць словы, якія адказваюць на адно і тое ж пытанне, звязаны з адным і тым жа словам і вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння.
Яны называюцца **аднароднымі членамі сказа**.
***Вясной і ўвосень*** *тут нельга было прайсці* ***ні балотам, ні лесам.*** *(Іван Шамякін)*
Аднароднымі могуць быць і галоўныя, і даданыя члены сказа.

**150.** Прачытайце сказ. Вызначце ў ім галоўныя члены сказа.

Клёнік вырасце вялікім і прыгожым.

?! Якія словы з'яўляюцца даданымі членамі сказа? Ці можна іх лічыць аднароднымі членамі? Абгрунтуйце сваё меркаванне.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**151.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў другім і чацвёртым сказах аднародныя члены.

Колькі радасці ад птушак, калі яны вясной вяртаюцца з выраю! Каля хаты, у полі, у лесе чуваць іх ласкавы спеў. Ён не змаўкае ўсю вясну. Я люблю слухаць шпакоў, ластавак, жаўрукоў.

З якімі словамі звязаны аднародныя члены ў сказах?
Пастаўце пытанні да аднародных членаў.
Які знак стаіць паміж аднароднымі членамі сказа?
Выпішыце сказы з аднароднымі членамі.

*Запомніце!*
Паміж аднароднымі членамі сказа звычайна ставіцца коска.
*На лузе расцвілі дзьмухаўцы, званочкі, валошкі*.

**152.** Прачытайце незакончаныя сказы. Дапоўніце кожны з іх аднароднымі членамі.

У беларускіх лясах водзяцца ваўкі, ..., ... .
На палях Беларусі вырошчваюць бульбу, ..., ... .
Вялікія гарады Беларусі — Мінск, ..., ... .

Запішыце сказы з аднароднымі членамі. Пастаўце паміж аднароднымі членамі коскі.

**153.** Прачытайце наступны верш. З якімі просьбамі звяртаецца да вас паэт? Растлумачце сэнс кожнага закліку.

Мову матчыну шануй.
Ведай бохану цану.
Пранясі праз пакаленні
чалавечнасць і сумленне.

*(Уладзімір Мазго)*

***чалаве́чнасць***

***сумле́нне***

Колькі сказаў у вершы? Якія ўсе гэтыя сказы?
Знайдзіце ў апошнім сказе аднародныя члены. Якое слова стаіць паміж імі?
Запішыце апошні сказ верша. Падкрэсліце ў ім аднародныя члены.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**154.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх, выкарыстоўваючы аднародныя члены сказа.

Якія дрэвы растуць у садзе?
Людзі якіх прафесій працуюць у сельскай гаспадарцы?
Якую прадукцыю выпускаюць прадпрыемствы Беларусі?

?! Запішыце адказы на пытанні. Стаўце коску паміж аднароднымі членамі сказа.

**155.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

### Чалавечыя рукі

Колькі цудоўных рэчаў зрабілі старанныя, умелыя, працавітыя рукі! Рукі людзей розных прафесій клапоцяцца пра хлеб, малако, масла, цукар. Чалавечыя рукі шыюць, будуюць, пішуць, лечаць.

Рукамі ствараюцца машыны, станкі, самалёты, касмічныя караблі.

Праца рук на карысць грамадства, радзімы робіць чалавека разумным, шчаслівым, дужым. *(Іван Паўлоўскі)*

***грама́дства***

?! Знайдзіце ў тэксце аднародныя члены сказа.
* Вызначце, з якімі словамі яны звязаны, на якія пытанні адказваюць. Выпішыце паводле ўзору аднародныя члены сказа і словы, да якіх яны адносяцца.

Узор. *Рукі (якія?) старанныя, ... .*

**156.** Прачытайце тэкст.

### Гарадскія вуліцы

Гарадскія вуліцы розныя. Шырокія **і** прамыя, як страла. Вузкія **і** пакручастыя. Доўгія — праз увесь горад. І кароткія.

На шырокай **і** шумнай вуліцы шмат машын. Цяжка **і** небяспечна пераходзіць яе. Таму тут зроблены падземны пераход. *(Паводле Хведара Жычкі)*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Знайдзіце ў тэксце аднародныя члены сказа.
Якое слова стаіць паміж імі? Ці стаіць паміж аднароднымі членамі коска?

*Запомніце!*
Паміж аднароднымі членамі сказа могуць стаяць злучнікі ***і, а, ды, але, ці, або*** і інш.
Калі злучнікі ***і, ды*** ўжыты ў сказе адзін раз, то коска паміж аднароднымі членамі не ставіцца. Не ставіцца коска і перад адзіночнымі злучнікамі ***ці, або***.
*Каласіцца на палетку жыта ды пшаніца. (Кандрат Крапіва)*
*Ля кожнай маладой таполі яблынька ці вішня расцвіла. (Пімен Панчанка)*
Калі злучнік ***і*** паўтараецца перад аднароднымі членамі некалькі разоў, то коска паміж імі ставіцца.
*І сэрцы, і воля, і думы народа злучыліся ў плыні адной. (Якуб Колас)*
Перад злучнікамі ***а, але*** коска ставіцца заўсёды.
*Час быў нялёгкі, але вясёлы. (Іван Шамякін) Не васількамі, а буйным калоссем, лета, нам сэрца крані. (Кастусь Кірэенка)*

**157.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў тэксце назвы рэчак.

### Куды нясуць свае воды беларускія рэкі?

Наша беларуская зямля, можна сказаць, сочыцца вадою. Па ўсёй тэрыторыі параскіданы блакітныя люстэркі малых і вялікіх азёр. Карта Беларусі пранізана сінімі жылкамі крыніц, ручаёў, рачулак і магутных рэк. Іх налічваецца некалькі тысяч.

Адны рэкі ўпадаюць у Чорнае мора, другія — у Балтыйскае. У Балтыйскае мора нясуць свае воды Нёман, Заходняя Дзвіна, Буг, Ловаць. У Чорнае — Дняпро, Бярэзіна, Сож, Прыпяць і мноства дробных рэчак. *(Паводле Уладзіміра Караткевіча)*

?! Растлумачце напісанне вялікіх літар у словах тэксту.
Назавіце ў трэцім, шостым і сёмым сказах аднародныя члены.
Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**158.** Прачытайце верш. Пастаўце пытанні да выдзеленых аднародных членаў сказа.

### Ліска

**Навастрыла** вушы ліска,
**пачала ўглядацца:**
ці няма спажывы блізка —
**птушкі** або **зайца**?

*(Алесь Якімовіч)*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж аднароднымі членамі. Якімі членамі сказа з'яўляюцца словы *навастрыла, пачала ўглядацца*, а якімі — словы *птушкі, зайца*?

Спішыце верш. Падкрэсліце аднародныя члены сказа ў адпаведнасці з тым, галоўнымі ці даданымі членамі яны з'яўляюцца ў сказе.

**159.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў сказах аднародныя члены.

### На Сцюдзёнцы

Сцюдзёнка не дужа шырокая рака але вельмі глыбокая. Сцюдзёнкай яе назвалі невыпадкова. Нават у самы спякотны дзень вада ў рацэ халодная ледзяная. Гэта таму, што бяжыць яна праз густы цёмны лес праз балоты. Тысячы крыніц і крынічак упадаюць у яе. У Сцюдзёнцы многа ракаў і ментузоў. Ёсць і плоткі і акуні і самы́. *(Паводле Міколы Ваданосава)*

Растлумачце, у якіх выпадках паміж аднароднымі членамі патрэбна ставіць коскі, а ў якіх — не.

Спішыце тэкст. Стаўце, дзе патрэбна, коскі.

Падкрэсліце злучнікі паміж аднароднымі членамі.

**160.** Прачытайце тэкст. Вы ведаеце, у якой частцы Беларусі цячэ Бярэзіна? Ці далёка яна ад той мясціны, дзе вы жывяце?

### Бярэзіна

Бярэзіна — прыток Дняпра. Яна цячэ па беларускай зямлі. Рака сваёй вадой забяспечвае фабрыкі і заводы, поіць навакаль-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ныя палі. Правы бераг ракі высокі, а левы бераг нізкі, лугавы, балоцісты. *(Паводле Віталя Вольскага)*

?! Выпішыце з тэксту аднародныя члены сказа.
Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах.

**161.** Разгледзьце карту Беларусі. Назавіце рэкі, якія на ёй пазначаны. Якая з гэтых рэк працякае паблізу ад месца вашага жыхарства?




?! Складзіце і запішыце сказ з аднароднымі членамі — назвамі рэк Беларусі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**162.** Прачытайце тэкст. Ці можна сказаць, што ён працягвае тэмы тэкстаў з папярэдніх практыкаванняў?

Усе рэкі Беларусі дужа прыгожыя. Дняпро з высокім правым **берагам** і неагляднымі **далячынямі** зарэчных паплавоў, паплямаваных **дубамі** і сінімі **люстэркамі** старыц. Прыпяць з яе празрыстай цёмнай **вадой, астравамі, пратокамі** і **шапкамі** буслянак на прырэчных дрэвах. Ласкавы Нёман, у воды якога глядзяцца старажытныя **вежы** і густыя **пушчы**. *(Паводле Уладзіміра Караткевіча)*

**По́плаў** — луг у пойме ракі.
**Ста́рыца** — старое, перасохлае рэчышча.

Растлумачце, злучнікамі ці коскамі раздзяляюцца выдзеленыя аднародныя члены.
Выпішыце з тэксту сказы з аднароднымі членамі.

**163.** Раскажыце, якая рэчка працякае паблізу ад вас.
Якая яна летам, а якая — зімой?
Ці любіце вы адпачываць на ёй? Што вы там робіце?
Выкарыстайце ў сваім паведамленні аднародныя члены сказа.

**164.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх з дапамогай малюнкаў.

Ён вясёлы і гуллівы,
Мяккі, цёплы, вуркатлівы.





Урадзіўся ён высокі,
шаўкавісты, сінявокі.
Апранае ён здавён.
Здагадайцеся, хто ён.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Знайдзіце ў загадках аднародныя члены. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж імі.

Запішыце загадкі ў сшытак. Падкрэсліце аднародныя члены.

## Праверце сябе

Выберыце правільны варыянт адказу.

1. Сказы бываюць...

а) апавядальныя і пытальныя;

б) апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; клічныя і няклічныя;

в) пабуджальныя і клічныя.

2. У канцы сказа стаіць...

а) кропка;

б) кропка або клічнік;

в) кропка, пытальнік або клічнік.

3. Дзейнік і выказнік — гэта...

а) галоўныя члены сказа;

б) даданыя члены сказа;

в) аднародныя члены сказа.

4. Сказа не бывае без...

а) галоўных членаў сказа;

б) даданых членаў сказа;

в) аднародных членаў.

5. Аднародныя члены сказа...

а) адказваюць на адно і тое ж пытанне і адносяцца да аднаго і таго ж слова;

б) адказваюць на розныя пытанні і адносяцца да аднаго і таго ж слова;

в) адказваюць на розныя пытанні і адносяцца да розных слоў.

6. Аднародныя члены сказа могуць быць...

а) толькі даданымі членамі сказа;

б) і галоўнымі, і даданымі членамі сказа;

в) толькі галоўнымі членамі сказа.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СЛОВА

## *Урок 1. Значэнне слова*

**165.** Прачытайце тлумачэнні значэнняў слоў.

Гарла́ч — збан з вузкім горлам.

Каме́ль — ніжняя патоўшчаная частка ствала дрэва, раслін, якая прылягае да кораня; перавязаны канец снапа, веніка ці іншай падобнай рэчы.

Імклі́вы — вельмі хуткі, шпаркі; рухавы, энергічны, жвавы; палкі, гарачы, парывісты.

Ле́тась — у мінулым годзе, год таму.

?! Ці ведалі вы, што азначаюць словы, якія тлумачыліся?
Запішыце ў сшытак адно-два словы з тлумачэннем значэння.

**166.** Па ўмоўным абазначэнні знайдзіце ў вашым вучэбным дапаможніку тлумачэнні значэнняў слоў. Запішыце ў сшытак 4—5 слоў разам з апісаннямі іх значэння.
Выберыце тыя словы, значэнне якіх без тлумачэння было вам незразумелым.

**167.** Папрацуйце з «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы». Знайдзіце ў ім значэнні наступных слоў.

Дзень, вецер, зіма, надвор'е.

?! Выпішыце са слоўніка значэнні гэтых слоў.

**168.** Прачытайце тлумачэнні значэнняў слоў. Здагадайцеся, пра што ідзе гаворка.

Прадметы харчавання, харчовыя прыпасы — ... .

Работнік магазіна, гандлёвага прадпрыемства, які прадае тавар пакупнікам, — ... .


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Няяўка, нявыхад на работу, на заняткі без уважлівых прычын — … .

Праём у сцяне для ўваходу ў памяшканне, а таксама створ, якім закрываюць гэты праём, — … .

?! Запішыце словы, значэнні якіх тлумачыліся.

**169.** Прачытайце словы і тлумачэнні іх значэнняў. Якое слова адносіцца да якога значэння?

***раз'ю́шаны***

| | |
|---|---|
| Ахайны | моцна раззлаваны |
| раз'юшаны | старанна прыбраны, чысты, акуратны |
| ветлівы | своеасаблівы, непадобны да іншых |
| арыгінальны | ласкавы, далікатны, добразычлівы |

?! Запішыце словы разам з тлумачэннем іх значэння.

**170.** Прачытайце сказы. Устаўце замест кропак словы, якія падыходзяць па значэнні.

Мы выканалі (пісьмовыя, пісьменныя) і вусныя заданні.
Вельмі добра чалавеку быць (пісьмовым, пісьменным).
У лесе каля летняга дзіцячага лагера расце шмат (елак, ёлак).
На Новы год пад (елкай, ёлкай) дзеці знаходзяць шмат падарункаў.

?! Спішыце сказы, устаўляючы патрэбныя словы.

**171.** Папрацуйце ў парах.
Адзін вучань тлумачыць значэнне якога-небудзь слова, другі адгадвае, пра што ідзе гаворка. Пасля памяняйцеся ролямі.

**172.** З арфаграфічнага слоўніка, які размешчаны ў канцы падручніка, выпішыце пяць любых слоў. Знайдзіце іх значэнні ў тлумачальным слоўніку.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урокі 2—3. Сінонімы*

**173.** Прачытайце словы. Ці падобныя яны па значэнні?

Ежа, страва, харч, харчаванне, прадукты.
Малы, невялікі, мізэрны, мініяцюрны.
Блішчаць, ззяць, зіхцець.

***мізэ́рны***

?! Запішыце адзін з радоў блізкіх па значэнні слоў.
Складзіце і запішыце з адным са слоў сказ.

*Запомніце!*
Словы, якія маюць аднолькавае або блізкае значэнне, але па-рознаму гучаць, называюцца **сінонімамі**.
*Смеласць, храбрасць, адвага; выхаваны, ветлівы, далікатны.*

**174.** Прачытайце словы. Падбярыце да кожнага з іх сінонімы.

Бегчы — ..., гарачы — ..., халодны — ..., смачны — ... .
Словы для выбару: *імчацца, спякотны, сцюдзёны, апетытны.*

?! Запішыце пары сінонімаў. Да якіх часцін мовы яны адносяцца?

**175.** Прачытайце пары слоў. У якіх парах яны з’яўляюцца сінонімамі?

Крычаў — гукаў, крычаў — спяваў, крычаў — маўчаў, змог — здолеў, згубіў — знайшоў.

?! Да якой часціны мовы адносяцца гэтыя словы?
Запішыце пары слоў-сінонімаў.

**176.** Прачытайце пары слоў. Да якой часціны мовы яны адносяцца? У якіх парах словы — сінонімы?

Рослы — высокі, рослы — дужы, дужы — моцны, рослы — сімпатычны, сімпатычны — прыгожы.

?! Запішыце пары сінонімаў у сшытак.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**177.** Прачытайце сказы. У якім з іх ёсць сінонімы?

Прырода вучыць нас быць дбайнымі, клапатлівымі гаспадарамі. Прыемна падыхаць свежым зімовым паветрам.

?! Запішыце сказ з сінонімамі. Падкрэсліце сінонімы хвалістай лініяй.

**178.** Прачытайце народнае выказванне. Растлумачце яго значэнне. Знайдзіце ў ім словы-сінонімы.

Заўсёды трэба зычыць другому таго, чаго сабе жадаеш.

?! Спішыце прыказку. Падкрэсліце словы-сінонімы. Ці ведаеце вы іншыя сінонімы да гэтых слоў?

Ці зразумелі вы значэнне слова *зычыць*?

**179.** Прачытайце рады слоў. Знайдзіце «лішняе», якое не з'яўляецца сінонімам да астатніх слоў.

Назаўсёды, назаўжды, навокал, навечна.
Змагацца, біцца, ваяваць, звязваць.
Дужы, моцны, цяжкі, магутны.

?! Запішыце сінанімічныя рады ў сшытак.

**180.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх сінонімы слова *цемната.*

Вакол панавала цемрадзь, і сцежкі зусім не было відаць. *(Міхась Лынькоў)*

Цемень наступіла нечакана. *(Эдуард Самуйлёнак)*

У сутонні снежнае ночы там відаць былі сілуэты аўтамабіляў. *(Васіль Быкаў)*

Чарната — не відаць нічога за пяць крокаў. *(Барыс Сачанка)*

Пройдзе ночка, згіне цьма... *(Якуб Колас)*

?! Выпішыце са сказаў сінонімы. Ці ведалі вы столькі сінонімаў да слова *цемната*? Можа, вы ведаеце яшчэ сінонімы гэтых слоў? Калі так, то працягніце іх рад.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**181.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх сінонімы. Колькі груп сінонімаў вы знайшлі?

Хутка гусцеў сумны вячэрні змрок. *(Іван Мележ)*

Па тратуары ішла таропка жанчына з кошыкам. *(Платон Галавач)*

Ночы зорныя летнія пралятаюць імгненна. *(Іван Навуменка)*

Скора гаворыцца, ды няскора робіцца. *(Прыказка)*

Антон шпарка крочыў у бок лесу. *(Аркадзь Чарнышэвіч)*

?! Выпішыце са сказаў групы сінонімаў.

**182.** Назавіце сітуацыі, калі людзі *размаўляюць*, калі *шэпчуць*, калі *балбочуць*.

Якія яшчэ сінонімы слова *гаварыць* вы ведаеце?

Разыграйце кожную з такіх сітуацый. Можна выкарыстаць наступныя малюнкі.







**183.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім сінонімы.

За акном выла, скуголіла завіруха. Роўна з плотам накруціла сумёты. Завея замуравала вароты, браму. Гурбы прарваліся праз плот, разляргліся на ўвесь двор, адрэзалі шлях да калодзежа.

*(Паводле Валянціна Блакіта)*

?! Спішыце тэкст. Падкрэсліце ў ім чатыры групы сінонімаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 4. Антонімы*

**184.** Прачытайце пары слоў. Ці можна сказаць, што ў кожнай пары запісаны словы з процілеглым значэннем?

Высокі — нізкі, стары — малады, моцны — слабы, гаварыць — маўчаць, дзень — ноч.

?! Спішыце гэтыя пары слоў з процілеглым значэннем.

*Запомніце!*
Словы з процілеглым значэннем называюцца **антонімамі**.
*Холад — гарачыня, весела — сумна, добры — злосны*.

**185.** Прачытайце пары слоў. Якія з іх утвораны словамі-антонімамі?

Цёмны — цёплы, халодны — светлы, цёмны — светлы, цёплы — халодны, цёмны — халодны.

?! Запішыце пары антонімаў.
Да якой часціны мовы яны адносяцца?

**186.** Прачытайце пары слоў. Якія з іх — антонімы?

Выйсці — увайсці, выйсці — выбегчы, прыйшоў — сышоў, прыйшоў — прыскакаў, плыве — ляціць.

?! На якія пытанні адказваюць словы кожнай пары? Якой часцінай мовы яны з’яўляюцца?
Запішыце пары слоў-антонімаў.

**187.** Прачытайце прыказкі. Знайдзіце ў кожнай з іх антонімы.

Старасць — слабая на нозі, ды моцная на розум.
Благі абразіць, а добры разважыць ды яшчэ і парадзіць.
Малое слова вялікую крыўду робіць.

?! Спішыце прыказкі. Падкрэсліце антонімы хвалістай лініяй.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**188.** Прачытайце прыметы прыродных з’яў. Дапоўніце іх антонімамі.

Зіма марозная — лета ... .
Ранні прылёт шпакоў — да цёплай вясны, позні — да ... .
Больш птушак — ... шкодных насякомых.
Вялікая раса — да яснага дня, няма расы — да ... дня.

?! Запішыце сказы, якія атрымаліся, у сшытак. Падкрэсліце ў кожным сказе антонімы.

**189.** Прачытайце дзве пары загадак. Адгадайце іх. Якімі словамі з’яўляюцца адгадкі кожнай пары загадак?

Вабіць нас яно заўжды
ягадамі, жытам,
звонкай свежасцю вады,
сонечным блакітам.
А яна палоніць сном
луг, і сад, і поле,
пакрывае рэчку льдом,
снегам — наваколле.





Брат, празрысты, светлы,
працаваць нас кліча.
Запрашае ветла
спаць сястра-чарніца.
Ім абодвум, верце,
не па іхняй волі
разам не сустрэцца,
не пабыць ніколі.

*(Паводле Міхася Пазнякова)*

?! Запішыце адказы-антонімы.
* Складзіце два сказы, каб у кожным з іх былі антонімы з адгадак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**190.** Разгледзьце малюнак.




?! Па малюнку і на аснове ўласнага вопыту раскажыце, што можна рабіць зімой на вуліцы. Выкарыстайце ў сваім расказе сінонімы і антонімы. Запішыце 3—4 сказы ў сшытак.

**191.** Прачытайце словы ў слупках. Знайдзіце антонімы.

| | |
|---|---|
| Злы | стары |
| халодны | вясёлы |
| ясны | добры |
| новы | гарачы |
| сумны | хмуры |

?! Запішыце антонімы парамі.
Складзіце з любой парай антонімаў сказ. Запішыце яго.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ЧАСТКІ СЛОВА

## *Урок 5. Роднасныя словы. Корань слова*

**192.** Прачытайце словы. Што яны абазначаюць?

Прыстаўка, корань, суфікс, канчатак.

□ ⌐ ^ ⌒

?! Выберыце да кожнага слова яго адпаведнае ўмоўнае абазначэнне. Запішыце назву і яе ўмоўнае абазначэнне паводле ўзору.

Узор. *Прыстаўка* — ⌐ .

**193.** Прачытайце словы. Па ўмоўных абазначэннях вызначце і назавіце іх часткі.

Школа, школьны, прышкольны, школьнік□.

?! Як называюцца словы з блізкім значэннем і аднолькавым коранем? Спішыце словы. Абазначце іх часткі.

*Успомніце!*
Існуюць словы з нулявым канчаткам: *дом, ноч, Беларусь*.

**194.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце подпісы пад імі.



*Грыб*



*Грыбное месца*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



*Грыбок*



*Грыбнік*

?! Якая тэма аб’ядноўвае ўсе малюнкі?
Ці блізкія па значэнні словы *грыб, грыбное, грыбок, грыбнік*?
Запішыце гэтыя словы. Абазначце іх часткі.

*Успомніце!*
У слове вылучаюць наступныя часткі: **корань, прыстаўку, суфікс, канчатак**.
Словы, якія маюць блізкае значэнне і аднолькавы корань, называюцца **роднаснымі** ці **аднакаранёвымі**: *лес, лясны, пералесак, ляснік, пралеска*. **Корань** — агульная частка роднасных слоў.

**195.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў ім роднасныя словы.



**Дуб і дубок**

Прабіўся на ўзлеску маленькі дубок,
магутнага дуба дзябёлы сынок.
Галіны лістамі ў блакіце шумяць.
Такім, як дуб-бацька, дубок хоча стаць.

*(Іван Муравейка)*

**Дзябёлы** — моцны, тоўсты.

?! Якія яшчэ словы роднасныя слову *дуб*?
Запішыце гэты рад роднасных слоў. Абазначце ў кожным слове яго часткі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**196.** Прачытайце вершаванае заданне. Адкажыце на пытанні верша.

Садоўнік расаду вясной рыхтаваў,
старанна пасадкі кустоў аглядаў.
Як хараша сад будзе хутка цвісці!
Табе ж словы-родзічы трэба знайсці.
Знайшоў? Дык слухай заданне ізноў:
Хто продак сярод гэтых роднасных слоў?

*(Таццяна Шылько)*

?! Выпішыце з верша роднасныя словы. Абазначце ў іх корань.

**197.** Прачытайце рады слоў. Ці ўсе словы кожнага рада з'яўляюцца роднаснымі?

Мяса, мясны, мясакамбінат, мястэчка.
Піла, пілаваць, пільны, пілаванне.

***мястэ́чка***

?! Ці падобныя па значэнні словы *мястэчка, пільны* да іншых слоў у радах? Запішыце роднасныя словы. Абазначце ў іх корань.

**198.** Прачытайце сказы. Знайдзіце тры словы з аднолькавымі каранямі.

Я мару хутчэй стаць дарослым.
Марское паветра карыснае для здароўя.
Нельга марна траціць свой час.

***ма́рна***

?! Ці з'яўляюцца роднаснымі словы *мару, марское, марна*? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
Да слова *марское* падбярыце роднасныя словы.

**199.** Прачытайце верш-забаўлянку.

**Бабіны госці**

— Ладачкі-ладкі!
Дзе былі? — У бабкі.
— Што пілі вы? — Малако.
— А што елі? — Ко-ко-ко.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Доўга ж вы сядзелі,
доўга пілі-елі.
— А мы не сядзелі —
цэлы дзень дурэлі.
Мы і заўтра пойдзем
да бабулі нашай —
абяцала бабка
бярозавай кашы.

*(Васіль Вітка)*

?! Ці ведаеце вы, што такое «бярозавая каша»?
Ці заўважылі вы, што гэты верш — дыялог?
Прачытайце яго па асобах.
Знайдзіце ў вершы словы, роднасныя слову *баба.* Назавіце ў іх корань.

**200.** Прачытайце пары слоў. Ці з’яўляюцца яны роднаснымі?

Стол — столь, сонца — сонны, вада — вадзіць.

?! Чаму словы кожнай пары не з’яўляюцца роднаснымі?
Да першых слоў кожнай пары падбярыце роднасныя. Запішыце тры групы роднасных слоў. Абазначце ў іх карані.

Узор. *Стол, столік, настольны, ... .*

## *Урок 6. Канчатак*

**201.** Прачытайце спалучэнні слоў. Са слоў якіх часцін мовы яны ўтвораны?

Цёплы дзень, цёплая восень, цёплае надвор’е, цёплыя шкарпэткі.

?! Чым адрозніваюцца прыметнікі ў кожным спалучэнні слоў?
Яны з’яўляюцца роднаснымі словамі ці гэта формы аднаго слова?
Запішыце спалучэнні слоў. Абазначце ў прыметніках корань і канчаткі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Успомніце!*
**Канчатак** — зменная частка слова. Ён служыць для сувязі слоў у сказе. З дапамогай канчатка ўтвараюцца не новыя словы, а формы гэтага ж слова: *сад, сада, у садзе, садам*.

**202.** Прачытайце спалучэнні слоў, дапаўняючы прыметнікі патрэбнымі канчаткамі. Пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў.

Бярозав.. гай, бярозав.. лісце, бярозав.. кара, бярозав.. дровы.

?! Запішыце спалучэнні слоў у сшытак, устаўляючы прапушчаныя канчаткі.
* Якія яшчэ часткі ёсць у словах *бярозавы, бярозавая, бярозавае, бярозавыя*?
Абазначце ўсе часткі ў гэтых словах.

**203.** Прачытайце і адгадайце загадку.



Цераз палі, цераз лугі
Спусціліся канцы дугі.

?! Запішыце назвы колераў вясёлкі.
Абазначце канчаткі.

Узор. *Чырвоны*, … .

**204.** Утварыце формы слоў *школа* і *юнак* з дапамогай прапанаваных канчаткаў.







?! Запішыце формы слоў.
Абазначце ў іх карані і канчаткі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**205.** Прачытайце часткі слоў. Складзіце з іх словы.

-бярэж-, -ы, -н-, пры-
па-, -а, -буд-, -ов-
-ы, -н-, кніж-
-пын-, -ак, пера-

Запішыце словы. Абазначце іх часткі.
У якім слове нулявы канчатак? Абазначце яго. З гэтым словам складзіце і запішыце сказ.

**206.** Прачытайце словы. Падзяліце іх на некалькі груп аднакаранёвых слоў.

Казка, зімовы, пяцёрка, рачны, пяць, расказваць, зазімак, рака, прырэчны, зімаваць, упяцярых, пераказ, казаць, пяцярня, зарэчны, зіма.

Запішыце словы па групах аднакаранёвых слоў.
Абазначце ў словах карані і канчаткі.

Праверце выкананне задання адно ў аднаго.

**207.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму?

Кожнаму **кусціку**, кожнаму **дрэву** — свая пашана і цана. **Бяроза** напоіць сокам, **рабіна** пачастуе чырвонымі ягадамі. Гэта добра. А найлепшая дабрата ў **ліпы**. **Ліпа** зацвіла — пчолам **мёду** дала. Ліпавы **мёд** — добрае лякарства ад прастуды. *(Антон Бялевіч)*

Знайдзіце ў тэксце два роднасныя словы. Які ў іх корань? З дапамогай чаго ўтварылася слова *ліпавы*?
Запішыце тэкст пад дыктоўку. Абазначце канчаткі ў выдзеленых словах.

Праверце дыктоўкі па кнізе адно ў аднаго.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**208.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць? Знайдзіце ў тэксце пачатак, асноўную частку і канцоўку.

На сярэдзіне возера плавалі гусі. Сому захацелася паласавацца гусяцінай. Ён высунуў галаву з вады.

Гусак убачыў яго і трывожна закрычаў. Маленькія гусяняткі кінуліся з падлётам да берага, а гусак — на сома. Сом разгубіўся.

Гусак дзеўбануў сома ў галаву і ў вока. Сом пляснуў хвастом па вадзе і нырнуў на дно возера. *(Паводле Алеся Пальчэўскага)*

Выпішыце з тэксту групу роднасных слоў. Абазначце ў іх корань, канчаткі.

Выпішыце таксама формы слова *сом*. Абазначце корань і канчаткі.

## *Урок 7. Прыстаўка*

**209.** Прачытайце словы ў абодвух слупках. Якой часткай яны адрозніваюцца?

| | |
|---|---|
| Несці | прыбегчы |
| казаць | аднесці |
| клеіць | падказаць |
| бегчы | прыклеіць |

Запішыце аднакаранёвыя словы парамі. Абазначце прыстаўкі ў тых словах, дзе яны ёсць.

*Успомніце!*
**Прыстаўка** — частка слова, якая стаіць перад коранем. Прыстаўка служыць для ўтварэння новых слоў і формаў слова: *вясёлы — невясёлы; весялейшы — найвесялейшы; гукалі — загукалі.*

**210.** Прачытайце словы. Ці ёсць у іх прыстаўкі?

Крыць, пісаць, крэсліць, рэзаць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! З дапамогай прыставак ***пера-, за-, на-*** утварыце новыя словы. Запішыце іх паводле ўзору.

Узор. *Крыць — пера͞крыць, за͞крыць, на͞крыць, ... .*

**211.** Прачытайце спалучэнні слоў. Дапоўніце першыя словы прыстаўкамі, якія падыходзяць па сэнсе.

..пісаць у сшытак, ..садзіць дрэва, ..апрануць сукенку, ..майстраваць шпакоўню, ..чысціць дыван, ..капаць бульбу.

?! Запішыце спалучэнні слоў. Абазначце прыстаўкі, што ўставілі.
* З адным са спалучэнняў складзіце сказ. Запішыце яго.

**212.** Прачытайце сказы. Устаўце замест кропак словы, якія падыходзяць па сэнсе.

І хлопец пачаў ... з усіх бакоў салдата.
Лена пачала ... да іх абліччаў.
... мае вочы і бачаць сапраўднае дзіва — світанне.

Словы для выбару: *глядзяць, разглядаць, прыглядацца.*

?! Запішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя словы.
У якіх з устаўленых вамі роднасных слоў ёсць прыстаўкі? Абазначце іх.

**213.** Прачытайце словы. Назавіце ў іх прыстаўкі. Звярніце ўвагу на іх правапіс.

Аб’езд, перадсвяточны, адступіць, пад’езд, падказаць.

?! Спішыце словы. Абазначце ў іх прыстаўкі. Падкрэсліце апостраф.

**214.** Прачытайце словы. Вызначце ў кожным слове прыстаўку. У якіх словах яна вымаўляецца асобна ад астатняга слова?

Раз..яднаць, пад..ехаць, з..есці, аб..ява, раз..юшаны, пад..ём.

?! Спішыце словы. Замест кропак стаўце апостраф.
Абазначце ў словах прыстаўкі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**215.** Прачытайце сказы. Назавіце ў выдзеленых словах прыстаўкі.

Бабуля Жэні **ўстае** вельмі рана, на **досвітку**. Яшчэ пеўні не **пракукарэкалі**, а яна ўжо ў печы **запаліла**. Шмат спраў у яе: ежы **наварыць**, жывёлу **дагледзець**, унукаў **накарміць**.

Запішыце тэкст па памяці. Праверце сябе па кнізе. Абазначце прыстаўкі ў выдзеленых словах.

***до́світак***

## *Урок 8. Суфікс*

**216.** Прачытайце рады роднасных слоў. Якой часткай яны адрозніваюцца?

Дом, домік, дамашні, дамавік.
Зіма, зімовы, зімка, зімачка.
Горад, гарадок, гарадскі.
Вёска, вясковы, вёсачка.

Назавіце карані ў гэтых групах слоў.
Якія канчаткі ў кожным слове? У якіх словах канчатак нулявы?
Назавіце суфіксы ў словах, дзе яны ёсць. Выпішыце гэтыя словы. Абазначце ў іх суфіксы.

*Успомніце!*
У беларускай мове літары ***о, э, ё*** пішуцца толькі пад націскам. Не пад націскам замест ***о, э*** пішацца ***а***. У першым складзе перад націскам ***е, ё*** пераходзяць у ***я***.

**217.** Прачытайце верш-лічылку. Адкажыце на пытанне, якое ўтрымліваецца ў ім. Абгрунтуйце свой адказ.

Раз-два-тры-чатыры-пяць,
выйшлі зранку працаваць
**лётчык**, повар, **машыніст**,
выхавальнік, трактарыст,
экскаватаршчык, пажарнік,
**будаўнік**, урач, настаўнік.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Я цябе хачу спытаць:
кім жа ты жадаеш стаць?

*(Таццяна Шылько)*

?! Ад якіх слоў утварыліся выдзеленыя словы?
Знайдзіце ў іх карані і суфіксы.
Выпішыце выдзеленыя словы. Абазначце ў іх суфіксы.

*Успомніце!*
**Суфікс** — частка слова, якая стаіць пасля кораня. Суфікс служыць для ўтварэння новых слоў і (радзей) формаў слова: *рыба — рыбка, рыбак; лавіць — лавіў, лавілі; чытаць — чытаў, чыталі.*

**218.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце прафесіі людзей, што адлюстраваны на іх.










?! Ад якіх слоў утварыліся словы — назвы прафесій? З дапамогай якіх суфіксаў?
Запішыце словы — назвы прафесій, прадстаўнікі якіх адлюстраваны на малюнках. Абазначце ў гэтых словах карані і суфіксы.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**219.** Папрацуйце ў парах. Спытайце адно ў аднаго аб прафесіях бацькоў. Запішыце адказы. Пасля спытайце адно ў аднаго, кім збіраецеся працаваць. Запішыце адказы.

**220.** Прачытайце назвы музычных інструментаў. Разгледзьце малюнкі, на якіх яны адлюстраваны.

Цымбалы, піяніна, флейта, гітара, баян.



?! Утварыце ад гэтых слоў назвы прафесій з дапамогай суфікса ***-іст-***. Запішыце словы парамі паводле ўзору.

Узор. *Цымбалы — цымбаліст, ...* .

**221.** Прачытайце дзеясловы. Утварыце іх формы з дапамогай прапанаваных суфіксаў іканчаткаў.







?! Запішыце словы, што атрымаліся. Абазначце ў іх карані і суфіксы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**222.** Прачытайце верш.



**Сняжок**

Закружыліся сняжынкі,
ну нібыта матылькі.
Надзя — жвавая дзяўчынка —
ловіць іх у дзве рукі.

А ў самой сняжок на вейках,
на плячах, на каўняры —
нібы гэта не Надзейка,
а снягурка на двары.

*(Іван Шуцько)*

?! Якія словы ў вершы роднасныя слову *снег*? З дапамогай якіх суфіксаў яны ўтварыліся?
Выпішыце гэтую групу роднасных слоў. Абазначце ў іх карані і суфіксы.

**223.** Прачытайце верш-забаўлянку.

**Мыюцца кацяняты**

Лапкай мяккай без вады
умываюцца каты.
Мыюць вушы і насы
і на спінцы валасы.
Так, як мамы,
так, як таты,
мыюцца і кацяняты.

*(Аўгіння Кавалюк)*

?! Якое слова ў вершы роднаснае слову *кот*?
З дапамогай чаго яно ўтварылася?
Які корань у словах *кот, каты, кацяняты*?
Якія літары ў корані змяніліся?
Слова *каты* роднаснае слову *кот* ці гэта форма слова? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**224.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім роднасныя словы.

Я вельмі люблю вечары, калі ўся сям'я збіраецца разам. Мама на вячэру гатуе дранікі. Я стаўлю посуд і клічу вячэраць. А пасля ўсе разам мы глядзім тэлеперадачу «Запрашаем на вячоркі».

*(Таццяна Шылько)*

***тэлеперада́ча***

?! Выпішыце з тэксту роднасныя словы. Абазначце ў іх корань. Якое слова ўтварылася з дапамогай суфікса?

Пастаўце ў гэтых словах націск.

Звярніце ўвагу на змяненне літар галосных гукаў у корані.

**225.** Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, што робяць вечарамі людзі.









?! Складзіце і запішыце да кожнага малюнка сказ.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**226.** Папрацуйце ў парах. Паразмаўляйце з суседам па парце на тэму «Што я звычайна раблю вечарам».

Спачатку адзін вучань задае пытанні, а другі адказвае, а пасля наадварот.

**227.** Прачытайце тэкст. Назавіце ў выдзеленых словах прапушчаныя суфіксы.

***узвы́шша***

Наша Беларусь багатая на лес. На поўначы рэспублікі растуць **ял..ы** лес, **дуб..а**. Ёсць тут і **сасн..ы** бор. Нямала лесу і ў цэнтральнай Беларусі, над Нёманам і Бярэзінай, на **Ашмян..ім** і **Магілёў..ім** узвышшах. А на поўдні — больш чыстага дубняку.

*(Паводле Пятра Рунца)*

?! Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя суфіксы. Абазначце іх.

## Праверце сябе

Выберыце правільны варыянт адказу.

1. Словы з блізкім значэннем, але розныя па гучанні — гэта...

а) сінонімы;

б) антонімы;

в) роднасныя.

2. Словы з процілеглым значэннем — гэта...

а) сінонімы;

б) антонімы;

в) роднасныя словы.

3. Словы з блізкім значэннем і аднолькавым коранем — гэта...

а) сінонімы;

б) антонімы;

в) роднасныя словы.

4. Прыстаўка — гэта...

а) агульная частка роднасных слоў;

б) частка слова, якая стаіць перад коранем і служыць для ўтварэння новых слоў і формаў слова;

в) частка слова, якая стаіць пасля кораня і служыць для ўтварэння новых слоў і формаў слова;

г) зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Корань — гэта...

а) агульная частка роднасных слоў;

б) частка слова, якая стаіць перад коранем і служыць для ўтварэння новых слоў і формаў слова;

в) частка слова, якая стаіць пасля кораня і служыць для ўтварэння новых слоў і формаў слова;

г) зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе.

6. Суфікс — гэта...

а) агульная частка роднасных слоў;

б) частка слова, якая стаіць перад коранем і служыць для ўтварэння новых слоў і формаў слова;

в) частка слова, якая стаіць пасля кораня і служыць для ўтварэння новых слоў і формаў слова;

г) зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе.

7. Канчатак — гэта...

а) агульная частка роднасных слоў;

б) частка слова, якая стаіць перад коранем і служыць для ўтварэння новых слоў і формаў слова;

в) частка слова, якая стаіць пасля кораня і служыць для ўтварэння новых слоў і формаў слова;

г) зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе.

# ЧАСЦІНЫ МОВЫ

## *Урок 1. Паняцце пра часціны мовы*

**228.** Прачытайце словы. Да якой часціны мовы належыць кожнае з іх?

Апельсін, новы, шафа, багаты, замерзнуць, высахнуць, абед, жалеза, чакаць, невядомы, з, магутны, аб, шклянка, на.

?! Якія словы адказваюць на пытанне *што*?
Якія словы адказваюць на пытанне *які*?
Якія — на пытанні *што рабіць? што зрабіць?*
Да якіх слоў нельга падабраць пытанне?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Успомніце!*
У мове вылучаюцца групы слоў, якія называюцца **часцінамі мовы**. Часціны мовы — гэта назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, прыназоўнік і іншыя.

**229.** Прачытайце словы. Назавіце, да якіх часцін мовы яны належаць. Як называюцца гэтыя часціны мовы ў рускай мове?

Белізна, мыць, маляванне, значэнне, абазначаць, белы, значны, бяліць, маляваць, мыла, маляўнічы, мыльны.

?! Запішыце спачатку назоўнікі, пасля — прыметнікі і дзеясловы. Пастаўце да іх пытанні.

Узор. *Назоўнікі: (што?) значэнне, ... .*
*Прыметнікі: (якi?) значны, ... .*
*Дзеясловы: (што рабіць?) абазначаць, ... .*

**230.** Прачытайце тэкст. Як называецца наша Радзіма?

Радзіма — гэта тая зямля, на якой ты нарадзіўся. Там нарадзіліся і твой дзед, і твой бацька, і ўсе мы.

Радзіма — гэта твой родны горад ці сяло, вуліца, дзе стаіць твой дом ці твая хата. Гэта твая школа і твой клас. *(Паводле Георгія Пачапцова)*

?! Знайдзіце ў тэксце словы, якія належаць да вядомых вам часцін мовы. Пастаўце да іх пытанні.
Якой часцінай мовы з'яўляецца слова ***на***?
Спішыце тэкст. Падкрэсліце назоўнікі адной лініяй, дзеясловы — дзвюма, прыметнікі — хвалістай лініяй, прыназоўнік — пунктірам.

**231.** Прачытайце тэкст. Якая яго тэма? Які загаловак можна даць гэтаму тэксту?

Некалі на Свіслачы **славуты асілак**, якога звалі **Менеск, пабудаваў вялікі каменны млын**. У яго млыне **мука малолася** не з жыта, а з камення. Апоўначы Менеск **ездзіў** па ваколіцах і набіраў

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

дружыну з дужых і смелых людзей. З іх **утварыўся** цэлы **народ** і **пасяліўся** побач з млынам. Тут **быў** пабудаваны **горад** і названы ў імя волата Менск. Цяпер **назва** горада — **Мінск.** *(Паводле Уладзіміра Ліпскага)*

**Асі́лак (во́лат)** — чалавек незвычайнай сілы, мужнасці.
**Млын** — будынак з прыладамі для размолу зерня.
**Дружы́на** — узброены атрад пры князю ў Старажытнай Русі.

Пастаўце пытанні да выдзеленых слоў. Скажыце, да якіх часцін мовы яны належаць.
Знайдзіце ў тэксце прыназоўнікі.

**232.** Папрацуйце ў парах. Адзін задае пытанні, другі адказвае. Пасля памяняйцеся ролямі. Адказвайце поўнымі сказамі.
Як называецца краіна, дзе мы жывём?
У якім горадзе (вёсцы) ты жывеш?
У якой частцы Беларусі знаходзіцца твой горад ці вёска?
Якія асаблівасці прыроды ёсць у тваім родным краі?
Як ты ставішся да сваёй радзімы?

Якія назоўнікі вы выкарыстоўвалі ў сваіх адказах? Якія прыметнікі? Якія дзеясловы?

**233.** Прачытайце верш. Якія пачуцці выказаны ў ім?

**Беларусачка**

Твар румяненькі,
белая хустачка.
Я ўжо ведаю,
я — **беларусачка!**
**І хачу**
так, як **тата** і **мама,**
**родны край** свой **любіць**
я таксама.

*(Алесь Бадак)*




Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Якія з выдзеленых слоў — назоўнікі, якія — прыметнікі, якія — дзеясловы?

Якія назоўнікі адказваюць на пытанне хто?, а якія — на пытанне што? Чаму?

Запішыце словы па групах: спачатку назоўнікі, пасля прыметнікі, затым дзеясловы.

# НАЗОЎНІК

## *Урокі 2—3. Лік назоўнікаў*

**234.** Прачытайце словы. Вызначце, што яны абазначаюць. На якія пытанні адказваюць?

Сястра, шафёр, мароз, дождж, сабака, спаборніцтва, дыван, пыласос, цеплыня, халат.

?! Да якой часціны мовы належаць гэтыя словы?

Запішыце словы. Пасля кожнага з іх у дужках пастаўце пытанне, на якое адказвае слова.

> *Успомніце!*
> **Назоўнік** — часціна мовы, якая абазначае прадмет і адказвае на пытанні **хто? што?**: *вецер, стол, дзіця, ліса.*

**235.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх.

Хто лечыць людзей? Што расце ў лесе? Хто вучыць дзяцей у школе? Хто піша кнігу? Што дораць людзям на свята? Што стаіць у кватэры на Новы год?

?! Запішыце назоўнікі — адказы на пытанні ў два слупкі. У першы — тыя, якія адказваюць на пытанне хто?. У другі — тыя, што адказваюць на пытанне што?

У якім слупку назоўнікі абазначаюць жывых істот, а ў якім — нежывыя прадметы?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**236.** Прачытайце жартоўныя загадкі-пытанні. Знайдзіце сярод прапанаваных малюнкаў адгадкі.

Што можна бачыць з заплюшчанымі вачамі?
Што без вады плавае?
Што без ног ідзе?
Што гарыць без полымя?









?! Запішыце словы-адгадкі. Пастаўце ў дужках пасля кожнага слова пытанне, на якое яно адказвае.

**237.** Прачытайце тэкст. Ці лавілі вы калі-небудзь рыбу?

## Рыбацкі пачастунак

Каля кастра сядзелі **рыбакі**. На патэльні смажылася **бульба**. Далёка разносіўся яе **пах**. Раптам у траве нехта зашумеў, затохкаў, зафыркаў. Рыбакі пачулі гэтыя незвычайныя **гукі**. Усе сцішыліся. Неўзабаве з травы высунуўся чорны мокры **нос**. Ён быў падобны да свінога **пятачка**. Звярок аказаўся маленькім **барсучком**. Ён вельмі хацеў есці. Пах свежай бульбы не даваў яму спакою. Рыбакі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

пашкадавалі галоднага звярка і кінулі яму бульбіну. З’еў барсучок яе, чмыхнуў носам, нібы падзякаваў рыбакам за **пачастунак.**

*(Паводле Ірыны Гімпель)*

**Патэ́льня** — скаварада.

***пачасту́нак***

?! Пастаўце пытанні х т о? або ш т о? да выдзеленых назоўнікаў. Растлумачце, у якіх выпадках патрэбна ставіць пытанне х т о?, а ў якіх — пытанне ш т о?

Якія назоўнікі ўжыты ў адзіночным ліку, а якія — у множным?

Папрацуйце ў парах. Прадыктуйце першыя два сказы наступным чынам: адзін вучань чытае сказ, другі запісвае. На другім сказе памяняйцеся ролямі.

Праверце запісы адно ў аднаго.

Назавіце прыназоўнікі ў гэтых сказах.



**238.** Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні.

Ці вудзілі вы калі-небудзь рыбу?
Дзе гэта адбывалася?
Як называлася рака ці возера, дзе вы вудзілі рыбу?
Якія прылады патрэбны для лоўлі рыбы?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ці шмат вы налавілі?
Ці адбывалася што-небудзь цікавае, калі вы вудзілі рыбу?

?! З дапамогай пытанняў і малюнка раскажыце пра які-небудзь выпадак з рыбацкага жыцця.

**239.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў ім назоўнікі. У якім ліку ўсе яны ўжыты?

Які сёлета шчаслівы
і незвычайны выпаў год —
багатыя і ўрадлівыя
і сад, і лес, і агарод!

*(Паводле Пятра Глебкі)*

?! Спішыце верш. Запішыце пытанне, на якое адказваюць назоўнікі.

**240.** Прачытайце пары назоўнікаў. На якія пытанні яны адказваюць?

Горад — гарады, вуліца — вуліцы, свята — святы, кветка — кветкі, літара — літары, дзіця — дзеці, народ — народы, дождж — дажджы, сабака — сабакі.

?! Чым адрозніваюцца назоўнікі ў кожнай пары?
У якім ліку ўжыты ўсе першыя словы кожнай пары? У якім — другія словы кожнай пары?
Выпішыце ў першы радок усе назоўнікі адзіночнага ліку, а ў другі — назоўнікі множнага ліку.

> *Успомніце!*
> Большасць назоўнікаў маюць два лікі — **адзіночны (адз. л.)** і **множны (мн. л.)**: *вечар — вечары, дзяўчынка — дзяўчынкі.*

**241.** Прачытайце словы. Вызначце, у якім ліку ўжыта кожнае з іх.

Ліст, дамы, вецер, календары, месяц, тыдні, сцяна, часопіс, газеты, партфелі.

?! Змяніце лік кожнага назоўніка. Запішыце пары слоў паводле ўзору.

Узор. *Ліст (адз. л.) — лісты (мн. л.), ... .*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**242.** Прачытайце верш. Якая асноўная думка гэтага верша?

**Вобразы** мілыя роднага краю,
**смутак** і **радасць** мая!
Што маё **сэрца** да вас парывае?
Чым так прыкованы я
к вам, мае **ўзгорачкі** роднага поля,
**рэчкі, курганы, лясы,**
поўныя смутку і жальбы нядолі,
поўныя сумнай красы?

*(Якуб Колас)*

?! Вызначце лік кожнага з выдзеленых назоўнікаў. Паспрабуйце яго змяніць. Ці можна выкарыстаць назоўнік *смутак* у множным ліку?
Выпішыце выдзеленыя словы. Абазначце іх лік (адзіночны ці множны).

**243.** Прачытайце наступныя словы. У якім ліку ўжыты словы ў першым радку? У якім — у другім?

Сумленне, насенне, зерне, цукар, масла, чай.
Дзверы, акуляры, нажніцы, канікулы, суткі, духí, кансервы.

?! Паспрабуйце змяніць лік гэтых слоў. Ці магчыма гэта?

> *Запомніце!*
> Ёсць назоўнікі, якія не могуць змяняцца па ліках.
> Такія назоўнікі маюць або толькі адзіночны, або толькі множны лік:
> *Мінск, барацьба, шахматы, Ждановічы.*

**244.** Прачытайце словы. Паспрабуйце змяніць іх лік.

Прыволле, лес, сонца, прыцемкі, жыта, цэмент, Баранавічы, вочы, неба, крэсла, вячоркі.

?! Запішыце назоўнікі ў тры слупкі. У першы — тыя, што змяняюцца па ліках. У другі — тыя, што маюць толькі адзіночны лік. У трэці — тыя, што маюць толькі множны лік.
Складзіце тры сказы, каб у кожным з іх выкарыстоўвалася адно са слоў кожнага слупка.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**245.** Разгледзьце картасхему тэрыторыі Беларусі. Прачытайце назвы гарадоў. Якія з назваў маюць форму адзіночнага ліку, а якія — множнага?




?! Запішыце спачатку тыя назвы гарадоў Беларусі, якія маюць адзіночны лік, а потым тыя, якія маюць множны лік.

Вызначце на картасхеме месца, дзе знаходзіцца ваш родны горад ці вёска, ваша школа.

*Запомніце!*

Назвы гарадоў, вёсак, як і іншыя ўласныя назвы, пішуцца з вялікай літары: *Мінск, Паставы, Нёман*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**246.** Запішыце пяць слоў — геаграфічных назваў (назваў гарадоў, вёсак, рэк, гор і іншага), якія ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку. Пасля — пяць геаграфічных назваў, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку. Кожную ўласную назву пішыце з вялікай літары.

## *Урокі 4—5. Род назоўнікаў*

**247.** Прачытайце словы ў трох слупках. Які лік маюць усе гэтыя словы?

| | | |
|---|---|---|
| Пчаляр | вежа | акно |
| стог | ліпа | галлё |
| перапалох | морква | полымя |

Да назоўнікаў якога слупка можна паставіць словы ё н, м о й; я н а, м а я; я н о, м а ё?

Якога роду назоўнікі, што запісаны ў першым слупку, якога — у другім, якога — у трэцім?

*Успомніце!*

Кожны назоўнік у форме адзіночнага ліку належыць да аднаго з трох родаў: мужчынскага *(родны край)*, жаночага *(родная краіна)*, ніякага *(роднае поле)*.

**248.** Прачытайце тэкст.

### Родныя прасторы

Над зямлёй узыходзіць **сонца**. Загараецца **неба** адценнямі чырвані і золата. Пачынаецца **раніца** новага дня.

У ясным небе плывуць **самалёты**. Красуе і хвалюецца на лёгкім ранішнім ветрыку **жыта**. Шумяць старыя **пушчы**. Гамоняць бярозавыя **гаі** і **пералескі**.

Усюды віднеюцца **рыштаванні**. Растуць **заводы** і **фабрыкі**. На палях гудуць **трактары** і **камбайны**. Па дарогах імчацца **аўтамабілі**. БліШчаць на сонцы шыферныя і бляшаныя **дахі**. Увечары **гарады** і **сёлы** свецяцца электрычным бляскам.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Над роднымі прасторамі кіпіць **жыццё.** *(Паводле Сяргея Грахоўскага)*

**Рыштава́нне** — часовае збудаванне з дошак або металічных трубак, якое ўстанаўліваецца ўздоўж сцен для будаўнічых або рамонтных работ.

Вызначце лік кожнага з выдзеленых назоўнікаў.
Змяніце назоўнікі, каб яны прынялі форму адзіночнага ліку.
Запішыце ў слупок усе назоўнікі ў адзіночным ліку.
З дапамогай слоў ё н, м о й; я н а, м а я; я н о, м а ё вызначце, якога роду кожны з назоўнікаў: мужчынскага, жаночага або ніякага.
Пазначце род назоўнікаў побач з кожным са слоў: мужчынскі — *м. р.*, жаночы — *ж. р.*, ніякі — *н. р.*

**249.** Паспаборнічайце. Разгледзьце ўсе прадметы навокал.
Запішыце іх назвы ў тры слупкі ў залежнасці ад роду.
Праверце запісы адно ў аднаго.
Пераможа той, хто запіша больш назваў і не памыліцца з вызначэннем роду назоўніка.

**250*.** Прачытайце верш. Якія пачуцці ў дачыненні да роднай мовы выказвае ў ім аўтар?

Багата, родная ты мова,
цябе стварыў і ўзнёс народ.
А вобразы якія ў словах,
а параўнанняў што за ўзлёт!
Вятры — вандроўнікі, вядома,
барозны — гуслі на раллі,
а сосны — рыцары ў шаломах,
крыніцы — вочы ўсёй зямлі,
а хвалі ўвосень — гэта зрэб'е.
Як срэбра, ручаёк цячэ.
А зоры, як цвікі на небе...
І шмат яшчэ, і шмат яшчэ!

*(Пятрусь Броўка)*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Вандро́ўнік** — чалавек, які вандруе, падарожнічае.
**Гу́слі** — шматструнны музычны інструмент славянскіх народаў.
**Шало́м** — шлем, старажытны металічны воінскі галаўны ўбор, які ахоўваў галаву ад удараў, стрэл.
**Зрэ́б'е** — грубая кудзеля (валакно), што аддзяляецца пры трапанні лёну, пянькі. Таксама так называюць палатно з такой кудзелі і адзенне з такога палатна.

Знайдзіце ў вершы назоўнікі, што адказваюць на пытанні х т о? або ш т о? Вызначце лік кожнага назоўніка. Пастаўце назоўнікі, калі гэта магчыма, у адзіночным ліку.
Запішыце назоўнікі ў адзіночным ліку. Вызначце род кожнага з іх. Абазначце род адпаведнымі літарамі: *м. р., ж. р., н. р.*

**251.** Прачытайце народную заклічку. Успомніце, да каго звяртаюцца з заклічкамі. Чаму?

**Бусел**, бусел, **калода**,
што заўтра будзе:
**дождж** ці **пагода**?
Калі **сонейка** — кружыся,
калі **дождж ык**, то садзіся.

Якога роду выдзеленыя назоўнікі?
Вывучыце заклічку на памяць. Запішыце яе па памяці.
Над выдзеленымі назоўнікамі пазначце іх род: *ж. р.* — жаночы род, *м. р.* — мужчынскі род, *н. р.* — ніякі род.

**252.** Прачытайце словы. Ці зразумела, якога яны роду? Вызначце іх род з дапамогай прыметнікаў, што запісаны ў дужках.

(Ружовы) фламінга, (вялікі) шымпанзэ, (новае) атэлье, (прасторнае) фае, (прыгожая) мадам, (добрая) пані, (прадстаўнічае) журы.

***фламі́нга***

***фае́***

***журы́***

Спішыце спалучэнні слоў, апускаючы дужкі. Абазначце род назоўнікаў.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**253.** Прачытайце назоўнікі. Падбярыце да кожнага з іх прыметнік.

Паветра, цягнік, плюс, насенне, пісьменнік, букет, кветка, сям'я.

?! Запішыце спалучэнні слоў. Абазначце род назоўнікаў.

**254.** Прачытайце прыметнікі ў дужках і назоўнікі. Ці спалучаюцца ў родзе прыметнікі з назоўнікамі?

(Маляўнічы) пано, (тэлевізійны) інтэрв'ю, (рамонтны) дэпо, (фруктовы) пюрэ, (рыбны) філе, (водны) пола, (свабодны) таксі.

?! Вызначце род кожнага назоўніка.
Пастаўце прыметнікі ў патрэбным родзе.
Запішыце атрыманыя спалучэнні слоў.

***інтэрв'ю́***

***дэпо́***

**255.** Прачытайце спалучэнні слоў па-беларуску і па-руску. Па форме прыметнікаў вызначце род кожнага з назоўнікаў у рускай і беларускай мовах.

П а - б е л а р у с к у: злы сабака, высокі насып, размашысты подпіс, моцны боль.

П а - р у с к у: злая собака, высокая насыпь, размашистая подпись, сильная боль.

?! Складзіце сказ, у якім выкарыстайце адно са словазлучэнняў на беларускай мове. Запішыце яго.

**256.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце род назоўнікаў.

Салдацкі шынель, шырокі стэп, балючы мазоль, баявы медаль, афрыканская жырафа, сярдзітая гусь, высокая таполя.

?! Пагуляйце ў перакладчыкаў: паспрабуйце перакласці гэтыя словы на рускую мову.
Які род маюць гэтыя назоўнікі ў рускай мове?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**257.** Прачытайце словы рускай мовы. Перакладзіце іх на беларускую мову. Начарціце і разгадайце ў сшытках крыжаванку.

1. Лук
2. Простор
3. Пар




Якое слова атрымалася па вертыкалі ў выдзеленых клетачках?
Запішыце словы праз злучок па-руску і па-беларуску. Вызначце род кожнага назоўніка ў рускай і беларускай мовах.

**258.** Прачытайце тэкст. Якую назву яму можна даць? З якімі пачуццямі аўтар расказвае пра сваю Радзіму?

Якая яна, мая **зямля**? Гэта залатыя **палі** збажыны з сінімі вочкамі васількоў, светлыя ад бяроз **гаі**, што аглухлі ад птушынага звону... І **пушчы**, падобныя на гатычныя **храмы**, пушчы, дзе **алені** горда нясуць свае **кароны**. Гэта бясконцыя **жылы** рэк, у якіх плешчуцца **бабры** і **рыба** на захадзе сонца. Гэта амаль адзінаццаць тысяч азёр, чыстых, як **усмешка** дзіцяці. *(Паводле Уладзіміра Караткевіча)*

Назавіце лік кожнага з выдзеленых назоўнікаў.
Запішыце ўсе гэтыя назоўнікі ў адзіночным ліку. Вызначце род кожнага назоўніка і абазначце яго літарамі *м. р., ж. р., н. р.*
* Ці ёсць у тэксце яшчэ назоўнікі акрамя выдзеленых? На якія пытанні яны адказваюць? У якім ліку ўжыты?

## *Урокі 6—10. Скланенне назоўнікаў*

**259.** Прачытайце сказы. Звярніце ўвагу на назоўнік *зіма.*

Надышла халодная **зіма.**
Людзі добра падрыхтаваліся **да зімы.**
Дзеці радуюцца **зіме.**
Яны сустракаюць **зіму** з лыжамі і канькамі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Людзі любуюцца **зімой.**

Вучань напісаў **аб зіме** сачыненне.

?! Колькі сказаў пра зіму вы прачыталі?
Паспрабуйце з дапамогай стрэлачак паставіць пытанні, на якія адказвае слова *зіма* ў кожным сказе.

**260.** Прачытайце сказы пра зорку. Колькі сказаў вы прачыталі? На якое пытанне адказвае слова *зорка* ў кожным сказе?

На ясным вячэрнім небе ўзышла (што?) зорка.
Раптам хмары заслалі неба, і (чаго?) зоркі не стала.
Сумна (чаму?) зорцы.
Глянуў на (што?) зорку месячык.
Ён залюбаваўся (чым?) зоркай.
А калі яна нечакана згарэла і ўпала, месячык доўга сумаваў (па чым?) па зорцы. *(Паводле Мікалая Яленскага)*

?! Выпішыце са сказаў формы слова *зорка* разам з пытаннямі.

**261.** Прачытайце сказы. На якое пытанне адказвае слова *мядзведзь* у кожным сказе? Мядзведзь — гэта жывая істота ці не?

***мядзве́дзь***

(Хто?) Мядзведзь — вельмі дужы звер.
Усе лясныя жыхары баяцца (каго?) мядзведзя.
Зімой (каму?) мядзведзю добра спіцца ў бярлозе.
(Кім?) Мядзведзем пужаюць малых дзяцей, калі яны сваволяць.
(Аб кім?) Аб мядзведзі складзена шмат народных казак.

?! Выпішыце формы слова *мядзведзь* з пытаннямі. Колькі формаў вы выпісалі?

**262.** Прачытайце спалучэнні слоў і пытанні, на якія адказваюць назоўнікі ў кожным са спалучэнняў.

Ёсць (хто? што?) брат, вёска;
няма (каго? чаго?) брата, вёскі;



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

даць (каму? чаму?) брату, вёсцы;
бачу (каго? што?) брата, вёску;
задаволены (кім? чым?) братам, вёскай;
гаварыць (аб кім? аб чым?) аб браце, аб вёсцы.

?! Колькі формаў назоўнікаў тут вылучана? Колькі пар пытанняў? Якой часткай слова адрозніваюцца формы назоўніка? Запішыце гэтыя формы назоўніка.

*Запомніце!*
Назоўнік мяняе свае формы ў розных склонах. Гэта змяненне назоўнікаў у адзіночным і множным ліках называецца **скланеннем**.
Назоўнік у беларускай мове, як і ў рускай, мае шэсць склонаў.
Кожны склон мае свае пытанні.
Назоўны — **хто? што?**
Родны — **каго? чаго?**
Давальны — **каму? чаму?**
Вінавальны — **каго? што?**
Творны — **кім? чым?**
Месны — **аб кім? аб чым?**
Пры змяненні формаў назоўніка мяняецца канчатак.

**263.** Прачытайце словы. У якім склоне яны стаяць? Змяніце з дапамогай пытанняў гэтыя словы.

Назоўны склон (хто? што?): *ліса, возера, мыш.*
Родны склон (каго? чаго?) ... .
Давальны склон (каму? чаму?) ... .
Вінавальны склон (каго? што?) ... .
Творны склон (кім? чым?) ... .
Месны склон (аб кім? аб чым?) ... .

?! Запішыце назвы склонаў, пытанні і словы, якія вы змянялі. Як называюцца склоны па-руску? Пералічыце іх па-руску.

**264.** Праскланяйце назоўнікі *вада, вечар*. Складзіце і запішыце 2—3 сказы з гэтымі словамі, каб яны былі ўжыты ў розных склонах.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**265.** Закончыце сказы з дапамогай малюнкаў і склонавых пытанняў.

Ляціць (ш т о?)  .

(Х т о?)  ідзе.

Вучань стаіць каля (ч а г о?)  .

Бабуля расказвае казку (к а м у?)  .

Хлопчык робіць (ш т о?)  .

Бацька пілуе (ч ы м?)  .

Кветкі стаяць (у ч ы м?)  .

?! Запішыце сказы, што атрымаліся.
Вызначце склоны назоўнікаў, якімі вы дапаўнялі сказы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**266.** Прачытайце верш. З дапамогай пытанняў вызначце склоны назоўніка *вожык*.

**Каця**

У Каці добры (хто?) вожык,
а з ёй гуляць не хоча.
У (каго?) вожыка сто ножак,
так ноччу ён тупоча.
І Каця (каму?) вожыку крычыць,
што хоча ножкі палічыць.

*(Пімен Панчанка)*

?! Чаму ў вершы гаворыцца, што ў вожыка сто ножак? Ці так гэта насамрэч?
Выпішыце з верша формы назоўніка *вожык*.
Якія склоны гэтага слова ў вершы не выкарыстаны? Запішыце і іх таксама разам з пытаннямі, на якія яны адказваюць.

**267.** Прачытайце, адкуль пайшлі назвы склонаў і што яны абазначаюць.

Назоўны склон абазначае назву імені, прадмета. Яго пытанні — хто? што?

Родны склон абазначае нешта блізкае. Гэта другі склон пасля нараджэння слова, самы «блізкі» і «родны». Яго пытанні — каго? чаго?

Давальны склон атрымаў сваю назву па сувязі са словам *даваць*. Яго пытанні — каму? чаму?

Назва вінавальнага склону ўтворана ад слова «віна». Можна вінаваціць каго ці што. Таму і пытанні вінавальнага склону — каго? што?

Творны склон паказвае, з дапамогай каго ці чаго адбываецца, «творыцца» дзеянне. Яго пытанні — кім? чым?

Месны склон, магчыма, атрымаў такую назву, бо можа абазначаць месца дзеяння. Ён мае пытанні аб кім? аб чым? *(Паводле Мікалая Яленскага)*

?! Прачытайце тэкст яшчэ раз.
Паспрабуйце расказаць сваімі словамі, што абазначае назва кожнага склону.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**268.** Разгледзьце табліцу. У ёй пададзены скарочаныя назвы склонаў, склонавыя пытанні, дапаможныя словы і прыклады змянення назоўнікаў па склонах.

| Склон | Пытанні | Дапаможнае слова | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Н. | хто? што? | ёсць | стол, дзяўчынка, ноч |
| Р. | каго? чаго? | няма | стала, дзяўчынкі, ночы |
| Д. | каму? чаму? | даць | сталу, дзяўчынцы, ночы |
| В. | каго? што? | бачу | стол, дзяўчынку, ноч |
| Т. | кім? чым? | задаволены | сталом, дзяўчынкай, ноччу |
| М. | аб кім? аб чым? | гаварыць | аб стале, аб дзяўчынцы, аб ночы |

?! Начарціце такую ж табліцу ў сшытках. Запоўніце яе.

**269.** Разгледзьце табліцу. Якія пытанні і словы прапушчаны ў ёй?

| Склон | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| Назоўны | ... хто? | кветка, сын |
| Родны | чаго? ... | ..., сына |
| ... | чаму? ... | кветцы, ... |
| Вінавальны | ... каго? | кветку, ... |
| ... | чым? кім? | ..., сынам |
| Месны | ... аб кім? | аб кветцы, ... |

?! Начарціце ў сшытках такую ж табліцу. Запоўніце яе цалкам.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**270.** Прачытайце верш. Колькі сказаў у гэтым вершы?

Пахне свежай хваёвай **смалой**,
**дубняком** маладым і **асінай**.
Як абвесці навокал **рукой** —
**небасхіл** да **празрыстасці** сіні.

*(Анатоль Астрэйка)*

***небасхíл***

?! Вызначце род кожнага назоўніка ў вершы.
У якіх склонах ужыты назоўнікі? На якія пытанні яны адказваюць?
Спішыце верш. Пасля кожнага назоўніка ў дужках напішыце склон, у якім ён ужыты.

**271.** Прачытайце незакончаныя сказы. Дапоўніце іх формамі слова *медуніца*.

**Медуніца**

У кветніку расцвіла прыгожая ... . Кружылі (н а д ч ы м?) **над** ... пчолы. Яны падляталі (д а ч а г о?) **да** ... і бралі салодкі нектар. Яны расказвалі (а б ч ы м?) **аб** пахучай ... усім насякомым. Усе хацелі пазнаёміцца (з ч ы м?) **з** ... . (Ш т о?) ... усе вельмі палюбілі.



?! Па пытаннях вызначце склоны назоўніка *медуніца*.
Якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя ў тэксце словы?
Спішыце сказы, дапаўняючы іх патрэбнымі формамі слова *медуніца*.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**272.** Прачытайце спалучэнні слоў. Па пытаннях вызначце склон назоўніка ў кожным спалучэнні слоў.

Даехалі (д а  ч а г о?) да маста;
сядзіць (н а  ч ы м?) на дрэве;
бачыць (к а г о?) сябра;
пазнаёміцца (з  к і м?) з дзяўчынкай;
быць удзячным (к а м у?) настаўніку.

?! Спішыце спалучэнні слоў. Абазначце склон назоўнікаў літарамі: Н., Р., Д., В., Т., М.
Складзіце сказ з адным са спалучэнняў.

**273.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх.

Што грэе зямлю?
Чаго не хапае ў супе?
Каму цяжка зімой?
Каго вітаюць дзеці ў школе?
Чым пішуць вучні ў сшытку?
Дзе жывуць ласі?

?! Вызначце склон тых назоўнікаў, якія вы выкарысталі пры адказах.
Запішыце адказы на пытанні. Абазначце склоны назоўнікаў, якія з'яўляюцца адказамі на пытанні.

**274.** Прачытайце незакончаныя сказы. Дапоўніце іх адным словам-назоўнікам. Вызначце склон гэтага назоўніка.

На ўроку ў вучня не было (ч а г о?) … .
Міша падараваў кнігу (к а м у?) … .
Навука спатрэбіцца (у  ч ы м?) … .
У гасцях Зоська сустрэла (к а г о?) … .

С л о в ы  д л я  в ы б а р у: *сшытак, сястра, жыццё, сяброўка.*

?! Спішыце сказы, дапаўняючы іх па сэнсе словам у патрэбнай форме. Абазначце склон гэтага назоўніка.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**275.** Прачытайце жарт. Ці ведаеце вы драпежных птушак? Камар — гэта птушка?

— Дзеці, хто **назаве** драпежную птушку? — спытала выхавацелька.

Руку **падняла** Таня.

— Камар! Бо ён **смокча** чалавечую кроў.

Знайдзіце ў жарце ўсе назоўнікі.
Прачытайце з гэтага жарта словы, якія выдзелены.
Дапоўніце іх з дапамогай пытанняў назоўнікамі з жарта. Вызначце склоны назоўнікаў. Запішыце спалучэнні слоў, што атрымаліся.

Узор. *Назаве (каго?) ... .*
*Падняла (што?) ... .*
*Смокча (што?) ... .*

**276.** Прачытайце спалучэнні слоў. На якія пытанні адказваюць назоўнікі ў гэтых спалучэннях? У якіх спалучэннях выкарыстаны прыназоўнікі?

Падыходзіць (...) да хлопчыка, гаварыць (...) сябру, убачыць (...) бабулю, ганарыцца (...) бацькам, быць (...) пры бацьку.

Запішыце спалучэнні слоў. У дужках устаўце пытанні.
Абазначце склон назоўнікаў.

Узор. *Падыходзіць (да каго?) да хлопчыка — Р., ... .*

**277.** Прачытайце тэкст.

## Сінічка

Аднойчы прыляцела **сінічка** да **акна**. Сюды загнала яе **сцюжа**. Гаспадар пашкадаваў **птушку** і адчыніў **акно**. Сінічка паляцела ў **хату**. Яна згаладалася і пачала дзяўбці хлебныя **крошкі**. **Дзеці** палюбілі **птушку**. Яна пражыла ў **хаце** ўсю **зіму**. *(Паводле Канстанціна Ушынскага; пераклад з рускай мовы)*

Пастаўце пытанні да выдзеленых назоўнікаў.
Па пытаннях вызначце склон назоўнікаў.
Запішыце тэкст пад дыктоўку.

**дзяўбці́**

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**278.** Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні.



У якую пару года адбываецца дзеянне на малюнку?
Што робяць дзеці?
Навошта яны вешаюць кармушкі?
Чаму зімой трэба дапамагаць птушкам?

?! Запішыце адказ на другое пытанне.
Вызначце склоны назоўнікаў у гэтым сказе.

**279.** Прачытайце, як можна па паводзінах птушак зімой прадказаць змены ў надвор'і.

Снягір зімой спявае — на снег, завіруху і слату.
Сарока паблізу жытла лятае, пад страху лезе — будзе завіруха.
Варона пад крыло дзюбу хавае — да холаду.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Знайдзіце ўсе назоўнікі ў гэтых сказах. Вызначце іх склоны.

**280.** Ці ведаеце вы якія-небудзь прыметы, па якіх можна прадказаць надвор'е? Раскажыце іх, калі ведаеце.

Спытайцеся дома ў сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў, выхавальнікаў у школе, як можна даведацца, што надвор'е зменіцца.

Раскажыце пра тое, што вам паведамілі, у школе на наступным уроку.

Запішыце адзін сказ — народную прымету. Вызначце склоны ўжытых у ім назоўнікаў.

**281.** Прачытайце тэкст. Перакладзіце яго на рускую мову.

У лютым дзьмуць халодныя **вятры.** Стаіць пара́ **маразоў** і **завірух.** Спяць у **норах** і **дуплах** лясныя **жыхары.**

?! У якім ліку ўжыты выдзеленыя назоўнікі?
Вызначце іх склоны.

*Запомніце!*
Назоўнікі множнага ліку змяняюцца па такіх жа склонах і адказваюць на тыя ж пытанні, што ў адзіночным ліку.

**282.** Прачытайце тэкст. Ці бывалі вы ў заапарку? Спадабалася вам там або не? Чаму?

Своеасабліва рэагуюць (на што?) на змены надвор'я белыя (хто?) мядзведзі, якія ўтрымліваюцца (у чым?) у заапарках. За некалькі (чаго?) дзён да пахаладання яны перастаюць купацца ў басейне. А дні за тры (да чаго?) да пацяплення ахвотна лезуць у ваду і падоўгу купаюцца.

*(Паводле Аляксея Рошчына; пераклад з рускай мовы)*

?! Знайдзіце ў тэксце назоўнікі. Вызначце іх лік.
З дапамогай пытанняў вызначце склоны назоўнікаў, да якіх ставяцца пытанні.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**283.** Разгледзьце малюнак.



?! Складзіце па малюнку некалькі сказаў, у якіх ёсць назоўнікі множнага ліку. Запішыце гэтыя сказы на дошцы і ў сшытку. Абазначце склоны назоўнікаў множнага ліку.

**284.** Прачытайце сказы. Назоўнікі, што ў дужках, пастаўце ў патрэбным склоне.

Дубы стаялі пры ўездзе ў вёску. Пад (дубы) вясковыя хлапчукі адпачывалі ў цяньку. Птушкі прылятаалі пасядзець на (дубы). Вецер гушкаўся ў галінах (дубы). *(Паводле Барыса Сачанкі)*

?! Спішыце сказы, апускаючы дужкі. Абазначце склоны назоўніка *дубы*.

**285.** Прачытайце яшчэ адну прымету надвор'я.

(Х т о?) Вароны кружацца ў паветры, а потым садзяцца (н а ш т о?) на дахі і (ш т о?) вершаліны (ч а г о?) дрэў — будзе мароз.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Вызначце па пытаннях склоны назоўнікаў.
Спішыце сказ разам з пытаннямі. Абазначце склоны назоўнікаў множнага ліку.

## Праверце сябе

Выберыце правільны варыянт адказу.

1. Часціны мовы — гэта...

а) корань, канчатак, прыстаўка, суфікс;

б) дзейнік і выказнік;

в) назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, прыназоўнік і іншыя.

2. Назоўнік — гэта часціна мовы, якая...

а) абазначае дзеянне і адказвае на пытанні *што рабіць? што зрабіць?*;

б) абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні *які? якая? якое? якія?*;

в) абазначае назву прадмета і адказвае на пытанні *хто? што?*

3. Назоўнік мае лік...

а) адзіночны і множны;

б) мужчынскі, жаночы, ніякі;

в) назоўны, родны, давальны, вінавальны, творны, месны.

4. Назоўнік мае род...

а) адзіночны і множны;

б) мужчынскі, жаночы, ніякі;

в) назоўны, родны, давальны, вінавальны, творны, месны.

5. Назоўнік можа стаяць у склоне...

а) адзіночным і множным;

б) мужчынскім, жаночым, ніякім;

в) назоўным, родным, давальным, вінавальным, творным, месным.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПРЫМЕТНІК

## *Урокі 11—12. Дапасаванне прыметнікаў да назоўнікаў*

**286.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце назоўнікі.















?! З дапамогай малюнкаў падбярыце да кожнага назоўніка прыметнік, якія падыходзіць па сэнсе. На якія пытанні адказваюць прыметнікі? Што абазначае прыметнік?
Запішыце словазлучэнні, якія атрымаліся.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Успомніце!*
**Прыметнік** — гэта часціна мовы, якая абазначае прымету прадмета. Прыметнік можа адказваць на пытанні **які? якая? якое? якія?** У сказе ён звязаны па сэнсе з назоўнікам.

**287.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім прыметнікі.

*якое?*

Не вельмі **зайздроснае** зайцава жыццё ў лесе. **Лясны** звярок увесь час павінен быць напагатове.

Пачуе заяц **незнаёмы** гук, адчуе небяспеку — выручаюць ногі. **Пярэднія** ногі — **кароткія**, а **заднія** — амаль у тры разы **даўжэйшыя** за пярэднія. Заднімі нагамі русак адштурхоўваецца. Робіць скачкі на тры-чатыры метры. *(Паводле Змітра Бяспалага)*

?! Вызначце, з якімі назоўнікамі звязаны па сэнсе выдзеленыя прыметнікі. Пастаўце ад гэтых назоўнікаў пытанні да прыметнікаў. Колькі прыметнікаў характарызуюць назоўнік *ногі* ў чацвёртым сказе? Спішыце тэкст, ставячы пытанні паводле ўзору.

**288.** Прачытайце тлумачэнні слоў. Падбярыце прыметнікі, якія маюць такое значэнне.

Той, хто хоча есці, — … .
Той, хто заўсёды гаворыць праўду, — … .
Той, хто сочыць за сваімі рэчамі і адзеннем, — … .
Той, хто весяліцца, — … .

?! Запішыце прыметнікі.

**289.** Прачытайце прыметнікі. Падбярыце да іх назоўнікі.

Вузкая …, зімовы …, белы …, салодкае …, цікавыя …, ласкавыя …, вясёлая …, празрысты … .

?! На якое пытанне адказвае кожны прыметнік? Запішыце спалучэнні слоў, што атрымаліся.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**290.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх, выкарыстоўваючы толькі прыметнікі.

Які дзень?
Якая зіма?
Якое надвор’е?

?! Запішыце адказы на пытанні. Выкарыстайце як мага больш прыметнікаў.

Узор. *Дзень зімовы, доўгі, ... .*

**291.** Прачытайце прыметнікі. Пазнайце прадметы па апісанні.

Зялёная, кучаравая, стройная, беластволая ... .
Клапатлівая, ласкавая, добрая ... .
Празрысты, хуткі, чысты ... .
Яркае, пякучае, летняе ... .
Вясёлыя, доўгія, цікавыя, летнія ... .

Словы для выбару: *бярозка, матуля, ручай, сонца, дзянькі.*

?! Спішыце прыметнікі. Дапішыце назоўнікі, якія падыходзяць па сэнсе.

**292.** Раскажыце пра сябе, выкарыстоўваючы прыметнікі, паводле наступнага плана.

Якая ў мяне знешнасць?
Які ў мяне характар?
Які я сябар?

?! Напішыце некалькі сказаў пра сябе з ужываннем прыметнікаў.

**293.** Прачытайце прыметнікі. Што могуць характарызаваць такія словы?

Абветраны, бледны, заспаны, чырванашчокі, сыты, схуднелы.
Адкрытая, белазубая, вясёлая, вінаватая, шчырая, ласкавая, ветлівая.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Доўгія, пушыстыя, кучаравыя, распушчаныя, бліскучыя, пышныя.

На якія пытанні адказваюць прыметнікі ў кожным радзе? Запішыце прыметнікі і назоўнікі, якія яны характарызуюць.

**294.** Паводле ўзору з папярэдняга практыкавання раскажыце, якімі можа быць голас, нос, вусны. Падбярыце як мага больш прыметнікаў.

**295.** Разгледзьце малюнкі.



Па выразе твару паспрабуйце зразумець, які стан душы ў чалавека. Запішыце прыметнікі, якімі можна ахарактарызаваць настрой, адлюстраваны з дапамогай малюнкаў.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**296.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму? Якую назву можна яму даць?

Характар беларуса паважны, спакойны, рахманы, з добра развітою воляю і трываласцю ў працы. На першы погляд здаецца, што беларус крыху недаверлівы і скрытны. Ён не так хутка сыходзіцца з людзьмі. Затое, як толькі пазнаёміцца з новым чалавекам і пераканаецца ў яго няшкоднасці, робіцца даверлівым і шчырым.

Беларус — добры гаспадар, шануе капейку. Гэта не перашкаджае яму быць вельмі гасцінным. Беларус любіць павесяліцца. Весялосць у яго шчырая, ад усёй душы. Гэта відаць з песень, прыпевак і танцаў. *(Паводле Аркадзя Смоліча)*

***гасці́нны***

Пісьмова адкажыце, які беларус. Выпішыце з тэксту прыметнікі, якія характарызуюць беларуса.

**297.** Прачытайце народнае выказванне. Як вы яго разумееце?

Глыбокая рака цячэ без шуму.

Знайдзіце прыметнік у гэтым сказе. З якім назоўнікам ён звязаны па сэнсе? Які род і лік гэтага назоўніка? А род і лік прыметніка?
Спішыце сказ прыгожа, як на ўзоры.
Падкрэсліце прыметнік хвалістай лініяй.

## *Урокі 13—14. Род і лік прыметнікаў*

**298.** Прачытайце спалучэнні назоўнікаў з прыметнікамі.

Дзень (які?) вясенні.
Сонца (якое?) вясенняе.
Вопратка (якая?) вясенняя.
Канікулы (якія?) вясеннія.

Назавіце род і лік кожнага назоўніка.
Ці змяняецца па родах і ліках прыметнік *вясенні*?
Якая частка слова мяняецца ў прыметніку?
Запішыце гэтыя словазлучэнні. Абазначце канчаткі прыметнікаў знакам ☐.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**299.** Прачытайце спалучэнні назоўнікаў з прыметнікамі, якія ўжыты ў розных родах і ліках. Дапаўняйце прыметнікі патрэбнымі канчаткамі.

Сакавік (я к і?) — мокр.., ветран.., халодн..

Яблык (я к і?) — вялік.., салодк.., смачн..

Песня (я к а я?) — вясёл.., звонк..

Фарба (я к а я?) — сін.., ярк..

Надвор'е (я к о е?) — ясн.., цёпл.., халодн..

Адзенне (я к о е?) — летн.., асенн.., зімов..

Рукі (я к і я?) — пяшчотн.., працавіт..

Сняжынкі (я к і я?) — лёгк.., іскрыст..

?! Запішыце па пары прыметнікаў кожнага роду і множнага ліку, каб іх канчаткі не паўтараліся.
Вызначце род і лік прыметнікаў.
Ад чаго залежаць род і лік прыметнікаў?

Узор. *Сакавік мокр[ы], яблык вялік[і] (м. р., адз. л.), ... .*

*Запомніце!*
Прыметнікі змяняюцца па родах (у адзіночным ліку) і ліках.
Яны маюць такія ж род і лік, што і назоўнікі, з якімі яны звязаны па сэнсе.
Прыметнікі, як і назоўнікі, могуць быць мужчынскага, жаночага і ніякага роду, адзіночнага ці множнага ліку.
Прыметнікі мужчынскага роду ў назоўным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі ***-ы, -і***; жаночага роду — канчаткі ***-ая, -яя***; ніякага роду — ***-ое, -ае, -яе***.
У назоўным склоне множнага ліку прыметнікі маюць канчаткі ***-ыя, -ія***.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**300.** Прачытайце сказы. Дапоўніце прыметнікі патрэбнымі канчаткамі.

На дварэ сапраўдн.. казка. *(Аркадзь Марцінкевіч)*

Сукеначка на ёй чырвон.., гузікі таксама чырвон.., бліскуч.. . *(Паводле Васіля Хомчанкі)*

Быў цёпл.. сонечн.. дзень.

?! Па назоўніках, з якімі звязаны прыметнікі, вызначце род і лік гэтых прыметнікаў.

Спішыце сказы, устаўляючы канчаткі.

Абазначце канчаткі знакам ☐.

**301.** Прачытайце тэкст. Ці бачылі вы льняное поле?

## Блакітная ніва

Стаіць чэрвеньская раніца. Ласкавае сонейка дорыць зямлі цяпло. У небе звініць срэбная песня жаваранка.

Павеяў цёплы ветрык. Заварушылася блакітная ніва. Пабеглі па ёй, як па моры, хвалі.

Ільняное поле цвіце шмат дзён. Але кожная кветачка жыве толькі паўдня. Расплюшчыцца блакітнае вочка і палюбуецца сонцам. Ападуць пялёстачкі, а замест іх застанецца зялёная галоўка. У галоўцы будзе спець насенне. *(Ірына Гімпель)*

?! Знайдзіце ў тэксце прыметнікі.

Выпішыце спалучэнні назоўнік + прыметнік. Абазначце род і лік прыметнікаў. Мужчынскі род абазначце *м. р.*, жаночы род — *ж. р.*, ніякі род — *н. р.*, адзіночны лік — *адз. л.*, множны лік — *мн. л.*

Узор. *Раніца чэрвеньская (ж. р., адз. л.), ... .*

**302.** Прачытайце назоўнікі. Падбярыце да іх прыметнікі.

Дом (які?) ..., кніга (якая?) ..., возера (якое?) ..., сябры (якія?) ..., вецер (які?) ..., вёска (якая?) ..., дрэўца (якое?) ..., кветкі (якія?) ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Запішыце словазлучэнні. У дужках укажыце род у адзіночным ліку і лік прыметнікаў.
Выдзеліце канчаткі.

У з о р. *Дом (які?) вялікі (м. р., адз. л.), ... .*

**303.** Прачытайце вершаваныя загадкі. Адгадайце іх з дапамогай малюнкаў.

Сакавіты, круглаваты
здараўяка гэты.
Нам патрэбны на салаты
і на вінегрэты.





Прысеў пад плотам
рыжы кот,
павесіў доўгі хвост
на плот.

*(Міхась Пазнякоў)*

?! Знайдзіце ў загадках прыметнікі. Вызначце іх лік і род.
Выпішыце прыметнікі з назоўнікамі, якія гэтыя прыметнікі характарызуюць, напішыце іх род і лік.

**304.** Прачытайце тэкст. Ці бачылі вы калі-небудзь жывога бабра? Калі бачылі, раскажыце пра гэта.

**Бабёр**

На беразе невялічкай рэчкі дзеці знайшлі мал.. бездапаможн.. бабраня. Яно заблыталася ў густых водарасцях. Дзеці пашкадавалі малога звярка і ўзялі яго з сабою.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Калі бабёр вырас, узніклі непрадбачан.. цяжкасці. У бабра выраслі востр.. зубы, і яму трэба было што-небудзь грызці. Бабёр грыз усё: дзверы, мэблю, падаконнікі.

Выпускаць бабра на волю было небяспечна. Браканьеры маглі пакваціцца на цудоўн.. чорн.. футра. Гаспадары вырашылі аддаць яго ў запаведнік. *(Паводле Віталя Вольскага)*

?! Якія канчаткі прыметнікаў прапушчаны ў тэксце? Які лік і род (у адзіночным ліку) гэтых прыметнікаў? Колькі частак у тэксце?

Якую назву можна даць уступнай частцы? Пра што ў ёй расказваецца?

Якую назву можна даць асноўнай частцы? Аб чым гэта частка?

Чым заканчваецца тэкст?

Запішыце план тэксту. Ён, напрыклад, можа быць такім.

**Бабёр**

1. Знаходка.
2. Непрадбачаныя цяжкасці.
3. Лёс бабра.

Прачытайце тэкст яшчэ раз.

Перакажыце яго вусна па плане.

**305.** Уявіце, што вы вярнуліся дамоў з прагулкі і вырашылі патэлефанаваць сябру, які не змог з вамі пайсці.

Вясенні дзень быў сонечны, вы вельмі задаволены тым, што прайшліся. У вас выдатны настрой.

Раскажыце аб сваіх уражаннях, аб тым, што вы бачылі.

?! Выкарыстоўвайце ў сваім расказе як мага больш прыметнікаў.

**306.** Прачытайце тэкст. Дапаўняйце прыметнікі канчаткамі.

Непадалёку ад Брэста знаходзіцца Белавежск.. пушча. Яна здзіўляе сваёй незвычайнасцю. Велізарн.. сосны і елкі, дубы. Ёсць асобн.. дубы, якім ужо больш за пяцьсот год. Смалов.. пах хвоі перамешваецца з грыбным пахам. Лясн.. палянкі пакрыты стракатым дыванам з кветак. На палянках можна сустрэць хутканог.. ка-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

зуль, ласёў, дзікоў і многіх іншых жывёл, якія тут утрымліваюцца ў натуральных умовах.



Гонар Белавежскай пушчы — зубр. Цяжк.. тулава жывёлы ўпрыгожвае масіўн.. галава з выпуклымі вачыма і закругленымі рагамі. Белавежск.. пушча — адно з нямногіх месцаў у свеце, дзе ў прыродных умовах пражываюць гэтыя старажытн.. жывёлы.

**Страка́ты** — які вылучаецца неаднароднасцю, разнастайны, з розных элементаў; рознакаляровы.

?! Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах *Брэст, Белавежская пушча*.

Выпішыце з тэксту прыметнікі, якія вы дапаўнялі канчаткамі, разам з назоўнікамі, з якімі яны звязаны па сэнсе. Абазначце іх лік і род.

**307.** Прачытайце тэкст. Ці падобная яго тэма да тэмы тэксту з папярэдняга практыкавання?

Які з гэтых тэкстаў больш дакладны, навуковы, а які — мастацкі, узнёслы?

### Цень Белавежы

Чорнае і зялёнае. Вечны сонечны цень Белавежскай пушчы, самага старажытнага і ці амаль не самага дзівоснага лесу на зямлі.

Чорнае і сіняе. Цень пушчы, а над ёю бясконцае блакітнае неба Беларусі, яе рэк і азёр.

Чорнае і карычневае. Мільгане ў нетрах алень або цяжка пратупае зубр.

Чорнае, зялёнае, сіняе, карычневае. Але яшчэ і залатое: сэрцы лепшых людзей, якія насуперак усяму стагоддзямі берaглі Белавежу... Гэтыя старыя грабы, тысячагадовыя дубы, і такіх магутных

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

зуброў, і паважных аленяў. І збераглі дзеля нашай гордасці і славы. *(Паводле Уладзіміра Караткевіча)*

***тысячагадо́вы***

?! Якімі фарбамі малюе Белавежскую пушчу пісьменнік?
Што адпавядае кожнаму колеру?
Выпішыце колеры фарбаў. У якім ліку і родзе ўжыты гэтыя прыметнікі?

**308.** Раскажыце, ці ёсць лес каля вашай вёскі ці горада. Ці бывалі вы там? Што вы там рабілі? Чым можна займацца ў лесе летам? А зімой?
Якімі колерамі намалявалі б лес вы?
Раскажыце пра свае ўражанні ад наведвання лесу.

**309.** Прачытайце верш-загадку. Каго паэт называе *шэрае*, а каго — *чорнае*?

**Чорнае і шэрае**

Чорнае
спакойна
дрэмле на падлозе.
Шэрае
на варце
туліцца ў трывозе.
Чорнае
паціху
лапай варухнула.
Шэрае
адразу
хвосцікам махнула.

*(Ігар Мазнін;*
*пераклад з рускай мовы Васіля Віткі)*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Па колькасці літар вызначце словы-адгадкі.
Назавіце род і лік прыметнікаў, што выкарыстаны ў вершы.
Спалучыце гэтыя словы са словамі-адгадкамі. У якім родзе яны ўжыты цяпер? Запішыце гэтыя спалучэнні слоў.

## *Урокі 15—17. Змяненне прыметнікаў па склонах*

**310.** Прачытайце склонавыя формы спалучэнняў слоў. Знайдзіце ў словазлучэннях прыметнікі.

Н. белавежскі зубр, паласатая зебра.
Р. белавежскага зубра, паласатай зебры.
Д. белавежскаму зубру, паласатай зебры.
В. белавежскага зубра, паласатую зебру.
Т. белавежскім зубрам, паласатай зебрай.
М. аб белавежскім зубры, аб паласатай зебры.

Ці змяняюцца прыметнікі па склонах?
Якая частка слоў мяняецца?
Ад чаго залежыць склон прыметніка?

*Запомніце!*
Прыметнік змяняецца па склонах, гэта значыць скланяецца.
Прыметнік мае той жа склон, што і назоўнік, з якім ён звязаны па сэнсе: *зялёная трава (Н.)*.
Каб даведацца, у якім склоне стаіць прыметнік, трэба вызначыць склон адпаведнага назоўніка.

**311.** Прачытайце. Запомніце пытанні, на якія адказвае прыметнік у розных склонах.

Н. (які? якая? якое?) белы снег, марозная зіма, сіняе мора.
Р. (якога? якой? якога?) белага снегу, марознай зімы, сіняга мора.
Д. (якому? якой? якому?) беламу снегу, марознай зіме, сіняму мору.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

В. (які? якую? якое?) белы снег, марозную зіму, сіняе мора.

Т. (якім? якой? якім?) белым снегам, марознай зімой, сінім морам.

М. (аб якім? аб якой? аб якім?) аб белым снезе, аб марознай зіме, аб сінім моры.

?! Запішыце практыкаванне ў сшытак. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

**312.** Змяніце па склонах наступныя спалучэнні слоў. Успомніце словы, якія дапамагаюць пры скланенні.

Н. (ёсць) маўклівы лес, цікавая кніга.
Р. (няма) ..., ... .
Д. (даць) ..., ... .
В. (бачу) ..., ... .
Т. (задаволены) ..., ... .
М. (гаварыць) ..., ... .

?! Запішыце ў сшытак словазлучэнні ва ўсіх склонах. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

**313.** Прачытайце назоўнікі, якія выкарыстаны ў розных склонах. Прыметнікі, што ў дужках, пастаўце ў патрэбным склоне з дапамогай пытанняў.

Вучня (якога?) (стаpанны), зямлі (якой?) (родная), полю (якому?) (шырокае), за сталом (якім?) (абедзенны), аб браце (якім?) (родны), ноччу (якой?) (цёмная).

?! Спішыце, ставячы прыметнікі ў патрэбным склоне. Абазначце склон.

Узор. *Вучня (якога?) стараннага — Р., ... .*

**314*.** Прачытайце назоўнікі. Падбярыце да іх па сэнсе прыметнікі. Праскланяйце словазлучэнні.

Вада, акно, мёд.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**315.** Прачытайце словазлучэнні, у якіх выкарыстаны назоўнікі ў розных склонах. Падбярыце замест кропак прыметнікі. Пастаўце іх у адпаведных склонах.

Сустрэў ... чалавека, спужаўся ... звера, сядзеў пад ... дрэвам, быў на ... свяце, гуляў у ... лесе, сустрэў ... сябра, прачнуўся ... раніцай.

?! Запішыце словазлучэнні, што атрымаліся.
Абазначце склон назоўніка і прыметніка.

Р. Р.
Узор. *Сустрэў добрага чалавека, ... .*

**316.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх прыметнікі.
* Пра якога Максіма гаворыцца ў апошнім сказе?

Аднекуль дыхнула халодным ветрам. *(Іван Пташнікаў)*

Не сядзіцца ў хаце хлопчыку маломy. *(Якуб Колас)*

Калі ўскідваю вочы ад зямной мітусні ў таемнае зорнае неба, шукаю на ім Венеру, Максімаву зорку... *(Іван Ждановіч)*

?! Вызначце склоны, у якіх ужыты прыметнікі.
Спішыце сказы. Пазначце алоўкам зверху над словамі склоны прыметнікаў і назоўнікаў.

**317.** Прачытайце тэкст, устаўляючы прапушчаныя канчаткі прыметнікаў.

Глух.. цёмн.. сцяной падступае з абодвух бакоў да ракі лес. Сосны і яліны, кучарав.. бярозы глядзяць у ваду, як у люстра. Іх кроны адбіваюцца ў ціх.. плыні. Потым лес расступаецца, адкрывае шырок.. пойму з лугамі, векав.. дубы, бярозав.. гай. *(Паводле Тараса Хадкевіча)*

?! Вызначце лік і склон прыметнікаў.
Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя канчаткі. Зверху алоўкам пазначце склон прыметнікаў.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**318.** Прачытайце сказы. Па стрэлачках вызначце, з якімі назоўнікамі звязаны па сэнсе прыметнікі.

У мяккім передвячэрнім асвятленні здаецца асабліва прыгожым від на ўзгоркі з сасновым лесам. *(Віталь Вольскі)*

Добра было ясным днём на высокім беразе. *(Кузьма Чорны)*

На свеце вельмі многа прыгожых мясцін, добрых людзей, шчырых сяброў. *(Мікола Хведаровіч)*

Шчасце — жыць, працаваць з чалавекам сумленным. *(Максім Танк)*

?! Пастаўце пытанні па стрэлачках: ад назоўнікаў да прыметнікаў.
У якім сказе выкарыстаны назоўнікі ў множным ліку? У якім ліку стаяць звязаныя з гэтымі назоўнікамі прыметнікі?
Вызначце склоны назоўнікаў у другім і чацвёртым сказах.
Запішыце гэтыя сказы. Абазначце склоны прыметнікаў.

**319.** Прачытайце сказы. Вызначце склоны выдзеленых прыметнікаў.

Зімой увесь гэты ўзгорак быў укрыты **тоўстым** пластом снегу. *(Мікола Лупсякоў)*

Атуленае садамі і прысадамі мястэчка ўяўляецца **зялёным** востравам сярод **залацістага збожжавага** разліву. *(Іван Навуменка)*

**Цудоўны** бор — сасна ў сасну — абступаў **невялікую** абжытую палянку. *(Іван Шамякін)*

?! Выпішыце са сказаў спалучэнні назоўнікаў з выдзеленымі прыметнікамі. Абазначце іх склоны.

**320.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў ім прыметнікі. З якімі назоўнікамі яны звязаны?

Пад дубам тысячагадовым
зубр-адзінец застыў, нібы скала.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У пушчы свой закон суровы:
ты не важак, як старасць надышла.

*(Эдуард Валасевіч)*

?! У якіх склонах ужыты тут прыметнікі з назоўнікамі, якія яны характарызуюць?
Спішыце верш. Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй. Абазначце іх склоны.

**321.** Прачытайце, як змяняюцца па склонах прыметнікі множнага ліку.

Н. (якія?) працавітыя, сумленныя, шчырыя людзі.
Р. (якіх?) працавітых, сумленных, шчырых людзей.
Д. (якім?) працавітым, сумленным, шчырым людзям.
В. (якіх?) працавітых, сумленных, шчырых людзей.
Т. (якімі?) працавітымі, сумленнымі, шчырымі людзьмі.
М. (аб якіх?) аб працавітых, сумленных, шчырых людзях.

?! Спішыце, абазначце канчаткі прыметнікаў знакам ☐.

**322.** Прачытайце незакончаныя сказы.
Устаўце замест кропак прыметнікі множнага ліку, якія падыходзяць па сэнсе.

У кветніку расцвілі ... кветкі.
У горадзе пабудавалі многа ... дамоў.
Кніга расказвае пра ... сяброў.
Наш настаўнік нядаўна пабываў у ... мясцінах.

?! Запішыце сказы ў сшытак, устаўляючы прыметнікі.
Вызначце склоны гэтых прыметнікаў.

**323.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім прыметнікі. У якім ліку яны ўжыты?

### У заапарку

У Мінску ўжо многа год працуе заапарк. Вучні разам з настаўнікамі вырашылі паехаць туды на экскурсію. У заапарку

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

яны пабачылі шмат звяроў і птушак. У клетках скакалі вясёлыя і смешныя малпы. Каля загародкі гулялі белыя ламы і паласатыя зебры. За сеткай ляталі розныя экзатычныя птушкі. У заапарку дзеці ўбачылі рыжых лісіц, бурых мядзведзяў, ваўкоў. Ёсць там таксама ўсурыйскія тыгры і белавежскія зубры. *(Антаніна Змушко)*

**Экзаты́чны** — які здзіўляе сваёй незвычайнасцю, дзівосны, вычварны.

Выпішыце з тэксту спалучэнні прыметнікаў з назоўнікамі. Вызначце іх склоны.

**324.** Прачытайце тэкст. Разгледзьце малюнак, на якім адлюстравана аўсянка. Ці бачылі вы гэтую птушку ў прыродзе?



Зімой аўсянкі — ціх.. і непрыкметн.. птушкі. Іх можна нават з вераб'ямі зблытаць. Такія ж шэраньк.. . Марозн.. днямі яны часта з вераб'ямі скачуць па вясков.. дарогах. Згублен.. каласкі цярэбяць.

*(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

У якім ліку ўжыты ў тэксце прыметнікі і назоўнікі? Якія канчаткі прыметнікаў прапушчаны?

Запішыце тэкст пад дыктоўку. Дыктуйце сказы адно аднаму са сваім суседам па парце.
Затым праверце свае тэксты.

**325.** Прачытайце верш. Што паэт лічыць скарбамі? А што лічыце скарбам вы?

**Лясныя скарбы**

Я часта і доўга па лесе блукаю,
дзівосныя скарбы яго сабіраю:
зязюль кукаванне
і песні драздоў,
грыбное маўчанне


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

і звон ручайкоў,
і смутак ракіт,
і крынічак блакіт,
і водар сасновы,
і пах чабаровы,
рабіны цяпло
і бярозак святло...
Я самы шчаслівы, багаты
вяртаюся з лесу дахаты.

*(Іван Муравейка)*

Знайдзіце ў вершы спалучэнні назоўнікаў з прыметнікамі.
Якое слова характарызуюць прыметнікі *шчаслівы, багаты* ў апошнім сказе верша?
Вызначце лік, род (у адзіночным ліку) і склон прыметнікаў у вершы.

**326**. Уявіце чалавека, мясціну або яшчэ нешта іншае, што для вас з’яўляецца вельмі дарагім. Апішыце свой скарб. Не называйце таго, аб чым расказваеце. Слухачы павінны здагадацца, пра што вы распавядаеце.
Выкарыстоўвайце пры апісанні прыметнікі.
Запішыце прыметнікі, якія характарызуюць тое, што вам асабліва дарагое.

## Праверце сябе

Выберыце правільны варыянт адказу.

1. Прыметнік — гэта часціна мовы, якая...

а) абазначае дзеянне і адказвае на пытанні што рабіць? што зрабіць?;

б) абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні які? якая? якое? якія?;

в) абазначае назву прадмета і адказвае на пытанні хто? што?

2. Прыметнік змяняецца па родах, ліках і склонах.

а) Так;

б) не.

3. Прыметнік мае такі ж род, лік і склон, што і назоўнік, з якім ён звязаны па сэнсе.

а) Так;

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

б) не.

4. Змяненне прыметніка па склонах называецца скланеннем.

а) Так;

б) не.

# ЗАЙМЕННІК

## *Урокі 18—21. Займеннік як часціна мовы*

**327.** Прачытайце верш. Адкажыце на пытанне, якое ў ім задаецца.

Калі **я** знаёмых
ці родных спаткаю,
вітаюся,
зняўшы ўбор з галавы,
і ветла кажу,
калі **што** ў **іх** спытаю:
— Вялікі **вам** дзякуй!
Прабачце.
А **вы**?

*(Анатоль Клышка)*

?! Сказы якіх відаў ёсць у вершы?
Прачытайце выдзеленыя словы.
Гэта назоўнікі? Прыметнікі? Дзеясловы? Ці можаце вы іх аднесці да вядомай вам часціны мовы?
Запішыце гэтыя словы ў сшыткі.

**328.** Прачытайце словы. Раздзяліце іх на наступныя групы: назоўнікі, прыназоўнікі, дзеясловы, прыметнікі.

Час, кніга, гуляць, вясёлы, чырвоны, мой, з, на, мы, вечар, працаваць, цалаваць, перад, пад, добры, ён, сябе.

?! Запішыце словы па часцінах мовы.
Якія словы вы не можаце аднесці да вядомых вам часцін мовы?
Запішыце гэтыя словы асобна.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Запомніце!*
У мове ёсць часціна мовы, якая называецца **займеннік**. Займеннік паказвае на прадмет, прымету, але не называе іх. Напрыклад, *мой, такі, яна, яно, ты, вы, увесь, ніхто, гэты, наш, ваш, чый, каторы, сябе* і гэтак далей.
Займеннікаў нямнога, але яны ўжываюцца часта.

**329.** Падумайце, чаму займеннік мае такую назву. Прачытайце разважанні.

Разбяром гэтае слова па саставе.

Корань слова -***йм***- або -***ім***-. Прыстаўка ***за***-. Напэўна, гэта скарочанае слова *замена*. Можна сказаць, што ў назве займенніка схаваны яго сэнс: займеннік выкарыстоўваецца *замест імені* або назвы.

Якая частка слова *займеннік* яшчэ не названа?
Запішыце гэтае слова. Абазначце ў ім прыстаўку, корань, суфікс.
Як называецца займеннік у рускай мове?

**330.** Прачытайце сказы. Як называецца такая з'ява? Калі яна часцей за ўсё адбываецца?

Рэкі выйшлі з берагоў. Яны злучыліся ў нізінах з ляснымі рэчкамі, балотамі ў адзін вялікі вадзяны прастор. Стала відаць толькі асобныя ўзвышшы. На іх ратуюцца лясныя жыхары.

Знайдзіце займеннікі ў другім і чацвёртым сказах. Замест якіх слоў яны ўжыты?
Спішыце сказы. Падкрэсліце займеннікі.

**331.** Прачытайце вершы, заканчваючы іх патрэбнымі словамі.

На перапынку мы ў гульні гулялі:
бегалі разам і разам скакалі.
Раптам штурхнулі малую дзяўчынку —
ціха стаіць, выцірае слязінку...
Усе да яе мы падбеглі:
— Не плач.
І, калі ласка, ты нас ... .

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Не выканаў ты абяцанне, пакрыўдзіў сябра...
І ён чакае ў самоце, калі ты скажаш:
— Не меў я рацыі, ты, сябра не сумуй.
Я вельмі вінаваты, мне ... .

Словы для выбару: *даруй, прабач.*

?! Якія яшчэ ветлівыя словы вы ведаеце? Калі іх патрэбна выкарыстоўваць?
Якія займеннікі ёсць у гэтых вершах? Запішыце гэтыя займеннікі ў сшытак.

**332.** Прачытайце сказы. Назавіце ў іх займеннікі.

Ці ведаеце вы, дзеці, такую расліну — падбел? *(Уладзімір Арлоў)*
Ён быў вельмі палахлівы. *(Змітро Бяспалы)*
Ноччу яны адпачываюць. *(Рыгор Ігнаценка)*
А ты зараз кладзіся спаць. *(Уладзімір Караткевіч)*
Мы цябе не баімся. *(Алесь Асіпенка)*
Яна падбягае да брата і моцна яго абдымае. *(Іван Сіняўскі)*

?! У якім сказе выкарыстаны два займеннікі?
Запішыце сказы ў сшытак. Падкрэсліце займеннікі.

**333.** Прачытайце жартоўныя дыялогі. Як вы лічыце, дзеці якога ўзросту размаўляюць са сваімі маці? А з вамі вашы матулі сталі б гаварыць на такія тэмы ці не? Чаму?

— Я шмат разоў казала, каб ты не хадзіў па лужынах. Бачыш, зноў захварэў! — дакарае маці сына.
— Добра, мама, я цяпер буду бегаць.

— Мама, я сёння ўпаў, — скардзіцца хлопчык.
— Ты плакаў?
— Не, паблізу нікога не было.

?! Знайдзіце ў дыялогах займеннікі. Выпішыце іх.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**334.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце незакончаныя сказы. Замест кропак устаўце патрэбныя займеннікі.



... спіць у калысцы. ... мые посуд. ... робіць урокі. ... гуляюць у хакей.

Запішыце сказы ў сшытак. Падкрэсліце займеннікі.
Замест якіх слоў вы ўжывалі займеннікі?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**335.** Прачытайце жартоўныя дыялогі. Растлумачце сэнс кожнага жарту. Замест кропак устаўце прапушчаныя займеннікі *я, ты, ён, мы*.

Маці ўшчувае сына-гультая.
Сын апраўдваецца:
— Мамачка, чаго ... крычыш? ... ж нічагусенькі не рабіў.

Бацька спытаў:
— Дзе твой дзённік, сынок?
— ... аддаў яго Валодзю — ... хоча напалохаць сваіх бацькоў.

— ... не бойся, — супакойвае маці сына перад кабінетам зубнога ўрача. — Нічога табе тут не зробяць.
— Тады чаго ... сюды прыйшлі?

?! Знайдзіце з дапамогай настаўніка іншыя займеннікі ў гэтых жартах. Запішыце ўсе займеннікі, якія тут выкарыстаны.

**336.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім займеннікі.

## Вавёрчын падарунак

Аднойчы я пайшоў у лес. Раптам лясную сцежку мне перабегла вавёрка.

Яна ўскочыла на маладую сасонку і з вялікай цікавасцю пазірала на мяне. На пушыстым хвасце рыжай вавёркі чырванеў асінавы лісток.

Я махнуў рукой. Шустрая вавёрка спужана скокнула на высокую сасну, а чырвоны лісток з хваста ўпаў на мой рукаў.

З вавёрчыным падарункам я пакрочыў дамоў. *(Паводле Ірыны Гімпель)*

?! Запішыце тэкст пад дыктоўку.
Падкрэсліце ў тэксце займеннікі.

Праверце дыктоўкі адно ў аднаго.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**337.** Прачытайце верш. Вывучыце яго на памяць. Раскажыце дома верш сваім маці.

**Родныя рукі**

Я ласкай сагрэты,
пяшчотай тваёю.
Ты — яснае сонца,
што рана ўстае.
І робяць усё
для мяне з любоўю
родныя рукі,
мама, твае.

*(Уладзімір Місун)*

?! Знайдзіце ў вершы займеннікі. Якія словы яны замяняюць? Запішыце займеннікі, што выкарыстаны ў вершы, па памяці.

**338.** Прачытайце тэкст. Якую назву яму можна даць? Якая асноўная думка гэтага тэксту? Што аўтар хацеў выказаць з яго дапамогай?

Калі Ала прыбегла са школы, маці якраз наводзіла ў пакоях парадак. Сёння — субота, і ў гэты дзень у доме заўсёды ўборка.

Ала пачала дапамагаць маме. Яна памыла лісточкі кветак, паліла вазоны. Дзяўчынка любіла даглядаць кветкі.

Потым Ала працірала шкло ў вокнах. Яна старалася. І выходзіла ў яе, як у сапраўднай гаспадыні. Шыбы ажно папіскваліі. Скончыўшы работу, дзяўчынка адышла ад акна, каб паглядзець, ці ёсць на шкле яшчэ плямкі. Зірнула — і здзівілася...

— А дзе шкло? Я ж толькі яго працірала.

Маці ўсміхнулася і абняла Алу:

— Памочніца ты мая залатая! Шкло нікуды не падзелася. Гэта ты дужа добра справілася са сваёй работай. Плямак няма — вось і шкла не відаць. *(Паводле Васіля Ткачова)*

?! Знайдзіце ў тэксце займеннікі.
Прачытайце тэкст яшчэ раз. Закрыйце кнігі.
Перакажыце тэкст сваімі словамі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**339.** Прачытайце верш. Як называюцца песні, што спяваюць маці сваім маленькім дзецям перад сном?

### Вечаровая песня

Ахінае сцежкі ночка,
дрэмлюць дрэвы і кусты.
Мой сыночак, мой званочак,
засынай хутчэй і ты.

У дарослых ёсць дарогі,
многа пройдзеных дарог,
ёсць у нас свае трывогі,
у цябе няма трывог.

Падрасцеш, сынок, і будзеш
мір ахоўваць на зямлі,
каб спакойна спалі людзі,
каб шчаслівымі былі.

*(Васіль Жуковіч)*

Колькі сказаў у гэтым вершы?
Выпішыце тыя сказы, у якіх сустракаюцца займеннікі.
Падкрэсліце займеннікі.

**340.** Уявіце, што ў вашай мамы дзень нараджэння, або іншае свята, або проста вам хочацца сказаць, як вы яе любіце.
Успомніце самыя цёплыя і ласкавыя словы, з якімі вы звернецеся да сваіх матуль.

Раскажыце адно аднаму тыя словы, якія вам хочацца сказаць сваім маці.
Выкарыстоўвайце ў сваіх выказваннях займеннікі.

**341.** Прачытайце тэкст. Пра чалавека якой прафесіі ён напісаны?

### На пошце

Генава мама Ларыса Пятроўна працуе на пошце. Яна прымае і выдае пасылкі, бандэролі. Мы бачылі яе там, як адпраўлялі па-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

сылку бабулі Пелагеі і дзядулю Міхасю. Яны жывуць у вёсцы Навасёлкі на самым беразе ракі Прыпяць.

Спрытна працуе Ларыса Пятроўна. Паставіць пасылку на вагі, узважыць і пачынае перавязваць вяровачкаю. Пасля бярэ нешта падобнае да растопленага шакаладу, лье на пасылку і ставіць пячатку. *(Паводле Алены Мімрык)*

**по́шта**

**Бандэро́ль** — паштовае адпраўленне ў папяровай абгортцы.

?! Растлумачце напісанне ў тэксце слоў з вялікай літары.
Знайдзіце ў сказах займеннікі. Замест якіх слоў яны ўжыты?
Спішыце першую частку тэксту. Падкрэсліце ў сказах займеннікі.

**342.** Раскажыце, навошта яшчэ людзі ходзяць на пошту.
Ці бывалі вы там? Што вы там рабілі?

**343.** Падрыхтуйце паведамленне аб прафесіі сваёй маці. Дзе яна працуе? Што яна робіць? Ці можаце вы дапамагчы ёй у яе працы?
У сваім паведамленні выкарыстоўвайце займеннікі.
Запішыце некалькі сказаў аб прафесіі вашай маці ў сшытак.

**344.** Прачытайце вершаваныя загадкі. Здагадайцеся, пра каго або пра што ў загадках гаворыцца *ён*.

Для адных — ён садавод,
для другіх — ён палявод.
Паспявае ўсюды быць,
поле, луг і сад паліць.

*(Нічыпар Парукаў)*

У ваду нырае смела.
Хату ён будуе ўмела.
Пад вадой і на вадзе
будаўніцтва ён вядзе.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ён прачнуўся
рана-рана.
Мэблю возіць
ён старанна.
На будоўлю —
цэглу, рамы.
Малако і хлеб —
у крамы.
Ён лайдачыць не прывык.
а завецца — … .

*(Паводле Алеся Емельянава)*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | |

?! Па намаляваных схемах слоў праверце колькасць літар у словах-адгадках. Запішыце словы-адгадкі ў сшытак.

**345.** Прачытайце тэкст. Ён сур’ёзны ці жартоўны?

**Бабровая хатка**

Бабёр — клапатлівы гаспадар. На беразе рэчкі ён будуе драўляную хатку. Знізу і ўнутры яна змацоўваецца рачным глеем.

Часам да бабровай хаткі падыходзіць воўк. Але драпежнаму зверу не хапае сілы разбурыць яе. У моцнай хатцы бабёр адчувае сябе спакойна.

У час Вялікай Айчыннай вайны бабровая хатка была іншы раз надзейнай схованкай ад чужынцаў. Вядомая гісторыя, калі ў фашысцкай засадзе апынуліся трое партызан. Але яны змаглі схавацца ў адной бабровай хатцы. Калі небяспека мінула, яны


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

выйшлі з хаткі і вярнуліся ў партызанскі атрад. *(Паводле Віталя Вольскага)*

**Глей** — вязкі асадак з мінеральных або арганічных рэчываў на дне вадаёмаў.

Знайдзіце ў тэксце займеннікі. Выпішыце іх.
Прачытайце тэкст яшчэ раз.
На колькі частак яго можна падзяліць?
Аб чым расказваецца ў першай частцы?
Пра што гаворыцца ў другой?
Якія падзеі апісаны ў трэцяй частцы тэксту?
Падбярыце назвы да кожнай часткі. Запішыце план тэксту.
* Перакажыце пісьмова трэцюю частку тэксту.

**346.** Прачытайце верш. Замест кропак устаўце прапушчаныя займеннікі *я, ён, мне, яна, мяне*.

Чорны дзяцел сеў на дуб,
узлахмаціў чорны чуб:
— Ох і птах ... безгаловы:
дуб стары, але ж здаровы,
жалудоў ... мае кош,
а яды ... ні на грош.
Палячу ... на сасну,
сук струхнелы паласну.
Будзе смачны ... абед,
папалудную як след.
... імшыстая, старая,
для ... яду трымае.
Дзяцел збіў імшасты мох
і наеўся колькі мог.

*(Станіслаў Шушкевіч)*

***папалу́днаваць***

Гэты верш сур'ёзны ці жартоўны?
Якія займеннікі выкарыстаны ў вершы двойчы?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**347.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім займеннікі.

Ляснік ішоў з абходу. У балоце ён заўважыў маленькае ласяня. Яно ніяк не магло выбрацца з вады. Ляснік узяў ласяня на рукі і прынёс дадому. Дзеці напаілі яго малаком. Хутка ласяня ачуняла. Яно прывыкла да дзяцей і не захацела ісці ў лес.

**Ачуня́ць** — папрaвіцца пасля хваробы; ажыць.

Прадыктуйце тэкст адно аднаму.
Праверце сябе па кнізе. Падкрэсліце ў тэксце займеннікі.

**348.** Прачытайце верш-дыялог. З якіх сказаў складаецца гэты верш?

**Вясёлыя дажджынкі**

— Хто пабудзіў цябе, Ірынка?
Чаму не спіш даўно?
— А мне вясёлыя дажджынкі
пастукалі ў акно.

*(Паўлюк Пранузa)*

Назавіце займеннікі, якія ёсць у вершы.
Выпішыце сказы з займеннікамі. Падкрэсліце займеннікі.

## ДЗЕЯСЛОЎ

### *Урок 22. Дзеяслоў як часціна мовы. Лік дзеяслова*

**349.** Прачытайце словы. Знайдзіце сярод іх тыя, якія называюць дзеянні. Пастаўце да іх пытанні.

Дзень, свята, бегчы, рабіць, лён, цудоўны, рашаю, пішу, цень, светлы, прыгожы.

Выпішыце ў сшытку дзеясловы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**350.** Прачытайце рады слоў. Назавіце часціны мовы, да якіх адносіцца кожнае слова.

Цемната, цёмны, цямнець.
Святло, светлы, святлець.
Бялець, белы, белізна.
Чорны, чарнець, чарната.

?! Якія дзеясловы з'яўляюцца процілеглымі па значэнні — антонімамі? Запішыце ў сшытак дзеясловы з кожнага радка.

*Успомніце!*
**Дзеяслоў** — гэта часціна мовы, якая абазначае назву дзеяння. Дзеяслоў адказвае на пытанні **што рабіць? што зрабіць? што рабіў? што будзе рабіць? што робіць?** і падобныя: *чытаць, прачытаць, чытаў, прачытае, чытае*.

**351.** Прачытайце назоўнікі і дзеясловы.
Да назоўнікаў падбярыце дзеясловы, якія падыходзяць па сэнсе.

| | |
|---|---|
| Сякерай | пішуць |
| нажом | ядуць |
| відэльцам | мыюць |
| мылам | колюць |
| ручкай | рэжуць |

?! Запішыце спалучэнні слоў, што ў вас атрымаліся.
Дзеянне ў іх выконваецца адной асобай ці некалькімі?
Вызначце, у якім ліку стаяць дзеясловы.

*Запомніце!*
Дзеясловы змяняюцца па ліках, адзіночным і множным: *будую — будуем, ходзіць — ходзяць, гуляў — гулялі*.

**352.** Прачытайце жартаўлівы дыялог.

— **Адчыні** вароты!
— А хто **едзе**?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Той, што ўсё **ўмее**!
— **Глядзі**, усё ўмее, то сам і **адчыняй**!

**адчыня́ць**

?! Да якой часціны мовы адносяцца выдзеленыя словы?
Пастаўце да дзеясловаў пытанні. Выдзеленыя дзеясловы стаяць у адзіночным ці множным ліку?

**353.** Прачытайце народныя выказванні. Растлумачце іх сэнс. Каго называюць ранняй птушкай? Як яшчэ называюць чалавека, які рана ўстае?

Хто рана прачынаецца, той ніколі не спяшаецца.
Увішны ўсюды паспее.

?! Знайдзіце ў сказах дзеясловы. Пастаўце да іх пытанні. Вызначце лік дзеясловаў у выказваннях.
Словы яшчэ якіх часцін мовы ёсць у гэтых сказах?
Спішыце народныя выказванні. Падкрэсліце дзеясловы дзвюма лініямі.

**354.** Уявіце, што вы вырашылі заўтра ўстаць раней звычайнага, каб заняцца нейкімі важнымі справамі.
Раскажыце, што вы будзеце рабіць, калі ўстанеце рана.
Выкарыстоўвайце ў сваіх выказваннях дзеясловы адзіночнага ліку.

**355.** Прачытайце сказы. Аб чым або аб кім гаворыцца ў кожным з іх?

Над снежнай палянай віселі ў бяздонні неба буйны́я зоркі. *(Змітрок Бядуля)*

Скрозь галіны лесу свеціцца шэрае, агорнутае воблакамі неба. *(Якуб Колас)*

Блізка рэчкі Самацечкі камары таўкуцца. *(Максім Багдановіч)*

?! Знайдзіце ў кожным сказе дзеяслоў. Ад якога слова трэба паставіць пытанне да дзеяслова?
У якім сказе дзеяслоў ужыты ў адзіночным ліку? У якіх — у множным?
Спішыце сказы. Падкрэсліце дзеясловы дзвюма лініямі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 23.* Не *з дзеясловамі*

**356.** Прачытайце сказы. Звярніце ўвагу на напісанне ***не*** з дзеясловамі.

Не раскідвай свае рэчы ў пакоі.
Не кідай смецце на дарозе.
Не перабягай вуліцу перад транспартам, які рухаецца.

?! Спішыце сказы. Пішыце ***не*** асобна ад наступнага дзеяслова.

*Успомніце!*
***Не*** пішацца асобна ад наступнага дзеяслова: *не хачу, не выканаць, не рабіў.*

**357.** Падумайце і скажыце, чаго яшчэ ***не*** патрэбна рабіць. Выкарыстайце ў сваіх выказваннях ***не*** ў спалучэнні з дзеясловам. Запішыце адно з такіх выказванняў.

**358.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў ім дзеясловы. Пастаўце да іх пытанні.

Зіма, на дварэ мяцеліца вее,
халодныя песні заводзіць віхор,
зоркі (не) свецяць, і сонца (не) грэе,
аж вылезці страшна і глянуць на двор.

*(Янка Купала)*

?! Спішыце слупок верша, раскрываючы дужкі.

**359.** Прачытайце загадкі. Здагадайцеся па малюнку і колькасці літар, пра што ідзе гаворка.

***Мле́чны Шлях***



Не шуміць старымі ліпамі,
не зарос густой травою —
залатым пяском усыпаны
гэты шлях над галавою.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Напячэ аладак
белых — не замажа,
хоць сама заўсёды
чорная, як сажа.

*(Мікола Маляўка)*

?! Выпішыце з загадак ***не*** з дзеясловамі.

**360.** Паразважайце, што значыць быць сябрам.
Якія ўчынкі ***не*** зробіць сябар свайму сябру?
Ці ёсць у вас сапраўдныя сябры?

**361.** Прачытайце народныя выказванні. Растлумачце іх сэнс.

Ніякая праца (не) ганьбіць чалавека.
Работы словам (не) заменіш.
Ад людскога вока (не) схаваешся.
З аднаго палена агню (не) раскладаюць.

***га́ньбіць***

?! Спішыце сказы, апускаючы дужкі.

**362.** Прачытайце верш. Наколькі адпавядае яго змест сэнсу першых двух сказаў з папярэдняга практыкавання? Што значыць *лынды біць*?

**Лынды**

Што я цэлы дзень рабіў?
Вой, рабіў — лынды біў.
А пад вечар, каб вы зналі,
мяне ногі (не) трымалі.
Ледзь да ложка дацягнуўся —
лёг і нават (не) разуўся.
Вой, нялёгка лынды біць —
лепш работу рабіць.

*(Ігар Мазнін;
пераклад з рускай мовы Васіля Віткі)*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Спішыце ў радок сказы, у якіх ёсць ***не*** з дзеясловам. Раскрывайце ў гэтых сказах дужкі.

**363.** Прачытайце верш. Замест кропак устаўце ***не***.
Ці можна сказаць, што Лявонка б’е лынды?

У Лявонкі рукі,
рукі, ну як трэба,
а як есці сядзе —
... адрэжа хлеба,
... насыпле цукру,
... налье ён чаю.
Толькі адно чуеш:
— Мама, я чакаю...
Дома і на ўроках,
на прышкольных градках —
анідзе ... знойдзе
ён рукам занятку.

*(Паўлюк Пранузa)*

?! Пастаўце пытанні да ўсіх дзеясловаў у вершы.
Запішыце ў сшыткі дзеясловы, перад якімі пішацца ***не***.

## *Урокі 24—26. Час дзеяслова. Змяненне дзеясловаў па часах*

**364.** Прачытайце сказы. У якім з іх апісваецца дзеянне, што ўжо адбылося?
У якім сказе дзеянне адбываецца зараз?
У якім гаворыцца пра дзеянне, якое яшчэ будзе адбывацца?

Учора я доўга глядзела тэлевізар.
Зараз я гуляю на вуліцы.
Вечарам я пачытаю кнігу.

?! Пастаўце пытанні да дзеясловаў.
Спішыце сказы. Пасля дзеясловаў у дужках запішыце пытанні, на якія яны адказваюць.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**365.** Прачытайце дзеясловы. Пастаўце да іх пытанні.

Прачытаў, чытаю, прачытаю.
Сядзеў, сяджу, пасяджу.
Гуляю, пагуляю, гуляў.
Выконваю, буду выконваць, выканаў.

?! Выпішыце спачатку дзеясловы, якія абазначаюць дзеянне, што адбываецца зараз. Потым — дзеянне, якое ўжо адбылося. І нарэшце — тое, што будзе адбывацца.

*Запомніце!*
Дзеясловы змяняюцца па часах. Яны могуць быць **цяперашняга, прошлага** і **будучага часу**.
**Цяперашні час** абазначае дзеянне, якое **адбываецца ў момант маўлення**.
*Пахне свежым сенам*.
**Будучы час** абазначае дзеянне, якое **будзе адбывацца пасля моманту маўлення**.
*Запахне (будзе пахнуць) свежым сенам*.
**Прошлы час** абазначае дзеянне, якое **адбылося ў мінулым**.
*Пахла свежым сенам*.

**366.** Прачытайце сказы. Пастаўце пытанні да выдзеленых дзеясловаў.

Агнём вясёлак **ззяюць** росы ў моры жытніх каласоў. *(Якуб Колас)*
Неспадзявана **ўпаў** туман на мора: усё **ахутала** імгла. *(Сяргей Грахоўскі)*
Заўсёды дальняя дарога **развее** смутак і бяду. *(Сяргей Грахоўскі)*

?! Вызначце час дзеясловаў у кожным сказе.
Запішыце сказы. Абазначце час дзеясловаў наступным чынам: цяперашні час — *ц. ч.*, будучы час — *б. ч.*, прошлы час — *пр. ч.*

**367.** Прачытайце жарт. Ці ведаеце вы адказ на пытанне настаўніцы?

Настаўніца **пытаецца** ў вучняў:
— Чаму чапля **стаіць** на адной назе?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Калі яна **падніме** і другую, — **сказала** Ніна, — дык **паваліцца** на зямлю. *(Тамара Тарасава)*

Пастаўце пытанні да выдзеленых дзеясловаў. Вызначце іх час.

*Запомніце!*
Дзеясловы **цяперашняга часу** адказваюць на пытанні **што робіць? што робяць?**
Дзеясловы **прошлага часу** адказваюць на пытанні **што рабіў? што рабіла? што рабілі? што зрабілі?**
Дзеясловы **будучага часу** адказваюць на пытанні **што зробіць? што будзе рабіць? што зробяць? што будуць рабіць?**

**368.** Прачытайце дзеясловы. Пастаўце пытанне да кожнага з іх. Вызначце час дзеясловаў.

Малюю, прачытаў, глядзяць, паслухаю, буду вучыць, стварaў, вывучыў, прачытаю, маляваў, ствару, буду маляваць, чытаем, глядзелі, паглядзяць, паслухаў, вучу, слухаю, ствараю.

Запішыце спачатку дзеясловы цяперашняга часу, потым — будучага, а апошнімі — прошлага часу.

**369.** Прачытайце верш. Аб якой пары́ года ён расказвае? Якую назву можна даць гэтаму вершу?

Неба, неба, небасхіл,
хустка васільковая!
**Пакацілася** клубком
сонейка вясновае!

**Разматала** промні-ніткі,
**паскідала** на раллю,
каляроваю вясёлкай
**упрыгожыла** зямлю.

**Заіскрылася, заззяла**
мяккім золатам яно
і з вясёлаю ўсмешкай
**зазірнула** мне ў вакно.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Наваколле **заспявала,**
**зазвінела, загуло,**
**зацвіло, закрасавала,**
і **зайграла — ажыло!**

*(Лідзія Полазава)*

?! Пастаўце пытанні да выдзеленых дзеясловаў. У якім часе ўсе яны ўжыты? Выпішыце дзеясловы з верша.

**370.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў тэксце дзеясловы. Пастаўце да іх пытанні.

**Вясна ідзе**

Забулькалі, заспявалі пад снегам ручаі. На старой таполі ацерабіўся, замахаў крыламі чорны грак.

Убачыў грака — вясну сустрэнеш. Так кажа прымаўка. Снег у полі пацямнеў, набрыняў і асеў. На ўзгорках чарнеюць праталінкі. У лесе на дрэвах набухаюць пупышкі, весела звіняць сінічкі на голым вецці, звонка грукае дзяцел на старой асіне.

Наўкола ўсё булькае, звініць і гукае: «Вясна ідзе-е-е!»

*(Паводле Валерыя Кастручына)*

?! Выпішыце з тэксту дзеясловы. Пазначце іх час.

**371.** Прачытайце вершаваную загадку. Па малюнку і колькасці літар адгадайце яе.

...Спакваля мяхі развёў —
і, як вырай жаўрукоў,
гукі раптам узляцелі,
зазвінелі,
затрымцелі.
Чарадзейны перабор
скалыхнуў і дом,
і двор.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

То званочкам
ён зальецца,
то, здаецца,
зазлуецца,
быццам гром той,
прабурчыць,
то раптоўна
замаўчыць.



*(Здзіслаў Стома)*

|  |  |  |  |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |

**Раптóўна** — раптам, нечакана.
**Спакваля́** — павольна, паступова.

?! Знайдзіце ў загадцы дзеясловы. Вызначце іх час.

**372.** Прачытайце тэкст. У якім часе ўжыты ў тэксце ўсе дзеясловы?

**Вясна**

Стаялі цудоўныя дні. Ярка свяціла веснавое сонца. Яго промні сагравалі зямлю.

Зелянела на ўзгорках маладая траўка. У лясах з'явіліся першыя вясновыя кветкі.

Чарнела ў полі свежая ралля. З раніцы да ночы на полі гудзелі трактары.

?! Змяніце час дзеясловаў з прошлага на цяперашні. Прачытайце тэкст яшчэ раз.

Спішыце тэкст, ужываючы дзеясловы ў цяперашнім часе.

**373.** Раскажыце пра змены, якія адбываюцца зараз у прыродзе.

Што ў прыродзе ўжо адбылося?
Што адбываецца зараз?
Што будзе далей?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**374.** Прачытайце верш. Якая яго асноўная думка?

### Размова з жураўлём

— Жораў шэры, журавель,
ты з якіх ляціш зямель?
— Я пакінуў край заморскі
і лячу ў свой прыдняпроўскі.
— Ад чужых зямель, нябёс
з чым ляцеў ты, што ж ты нёс?
— Ад Сахары і ад Ніла
смутак нёс я ў шлях на крылах.
— Там жа сонца, сінява,
дык чаго ж ты сумаваў?
— Сумаваў я па айчынных
поймах, рэках, балацінах.

*(Міхась Калачынскі)*

**айчы́нны**

?! Знайдзіце ў вершы дзеясловы. Пастаўце да іх пытанні.
Выпішыце дзеясловы ў сшытак.
Прачытайце верш па асобах.

**375.** Прачытайце народныя прыметы веснавога надвор’я.

Рана прыляцелі гракі, жаўрукі і жоравы — да ранняй і цёплай вясны.

Калі мышы робяць гнёзды ў копах нізка, вясна будзе сухая.

Калі ўвесну бяроза перад вольхаю ліст распусціць, то лета будзе сухое, калі вольха спачатку — мокрае.

?! Вызначце час дзеясловаў у сказах.
Запішыце ў сшыткі сказы, у якіх ёсць дзеяслоў цяперашняга часу і дзеяслоў будучага часу.

**376.** Складзіце некалькі выказванняў.

Скажыце ў першым сказе, што вы рабілі ўчора.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У другім сказе распавядзіце, чым займаецеся сёння.
У трэцім сказе заплануйце, што вы будзеце рабіць заўтра.

?! У першым сказе выкарыстайце дзеяслоў у прошлым часе, у другім — у цяперашнім, у трэцім — у будучым.
Запішыце свае выказванні ў сшытак.

**377.** Прачытайце верш. Які настрой гэтага верша?

**Вясной**

Дзень — празрысты,
водар — лёгкі.
Май шчыруе
ўздоўж сяла.
Белапенная чаромха
над платамі расцвіла.

Радасна працуюць
пчолы.
Птушкі гімн
пяюць вясне.
Вецер, сонечны, вясёлы,
падпявае ім і мне.

*(Міхась Пазнякоў)*

**Шчыраваць** — старанна рабіць што-небудзь.

?! Знайдзіце ў вершы дзеясловы. У якім часе яны ўжыты?
Выпішыце з верша дзеясловы цяперашняга часу.

**378.** Прачытайце тэкст. Ці назіралі вы калі-небудзь усход сонца? Вам спадабалася гэтая прыгожая з’ява?

**Усход сонца**

Небасхіл ледзь прыкметна **пасвятлеў**. З-за воблака **пасыпаліся** чырвоныя промні. І вось **паказваецца** само сонца. Яно **купаецца** ў сваім святле. Праз некалькі хвілін агністы шар **адарвецца** ад

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

хмар, **узнімецца** і **паплыве** над зямлёй і **будзе** шчодра **раздаваць** цяпло. З усходам сонца **зазіхацяць** кроплі ранішняй расы, **адзавуцца** спевамі птушкі, **прачнецца** ўсё жывое на зямлі. *(Паводле Міколы Ваданосава)*

?! Пастаўце пытанні да выдзеленых дзеясловаў. Вызначце іх час. Выпішыце спачатку дзеясловы цяперашняга часу, затым — прошлага і будучага.

**379.** Прачытайце верш.

**пра́мяні́сты**

### Красавік

Красавік вясну вядзе.
Сонца мыецца ў вадзе
і ўзыходзіць чыстае —
зранку прамяністае.

Развіталася зіма —
снегу ўжо нідзе няма,
і зямля сухая
дожджыку чакае.

*(Мікола Хведаровіч)*

?! Пастаўце пытанні да дзеясловаў.
Спішыце верш. У дужках перад дзеясловамі запісвайце пытанні да іх.

**380.** Прачытайце тэкст. Ці знаёмая вам казка, з якой узяты гэты ўрывак? Раскажыце яе працяг, калі ведаеце.

**пэ́ндзаль**

### Сем мастакоў

Узялі мастакі сем пэндзлікаў і сем вядзерцаў і пайшлі фарбы шукаць. Доўга вандравалі яны па белым свеце і ўсяму дзівіліся. А дзівіцца было чаму — мастакі ж усё жыццё жылі ў змрочным горадзе. Яны не ведалі, што ёсць на свеце пунсовы мак, які квітнее на зялёным лузе. Ёсць бялюткі рамонак з залацістай сярэдзінай. Яны не ведалі, што сонца ўдзень аранжавае, а ўвечары —


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

малінавае. Яны любаваліся прыродай, многае спазнавалі і ўсё запаміналі. *(Паводле Алены Кобец-Філімонавай)*

Знайдзіце ў тэксце дзеясловы, пастаўце да іх пытанні. Вызначце час дзеясловаў.

Напішыце тэкст пад дыктоўку.

**дзіві́цца**

**пунсо́вы**

Праверце дыктоўкі адно ў аднаго.

**381.** Прачытайце прыказку. Як вы разумееце яе значэнне?

*Прыйдзе пара — вырасце трава.*

Ці падобная па значэнні да дадзенай прыказкі прымаўка: «Усяму свой час»? Словамі якіх часцін мовы ўтворана прыказка?

На якое пытанне адказваюць дзеясловы ў прыказцы?

Спішыце прыказку прыгожа, як на ўзоры. Падкрэсліце дзеясловы дзвюма лініямі, назоўнікі — адной лініяй.

Запішыце прыказку, выкарыстоўваючы дзеясловы ў прошлым часе, а пасля — у цяперашнім.

## Праверце сябе

Выберыце правільны варыянт адказу.

1. Займеннік — гэта часціна мовы, якая...

а) абазначае дзеянне і адказвае на пытанні што рабіць? што зрабіць?;

б) абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні які? якая? якое? якія?;

в) абазначае назву прадмета і адказвае на пытанні хто? што?;

г) паказвае на прадмет, прымету, але не называе іх.

2. Дзеяслоў — гэта часціна мовы, якая...

а) абазначае дзеянне і адказвае на пытанні што рабіць? што зрабіць?;

б) абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні які? якая? якое? якія?;

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

в) абазначае назву прадмета і адказвае на пытанні х т о? ш т о?;
г) паказвае на прадмет, прымету, але не называе іх.

3. Дзеяслоў змяняецца па ліках.
а) Так;
б) не.

4. Дзеяслоў змяняецца па часах.
а) Так;
б) не.

5. Прошлы, цяперашні, будучы — гэта назвы...
а) лікаў дзеяслова;
б) часоў дзеяслова.

6. ***Не*** з дзеясловам пішацца...
а) разам;
б) асобна.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД

## *Урок 1*

**382.** Прачытайце тэкст. Ацаніце ўчынкі тых, хто вырваў клёнік, і хлопчыкаў, ад імя якіх вядзецца гаворка ў тэксце.

### Клён

Аднойчы майскай парою мы з братам ішлі па лясной дарозе. Раптам убачылі пасярод дарогі вырваны клёнік. Пупышкі яго нагадвалі дзюбачкі птушанят, якіх мучыла смага.



Шкада нам зрабілася дрэўца. Паднялі яго і панеслі дадому. Пасадзілі клёнік у агародчыку. Штодзённа пад вечар палівалі яго чыстай вадою.

Стаў расці наш клёнік, лісточкі распусціў. Праз колькі год стане наш клёнік вялікім і прыгожым дрэвам. *(Паводле Міколы Янчанкі)*

?! Які пачатак у гісторыі? Аб чым яе асноўная частка? Што гаворыцца ў канцоўцы?

Дайце назву кожнай частцы тэксту. Запішыце план.

Напішыце пераказ тэксту паводле плана.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**383.** Прачытайце пытанні. Пра якое яны маўленне?

Як патрэбна пісаць: акуратна ці неахайна?
Ці добра рабіць на пісьме памылкі?
Што патрэбна ведаць, каб іх не рабіць?
Ці стараецеся вы пісаць акуратна і без памылак?

Запішыце адказы на пытанні.

Папрацуйце ў парах з суседзямі па парце. Адзін задае пытанне, а другі адказвае на яго.

**384.** Прачытайце, як можна прадказаць надвор'е па паводзінах насякомых. Ці з'яўляюцца гэтыя сказы тэкстам? Чаму?

Павук старанна пляце павуціну — да сухога надвор'я.
Мурашкі хаваюцца ў мурашнік — перад навальніцай.

Знайдзіце ў сказах дзеясловы. Вызначце іх час.
Змяніце час дзеясловаў на будучы і адпаведна памяняйце сказ. Запішыце сказы, якія былі і якія атрымаліся. Пазначце час дзеясловаў.

**385.** Запішыце любыя дзве вядомыя вам прыкметы надвор'я. Ужывайце дзеясловы цяперашняга або будучага часу.

## *Урок 2*

**386.** Прачытайце загадкі. Успомніце, як пішацца ***не*** з дзеясловамі.
Адгадайце загадкі з дапамогай першай і апошняй літар у словах-адгадках.

Мы стаім — і ён стаіць,
мы бяжым — і ён бяжыць,
нашы рухі **пераймае**,
ні на крок (не) адступае.
Толькі ў цемры ды начамі
пакідае жарты з намі.

*(Нічыпар Парукаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ц | | | ь |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Стаяць паненкі
ў чырвоных сукенках.
Хто знойдзе — ім **паклоніцца**.

*(З народнага)*

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| с | | | | | ы |

?! Выпішыце з загадак дзеясловы з ***не***.
Назавіце ў загадках займеннікі.
Выпішыце з загадак выдзеленыя словы. Абазначце ў іх прыстаўкі.

**387.** Прачытайце верш. Вызначце яго асноўную думку. Што хацеў выказаць паэт з дапамогай гэтага верша?

**Гняздо на вішні**

**(Не) чакай** бядоты нейкай.
**Будзе** добра і зацішна.
Ты **(не) бойся**, верабейка,
што **зрабіў** гняздо на вішні.
Будзе шмат варон — **прагонім**,
**закрычаць** гракі — **суцішым**.
Ад ката мы **абаронім**,
тваіх дзетак **пакалышам**.

*(Мар’ян Дукса)*

?! Выдзеленыя дзеясловы выпішыце ў такім парадку: цяперашні час, прошлы і будучы.
Назавіце займеннікі, якія выкарыстаны ў вершы. Замест якіх слоў яны ўжыты?

**388.** Прачытайце верш. Да якога стаўлення да прыроды заклікае ў ім аўтар? У якім сказе гэты заклік выказаны?

На паляне ў цішыні лясной,
дзе пчалой пазвоньвае крыніца,
чэрвеньскай асыпаны расой,

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

спяць чабор, мятліца, медуніца.
Сонца разбудзіла ўжо даўно
і зязюлю з сойкай, і сініцу.
А яны спяць серабрыстым сном.
Абыдзіце іх і не будзіце!

*(Максім Танк)*

Знайдзіце ў вершы прыметнікі. З якімі назоўнікамі яны звязаны? Вызначце лік, род і склон прыметнікаў.
Якія прыназоўнікі ёсць у вершы?
Знайдзіце ў сказах верша займеннікі.
Знайдзіце ў сказах аднародныя члены. Выпішыце іх.

**389.** Прачытайце верш.

**Дапамагу**

На гародзе ў бабулі
многа морквы і цыбулі,
памідораў, агуркоў,
часнаку і буракоў.
Я на грады **пабягу**
і бабулі **памагу**:
моркву з рэпай **прапалю**,
а пасля гуркі палью.

*(Тадзіяна Кляшторная)*

Выпішыце з верша назоўнікі. Па пытаннях вызначце іх склоны.
Выпішыце выдзеленыя словы. Абазначце іх часткі.

**390.** Прачытайце верш. Горад ці вёска ў ім апісваецца?

Драўляныя хаткі,
у прысадах — дарогі;
мураўка і кветкі
кладуцца пад ногі.

*(Янка Купала)*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



?! Вызначце, да якіх часцін мовы адносяцца ўжытыя ў вершы словы.
Запішыце дзеясловў, які ёсць у вершы, у цяперашнім, прошлым і будучым часе. У якім часе і ліку ён ужыты ў вершы?
Знайдзіце ў вершы словы, роднасныя наступным: *дрэва, хата, сад, мурава*. Выпішыце з верша гэтыя словы. Абазначце іх часткі.

## *Урок 3*

**391.** Ці бывалі вы калі-небудзь у вёсцы? Можа, там жывуць вашы бацькі, бабуля з дзядулем ці сваякі?
Раскажыце пра вёску.

Якая назва вёскі? Вялікая яна ці маленькая?
Што адметнага ёсць у вашай вёсцы?
Там ёсць рака або возера? Ці далёка лес?
Як вы бавіце час летам?
Вы любіце свой родны куточак?

?! Запішыце 2—3 сказы, якія характарызуюць вёску. Ці атрымаўся ў вас тэкст?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**392.** Прачытайце верш.

**Белы мядзведзь**

— Ты каго малюеш, Федзя?
— Я намаляваў мядзведзя.
Што, не верыш сябру? Эх!
— Веру. Спорны сыпле снег.
Спаць пайшоў мядзведзь, няйначай?
— Я і сам яго не бачу.
Ён жа белы, мой мядзведзь.
Паспрабуй на снезе ўгледзь!

*(Надзея Сторажава)*



?! Чаму сябар не зразумеў, каго намаляваў Федзя? Паразважайце.
Колькі сказаў у вершы? Вызначце від кожнага сказа.
Навучыцеся чытаць выразна пытальныя і клічны сказы. Прачытайце верш па асобах.

**393.** Прачытайце верш-заклічку. Калі людзі просяць дождж, каб ён пайшоў?

Дажджы прамяністыя,
з хмар ападайце!
Жыты, прарастайце,
сады, зацвітайце!

*(Пімен Панчанка)*

?! Да вясновага дажджу ці летняга звяртаецца паэт? Навошта вясной дождж?
Колькі сказаў у вершы? Якія гэта сказы?
Вывучыце заклічку на памяць.

**394.** Прачытайце тэкст. Ці чулі вы, як спявае салавей? Ці заўважалі, на якіх дрэвах ён спявае?

Дзе ёсць вада і расце алешына, там абавязкова жыве салавей. Гэты цудоўны птах не заспявае на хвойцы, на бярозцы або дубку.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Яму падавай менавіта шэрую алешыну з лазою, а яшчэ чаромху з калінай любіць ён. Тут і пяе салавей, а побач **растуць залацістыя** лотаці ды **блакітныя** незабудкі. *(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*



?! Выпішыце з тэксту выдзеленыя словы. Абазначце часткі слоў. Падбярыце да кожнага з іх аднакаранёвыя, роднасныя словы. Запішыце тры групы роднасных слоў.
Назавіце галоўныя члены ў другім сказе. Якія словы ў гэтым сказе з'яўляюцца аднароднымі членамі?

**395.** Прачытайце сказы, што запісаны справа і злева. Чым яны адрозніваюцца?

| | |
|---|---|
| Пачаўся сезон. | У вёсцы пачаўся працоўны сезон. |
| Сяляне выйшлі. | Сяляне выйшлі на поле і ў агароды. |
| Яны саджаюць. | Яны саджаюць агародніну. |
| Вырасце ўраджай. | Восенню вырасце ў іх добры ўраджай. |

?! Якія сказы ўтвораны толькі галоўнымі членамі? У якіх сказах ёсць і даданыя члены?
Якія сказы больш прыгожыя, дакладныя?
Спішыце сказы з даданымі членамі. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены адпаведнымі лініямі.

## *Урок 4*

**396.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму? Якую назву можна яму даць?

У жаваранкаў існуе свой хор. Перад заходам сонца жаваранкі ўзлятаюць высока-высока. Адзін перад адным яны спяваюць пяшчотныя песні. **Агністы, чырвоны шар патанае за небакраем.** Тады

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

змаўкаюць і хаваюцца на спачынак палявыя песняры. Наўкол наступае вячэрняя цішыня. *(Паводле Івана Грамовіча)*

?! Знайдзіце ў тэксце роднасныя словы. Выпішыце іх, абазначце ў іх часткі. У выдзеленым сказе назавіце сінонімы. Якія яшчэ сінонімы гэтых слоў вы ведаеце?

**397.** Прачытайце тэкст. Дайце яму назву.

Цудоўная пара лета! Усё навокал зялёнае. Усё навокал радаснае. На лугах шмат кветак. А ў **лесе** на цёплых палянках наліваюцца пунсовым **сокам** суніцы. На пагорках суніцы салодкія, але дробныя. А ў **траве** ягады буйны́я. Быццам чырвоныя завушніцы вісяць.

*(Паводле Любові Варанковай; пераклад з рускай мовы)*

?! Вызначце склоны выдзеленых назоўнікаў.
Знайдзіце ў тэксце прыметнікі. Вызначце іх лік і род (у адзіночным ліку).
Напішыце загаловак тэксту.
Запішыце тэкст пад дыктоўку.

Праверце дыктоўкі адно ў аднаго.

**398.** Прачытайце верш-пажаданне. Які наказ дае паэт у гэтым вершы? Што значыць «слухаць родную прыроду»?

**Слухай родную прыроду**

У любую пару года,
у пагоду, непагоду
слухай родную прыроду —
ты пачуеш галасы
таямнічае красы.

З лесам, з нівай залатою
размаўляе ветравей,
сонца-сонейка — з зямлёю,
з цішынёю — салавей,


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

з небам — рэкі і азёры,
хваля — з ніцаю вярбой...
Як і што яны гавораць,
слухай, сябра любы мой.

*(Васіль Жуковіч)*

Знайдзіце ў вершы словы-сінонімы і словы-антонімы. Запішыце іх у сшытак.

Растлумачце значэнне слоў *ветравей, таямнічы*. Калі самі не можаце, паглядзіце ў тлумачальным слоўніку.

**399.** Прачытайце тэкст.

### Птушкі ў чэрвені

Змаўкаюць птушыныя спевы. У большасці лясных птушак вывеліся птушаняты. Клапатлівыя бацькі безупынна носяць у гнёзды чарвякоў, вусеняў, слімакоў, матылькоў, мушак. Нялёгка ім накарміць дзяцей.

Падлічана, што адна сям'я шпакоў знішчае за дзень каля чатырохсот шкодных садовых слімакоў. Вялікае значэнне мае і тое, што птушкі разносяць насенне дрэў і розных раслін. Гэтым яны дапамагаюць росту і развіццю лясоў. *(Віталь Вольскі)*

Вызначце дзейнікі і выказнікі ў першых двух сказах.
Знайдзіце ў тэксце роднасныя словы. Выпішыце іх. Абазначце іх часткі.
Знайдзіце ў тэксце аднародныя члены сказа. Выпішыце і іх таксама.

## *Урок 5*

**400.** Прачытайце пытанні. Задайце іх адно аднаму па чарзе. Адкажыце на гэтыя пытанні.

Дзе ты збіраешся правесці летнія канікулы?
Чым думаеш займацца?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Якія кніжкі хочаш прачытаць?
Ці будзеш ты сумаваць па школе?

?! Якім маўленнем вы карысталіся: вусным ці пісьмовым, дыялагічным ці маналагічным?

* Напішыце невялікае апавяданне на тэму «Як я збіраюся правесці летнія канікулы».

Якім маўленнем вы будзеце карыстацца пры напісанні апавядання: вусным ці пісьмовым, маналагічным ці дыялагічным?

**401.** Прачытайце верш. Дапаўняйце словы прапушчанымі канчаткамі.

Я пас.. авечак
каля самай **рэчкі**,
воўна ў іх **бялюткая**,
мякк.. , танютк.. .
Будзе на валёнк..,
будзе на панчошкі,
і на рукавічк..
застанецца трошкі.

*(Авяр’ян Дзержынскі)*

?! Запішыце словы з прапушчанымі канчаткамі. Абазначце канчаткі.
Назавіце часткі ў выдзеленых словах.
Запішыце гэтыя словы, абазначце іх часткі.

**402.** Уявіце, што да вас у школу прыехаў карэспандэнт з газеты. Ён хоча даведацца, як прайшоў у вас гэты навучальны год.
Карэспандэнт задае вам пытанні, а вы адказвайце на іх.

**_карэспандэ́нт_**

Як тваё прозвішча і імя?
У якім класе ты вучышся?
Якім быў гэты навучальны год?
Што табе дапамагала ў вучобе?
Чым табе найбольш запомніўся 8 клас?
Што ты хочаш пажадаць сваім сябрам напярэдадні летніх канікул?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Разыграйце гэтую сцэнку некалькі разоў. Мяняйцеся ролямі. Дыялагічным маўленнем вы карысталіся ці маналагічным? Вусным ці пісьмовым? Празаічным ці паэтычным?

**403.** Прачытайце верш.

Ой, хто ж на дарозе каня паганяе,
каня паганяе, сам песню спявае?
А то сусед едзе з гасцінцам вялікім —
вязе сыну боты, дачцэ чаравікі.

*(Якуб Колас)*

Якія словы ў вершы роднасныя? Якое з іх мае прыстаўку? Якую? Выпішыце роднасныя словы. Падкрэсліце слова з прыстаўкай.

## *Урок 6*

**404.** Прачытайце верш. Калі ў ім адбываецца дзеянне?

**Пчолы**

Сінія званочкі
пчолы разбудзілі,
сонечнымі промнямі
тварыкі памылі.
На траве і кветках
росы дагараюць,
лётаюць тут пчолкі
і нектар збіраюць.

*(Тадзіяна Кляшторная)*

Знайдзіце ў вершы словы з каранямі ***квет-, рос-, твар-***. Якія яшчэ часткі ёсць у гэтых словах?
Запішыце гэтыя словы. Абазначце іх часткі.
У словах *разбудзілі, памылі, дагараюць, збіраюць* знайдзіце прыстаўкі.
Запішыце гэтыя словы. Абазначце ў іх прыстаўкі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**405.** Прачытайце верш. Да якога прадмета звяртаецца паэт у вершы? Які настрой у верша: радасны ці сумны? Чаму?

### Развітаемся, званок!



Сёння ў нас апошні ўрок —
ты звіні даўжэй, званок,
доўга, радасна звіні
жаўранкам у вышыні.
Зычна, весела, заўзята
абвясці пра наша свята.
Колькі раз ты **гучна**-гучна
на заняткі клікаў вучняў —
**далятаў** і да **сталоўкі**,
і да шумнай спортпляцоўкі.
Не вятрамі, не шпакамі —
год агучаны званкамі.
Сёння ў нас апошні ўрок —
развітаемся, званок!
Падары расстанне гэта,
звонка выпусціўшы ў лета.
Сам жа, сцішаны, у зморы
спі спакойна ў калідоры.

*(Мар'ян Дукса)*

?! Сказы якіх відаў ужыты ў вершы? Зачытайце пабуджальныя сказы.
Знайдзіце роднасныя словы ў вершы.
У якіх сказах ёсць аднародныя члены?
Да выдзеленых слоў падбярыце сінонімы.
Ці з добрым настроем вы развітваецеся са школай?

**406.** Уявіце, што вашы сябры — гэта першакласнікі, а вы ім павінны растлумачыць правілы паводзін летам.
Зрабіце гэта перад класам.
Што карысна рабіць у час адпачынку?
Ад чаго трэба берагчыся ў час летніх канікул?
Ці трэба дапамагаць старэйшым?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Якое маўленне вы выкарыстаеце: вуснае ці пісьмовае, празаічнае ці вершаванае, дыялагічнае ці маналагічнае?

**407.** Напішыце невялікае апавяданне-мару пра тое, як вы хочаце правесці летнія канікулы. А восенню можна будзе праверыць, ці збыліся вашы жаданні.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# АРФАГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

**А**
адчыня́ць
айчы́нны
апо́страф
асі́лак
аэрадро́м

**Б**
баро́метр

**В**
віншава́нне

**Г**
га́льштук
га́ньбіць
гасці́нны
герба́рый
грама́дства

**Д (ДЗ)**
дзіві́цца
дзьмухаве́ц
дзяўбці́
до́світак
дэпо́

**Ж**
жва́вы
журы́

**З**
зая́ва

**І**
інтэрв’ю́

**К**
карэспандэ́нт

**М**
ма́рна
мізэ́рны
Мле́чны Шлях
мядзве́дзь
мястэ́чка

**Н**
небасхі́л

**П**
папалу́днаваць
пасажы́р
пачасту́нак
по́мста
по́шта
прамяні́сты
прафе́сія
пунсо́вы
пэ́ндзаль
пялёстак

**Р**
раз’ю́шаны
ра́іцца

**С**
спрача́цца
стадыён
стогн
сукве́цце
сумле́нне
суразмо́ўца

**Т**
тысячагадо́вы
тэлеперада́ча
тэлефо́н

**У**
узвы́шша

**Ф**
фае́
фламі́нга

**Ч**
чалаве́чнасць

**Я**
язмі́н


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. *Баханькоў, А. Я.* Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / А. Я. Баханькоў, І. М. Гайдукевіч, П. П. Шуба. — Мінск: Нар. асвета, 1990. — 396 с.

2. *Вітка, В.* Роднае слова: чытанка для 2-га кл. шк. з беларус. мовай навучання / В. Вітка, М. Ф. Шаўлоўская. — 5-е выд. — Мінск: Нар. асвета, 1995. — 287 с.

3. Вяснянка: вершы, апавяданні, казкі беларус. пісьменнікаў. — Мінск: Юнацтва, 1983. — 655 с.

4. *Гімпель, І. А.* Сшытак па беларускай мове: 2-гі кл.: дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання. Дадат. да падруч. «Беларуская мова. 2 клас» (аўт. Т. М. Валынец [і інш.]) / І. А. Гімпель, Н. І. Мінкевіч. — Мінск: Юнипресс, 2008. — 112 с. — (Рабочыя сш.).

5. Зборнік дыктантаў па беларускай мове для пачатковых класаў / аўт.-склад. І. А. Гімпель. — Мінск: Юніпрэс, 2001. — 144 с.

6. *Змушко, А. М.* Беларуская мова і чытанне: вучэб. дапам. для 8-га кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з рус. мовай навучання / А. М. Змушко. — Мінск: Нар. асвета, 2005. — 207 с.: іл.

7. Зярнятка: вершы, апавяданні, казкі, загадкі, прыпеўкі, калыханкі, гульні, прымаўкі, прыказкі, хуткагаворкі / уклад. З. І. Кустава, В. А. Салаўёва; маст. Л. У. Пашчасцева. — Мінск: Маст. літ., 2014. — 190 с.

8. *Леановіч, В. Л.* Дыдактычны матэрыял па беларускай мове для 1-га кл. агульнаадукац. шк. з беларус. мовай навучання: дапам. для настаўнікаў / В. Л. Леановіч, А. Г. Тарасевіч. — Мінск: Асар, 2000. — 96 с.

9. *Малажай, Г. М.* Беларуская мова: падруч. для 7-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання з 12-гад. тэрмінам навучання / Г. М. Малажай, Н. М. Чалюк. — 2-е выд. — Мінск: НІА, 2004. — 239 с.: іл.

10. *Мацвеенка, У. І.* Займальны родны алфавіт: вершы, загадкі, скорагаворкі: для мал. шк. узросту / У. Мацвеенка. — Мінск: Маст. літ., 2013. — 48 с.: іл.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

11. *Паўлоўскі, І. І.* Беларуская мова: зб. кантрол. работ (спісванні, дыктанты, дыктанты з грамат. заданнем): 1—4-я кл.: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / І. І. Паўлоўскі. — 2-е выд. — Мінск: Аверсэв, 2013. — 125 с. — (Кантрол.-вымяр. матэрыялы).

12. Сцяжынка: вершы, казкі, загадкі, аповесці і апавяданні: хрэстаматыя для пазакл. чытання ў 5-м кл. / уклад. В. Я. Ляшук, Л. В. Асташонак. — Мінск: Юнацтва, 1999. — 527 с.: іл. — (Шк. б-ка).

13. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко; афарм. А. М. Хількевіча. — 2-е выд. — Мінск: БелЭн, 1999. — 784 с.

14. *Тумаш, Г. В.* Рабочы сшытак па беларускай мове для 4 класа: дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання / Г. В. Тумаш. — Мінск: Аверсэв, 2002. — 112 с. — (Рабочыя сш.).



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ЗМЕСТ


ПАЎТАРЭННЕ ........ 3

Урок 1. Успамін аб леце ........ 3

Урок 2. Алфавіт ........ 5

Урок 3. Галосныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме ........ 7

Урокі 4—5. Зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме........ 9

Урок 6. Гука-літарны разбор слова ........ 16

МАЎЛЕННЕ ........ 20

Урок 1. Беларуская мова і маўленне ........ 20

Урок 2. Вуснае і пісьмовае маўленне. Правілы вуснага маўлення ........ 22

Урок 3. Асаблівасці вуснага маўлення ........ 24

Урок 4. Дыялагічнае і маналагічнае маўленне. Празаічнае і паэтычнае маўленне ........ 28

Урок 5. Маўленчы этыкет ........ 32

Урок 6. Пісьмовае маўленне ........ 36

ТЭКСТ ........ 40

Урокі 1—2. Прыметы тэксту. Тэма выказвання ў тэксце. Асноўная думка выказвання ........ 40

Урокі 3—4. Часткі тэксту ........ 45

Урокі 5—6. План тэксту. Складанне тэксту па плане........ 48

СКАЗ ........ 57

Урокі 1—3. Сказ. Віды сказаў ........ 57

Урокі 4—7. Галоўныя і даданыя члены сказа........ 65

Урокі 8—10. Аднародныя члены сказа ........ 73

СЛОВА ........ 82

Урок 1. Значэнне слова........ 82

Урокі 2—3. Сінонімы ........ 84

Урок 4. Антонімы ........ 87

**Часткі слова** ........ 90

Урок 5. Роднасныя словы. Корань слова ........ 90

Урок 6. Канчатак ........ 93

Урок 7. Прыстаўка ........ 96

Урок 8. Суфікс ........ 98


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ЧАСЦІНЫ МОВЫ ........................................ 104
Урок 1. Паняцце пра часціны мовы ........................ 104
**Назоўнік** ........................................ 107
Урокі 2—3. Лік назоўнікаў ........................ 107
Урокі 4—5. Род назоўнікаў ........................ 113
Урокі 6—10. Скланенне назоўнікаў ........................ 117
**Прыметнік** ........................................ 130
Урокі 11—12. Дапасаванне прыметнікаў да назоўнікаў .... 130
Урокі 13—14. Род і лік прыметнікаў ........................ 134
Урокі 15—17. Змяненне прыметнікаў па склонах ............ 141
**Займеннік** ........................................ 148
Урокі 18—21. Займеннік як часціна мовы ................ 148
**Дзеяслоў** ........................................ 158
Урок 22. Дзеяслоў як часціна мовы. Лік дзеяслова ........... 158
Урок 23. ***Не*** з дзеясловамі ........................ 161
Урокі 24—26. Час дзеяслова. Змяненне дзеясловаў
па часах ........................................ 163
ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД ........................ 173
АРФАГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК ........................ 186
СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ ........................ 187


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вучэбнае выданне

**Змушко** Антаніна Міхайлаўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Вучэбны дапаможнік для 8 класа**
**першага аддзялення дапаможнай школы**
**з рускай мовай навучання**

Рэдактары *І. В. Летуновіч, Н. Г. Шчарбакова*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Мастак *Л. А. Мурашка*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *А. У. Смалюк*
Карэктары *В. Р. Ермаковіч, А. Ф. Каравай, Н. Б. Кучмель*

Падпісана ў друк 19.01.2018. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 14,04+0,29 форз. Ул.-выд. арк. 7,80+0,40 форз.
Тыраж 1352 экз. Заказ 660.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча навучэнца | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Назоўнік мяняе свае формы ў адпаведнасці з пытаннямі склонаў. Гэта змяненне назоўнікаў па склонах у адзіночным і множным ліках называецца **скланеннем**.

| Склон | Пытанні | Дапаможнае слова | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Н. | хто? што? | ёсць | стол, дзяўчынка, ноч |
| Р. | каго?<br>чаго? | няма | стала, дзяўчынкі, ночы |
| Д. | каму?<br>чаму? | даць | сталу, дзяўчынцы, ночы |
| В. | каго?<br>што? | бачу | стол, дзяўчынку, ноч |
| Т. | кім? чым? | задаволены | сталом,<br>дзяўчынкай,<br>ноччу |
| М. | аб кім?<br>аб чым? | гаварыць | аб стале,<br>аб дзяўчынцы,<br>аб ночы |

Дзеясловы змяняюцца па часах. Яны могуць быць **цяперашняга, прошлага** і **будучага часу**.

**Цяперашні час** абазначае дзеянне, якое **адбываецца ў момант маўлення.**

**Будучы час** абазначае дзеянне, якое **будзе адбывацца пасля моманту маўлення.**

**Прошлы час** абазначае дзеянне, якое **адбылося ў мінулым.**

